# КАТЭХІЗІС КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА

*Кампендый*

*На тытульнай старонцы і на вокладцы:*

Выява на хрысціянскім надмагіллі (кан. III ст.) ў катакомбах Даміцылы (Рым).

Гэты букалічны вобраз язычніцкага паходжання выкарыстоўваўся хрысціянамі як сімвал адпачынку і шчасця, якія душа памерлага знаходзіць у вечным жыцці.

Гэты малюнак перадае галоўнае значэнне самога *Кампендыя*: Хрыстус — Добры Пастыр, які сваёй уладай (посах) вядзе і ахоўвае вернікаў (авечка), прыцягвае іх да сябе меладычнай сімфоніяй праўды (жалейка), а таксама дазваляе ім адпачываць у засені «дрэва жыцця» — свайго збаўчага крыжа, які адчыняе брамы раю.

# КАТЭХІЗІС КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА

## *Кампендый*

Мінск
Про Хрысто
2010

УДК 272-282.4
ББК 86.375
К 14

Тытул арыгінала:
Catechismo della Chiesa Cattolica. Compendio.

«Libreria Editrice Vaticana omnia sibi vindicat iura.
Sine eiusdem licentia scripto data nemini liceat hunc Compendium
denuo imprimere aut in aliam linguam vertere».

Пераклад здзейснены
Секцыяй па перакладзе літургічных тэкстаў
і афіцыйных дакументаў Касцёла
Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў
пры ККББ

ISBN 978-985-6825-34-0

© Copyright 2005 — Libreria Editrice Vaticana
© Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, 2010
© Афармленне. УП «Выдавецтва “ПРО ХРЫСТО”», 2010

# ПРАДМОВА

*Глыбокапаважаныя вернікі і ўсе,*
*хто зацікаўлены пытаннем веры ў сучасным свеце!*

Вы трымаеце ў руках упершыню выдадзены на беларускай мове *Кампендый Катэхізіса Каталіцкага Касцёла* — кнігу веры, якая ў сціслай форме передае змест каталіцкага веравучэння.

Пераклад *Кампендыя* здзейсніла Секцыя па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў Касцёла пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі. Стараннямі Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі і дзякуючы падтрымцы фонду «Bradley foundation» выдавецтва *Pro Christo* падрыхтавала яго выданне.

У Каталіцкім Касцёле здаўна існавалі катэхізісы, якія прадстаўлялі афіцыйнае вучэнне каталіцкай веры. Найбольш вядомым быў гэтак званы *Рымскі Катэхізіс*, выдадзены ў 1566 г., у якім знайшлі адлюстраванне ідэі Трыдэнцкага Сабору. *Рымскі Катэхізіс,* як і многія іншыя нацыянальныя і дыяцэзіяльныя катэхізісы, а таксама катэхізісы для спецыяльных груп вернікаў адыгралі вялікую ролю ў працэсе катэхізацыі на працягу многіх вякоў.

Пасля Другога Ватыканскага Сабору (1963–1965) спецыяльная сесія Сіноду Біскупаў у 1985 г. прыняла рашэнне, згодна з навучаннем Сабору і патрабаваннямі часу, апрацаваць новы *Катэхізіс Каталіцкага Касцёла*. Тэкст гэтага *Катэхізіса* быў афіцыйна прадстаўлены 11 кастрычніка 1992 г. папам Янам Паўлам II як узорны для абноўленай катэхізацыі.

Міжнародны Катэхетычны Кангрэс у 2002 г. прапанаваў, каб на базе *Катэхізіса* быў падрыхтаваны яго *Кампендый,* які б больш карат-

ка, у традыцыйнай форме пытанняў і адказаў выкладаў праўды каталіцкай веры і маральнасці. Гэты *Кампендый* быў абнародаваны 28 чэрвеня 2005 г. папам Бэнэдыктам XVI.

*Кампендый*, па сваёй сутнасці, з'яўляецца простым і адначасова поўным прадстаўленнем каталіцкай веры і маральнасці ў форме дыялогу паміж катэхетам і катэхізуемым. Пры гэтым трэба падкрэсліць, што пытанні і адказы падабраны так, каб канцэнтраваць увагу чытача на матэрыяле і такім чынам пабуджаць яго да адкрыцця новых аспектаў веры і маральнасці.

Прынятая ў *Кампендыі* форма дыялогу не азначае, што толькі так можна ім карыстацца. Ён будзе прыдатны і тым, хто сам цікавіцца пытаннем веры і маральнасці і хоча самастойна іх пазнаць.

Вельмі важным з'яўлецца тое, што ў *Кампендыі* ёсць шмат ілюстрацый, якія дапамагаюць перадаць і замацаваць прапанаваны чытачам матэрыял. Касцёл на працягу ўсёй сваёй багатай гісторыі вельмі шырока выкарыстоўваў іканаграфію для евангелізацыі і катэхізацыі. Сучасная культура характарызуецца большай увагай да вобразу. Таму выкарыстанне ілюстрацый з'яўляецца эфектыўным сродкам у дынамічным выражэнні і пераказе праўдаў веры.

*Кампендый* сцісла звязаны з самім *Катэхізісам* і складзены паводле яго структуры. Ён мае тыя самыя, што і *Катэхізіс,* лагічна звязаныя паміж сабой часткі.

Першая частка — «Вызнанне веры» — змяшчае сінтэз каталіцкага веравучэння, а таксама Апостальскі і Нікейска-Канстанцінопальскі сімвалы веры, якія абвяшчаюць галоўныя праўды веры.

Другая частка — «Цэлебрацыя хрысціянскай таямніцы» — прадстаўляе нязменнае значэнне літургіі ў жыцці Касцёла. Пры гэтым маецца на ўвазе тое, што абвяшчэнне Евангелля і навучанне праўдам веры знаходзіць сваю рэалізацыю ў сакрамэнтальным жыцці вернікаў, у якім ажыццяўляецца збаўчая Пасхальная таямніца Хрыста.

Трэцяя частка — «Жыццё ў Хрысце» — навучае аб абавязках хрысціянаў жыць паводле прынцыпаў хрысціянскай веры, быць заўсёды вернымі збаўчаму духу Евангелля і яго сведкамі.

І, нарэшце, чацвёртая частка — «Хрысціянская малітва» — прадстаўляе малітоўнае жыццё веруючых, якія па прыкладзе Хрыста паклікаsuccessfully да размовы з Богам на малітве. Хрысціянін — гэта чалавек малітвы.

Такім чынам *Кампендый* уводзіць у таямніцу Бога і збаўлення чалавека, цэнтральнае месца ў якой займае асоба Езуса Хрыста, які праз Духа Святога дзейнічае ў Касцёле.

Секулярна-ліберальныя выклікі нашага часу патрабуюць адраджэння і аднаўлення працэсу катэхізацыі, каб кожны чалавек меў магчымасць пазнаць праўды веры і маральныя нормы, дадзеныя яму дзеля яго дабра і збаўлення, каб ён, жывучы паводле іх, будаваў Божае Валадарства: валадарства праўды і жыцця, валадарства святасці і ласкі, валадарства справядлівасці, любові і спакою.

Спадзяюся, што *Кампендый* стане новай дзейснай прыладай катэхізацыі, а таксама паспрыяе ўмацаванню хрысціянскай веры і маральнасці як саміх веруючых, так і тых, хто сумняваецца і знаходзіцца ў пошуку. Няхай яго змест і ідэі моцным рэхам адгукнуцца ў сэрцах людзей і фарміруюць іх жыццё у сучасным свеце, які патрабуе духоўнага абнаўлення.

Спадзяюся таксама, што ён будзе садзейнічаць далейшаму развіццю адносін з іншымі хрысціянскімі веравызнаннямі, асабліва з Праваслаўнай Царквой, у справе абвяшчэння праўдаў хрысціянскай веры, супольнай абароны хрысціянскіх каштоўнасцяў і сведчання пра іх.

Выданне *Кампендыя* — кнігі веры — на беларускай мове з'яўляецца таксама ўкладам Каталіцкага Касцёла ў развіццё беларускай культуры і абагачэнне яе новым рэлігійным зместам і тэрміналогіяй.

Дзякую перакладчыкам, спонсарам і выдаўцам *Кампендыя* і ўсіх іх, а таксама тых, хто будзе ім карыстацца, давяраю Марыі, Маці Касцёла, і ад усяго сэрца благаслаўляю.



Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі

Мінск, 25 сакавіка 2010 г.
Урачыстасць Звеставання Пана.

## MOTU PROPRIO
### для зацвярджэння і апублікавання *Кампендыя Катэхізіса Каталіцкага Касцёла*

*Шаноўным братам кардыналам, патрыярхам, арцыбіскупам, біскупам, прэзбітэрам, дыяканам і ўсім членам Божага народу*

Ужо мінула дваццаць гадоў з таго часу, калі па жаданні Надзвычайнага Сходу Сіноду Біскупаў з нагоды дваццатай гадавіны заканчэння Другога Ватыканскага Сусветнага Сабору была распачата праца над *Катэхізісам Каталіцкага Касцёла*.

Бясконца дзякую Пану Богу за тое, што даў Касцёлу *Катэхізіс*, абвешчаны ў 1992 г. маім шаноўным і ўмілаваным Папярэднікам папам Янам Паўлам II.

Вялікая карысць і каштоўнасць гэтага дару пацверджана перш за ўсё пазітыўным і шырокім прыняццем яго біскупамі, да якіх у першую чаргу быў скіраваны як дакладны і аўтэнтычны тэкст для навучання каталіцкай дактрыне, а асабліва для распрацоўкі мясцовых катэхізісаў. Катэхізіс быў таксама прыхільна і велікадушна прыняты ўсім Божым народам, які мог пазнаёміцца з ім больш чым на пяцідзесяці мовах, на якія ён быў перакладзены да гэтага часу, і ацаніць яго.

Сёння з вялікай радасцю зацвярджаю і абвяшчаю *Кампендый* гэтага Катэхізіса.

Такім было пажаданне ўдзельнікаў Міжнароднага Катэхетычнага Кангрэса, што праходзіў у кастрычніку 2002 г., якія такім чынам выразілі шырока распаўсюджанае ў Касцёле прагненне. Святой памяці мой Папярэднік, падтрымліваючы гэтае пажаданне, прыняў у лютым 2003 г. рашэнне аб падрыхтоўцы *Кампендыя* і даручыў яго рэдакцыю спецыяльнай Камісіі Кардыналаў, на чале са мною, у супра-

цоўніцтве з рознымі экспертамі. У ходзе прац праект гэтага *Кампендыя* быў прадстаўлены на ацэнку ўсім найдастойнейшым кардыналам і старшыням Канферэнцый Біскупаў, якія ў пераважнай большасці прыхільна прынялі яго і ацанілі.

*Кампендый*, які прадстаўляю паўсюднаму Касцёлу, з'яўляецца верным і дакладным сінтэзам *Катэхізіса Каталіцкага Касцёла*. Ён змяшчае ў скарочаным выглядзе ўсе істотныя і фундаментальныя элементы веры Касцёла і такім чынам стварае, як гэтага жадаў мой Папярэднік, своеасаблівы *vademecum*, які дазваляе веруючым і няверуючым асобам ахапіць адным позіркам адразу ўсю панараму каталіцкай веры.

Па структуры, змесце і мове *Кампендый* дакладна адлюстроўвае *Катэхізіс Каталіцкага Касцёла,* які дзякуючы гэтаму сінтэзу набывае большую папулярнасць і будзе глыбей пазнаны.

Таму з надзеяй дapplying дручаю гэты *Кампендый* у першую чаргу ўсяму Касцёлу і асабліва кожнаму хрысціяніну, каб яны дзякуючы яму адшукалі ў гэтым трэцім тысячагоддзі жывое натхненне для адноўленага абавязку евангелізацыі і выхавання ў веры, што павінна характарызаваць кожную касцёльную супольнасць і кожнага веруючага ў Хрыста, незалежна ад узросту і нацыянальнай прыналежнасці.

Гэты *Кампендый,* з прычыны сваёй сцісласці, яснасці і цэласнасці, адрасаваны таксама кожнаму чалавеку, які, жывучы ва неўпарадкаваным свеце і знаходзячыся пад уплывам разнастайных пасланняў, жадае пазнаць Шлях Жыцця, Праўду, якую Бог даверыў Касцёлу праз свайго Сына.

Чытаючы гэты аўтарытэтны дапаможнік, якім ёсць *Кампендый*, няхай кожны, дзякуючы галоўным чынам заступніцтву Найсвяцейшай Марыі, Маці Хрыста і Касцёла, распазнае і прыме ўсю невычэрпную прыгажосць, унікальнасць і актуальнасць найцудоўнейшага Дару, які Бог даў чалавецтву: свайго адзінага Сына, Езуса Хрыста, які ёсць Дарогай, Праўдай і Жыццём (пар. Ян 14, 6).

28 чэрвеня 2005 г., у вігілію ўрачыстасці св. Пятра і Паўла, у першы год майго Пантыфікату.

Benedictus PP XVI


IC
XC

Абраз Хрыста *Пантакратара* (грэч. pantocrator — той, які ўсё падтрымлівае, усеўладны) рэдкай мастацкай прыгажосці нагадвае нам словы псальміста:

«Ты найпрыгажэйшы з сыноў чалавечых, на тваіх вуснах разлілася ласка» (Пс 45 [44], 3).

Святы Ян Хрызастом, узносячы хвалу Пану Езусу, пісаў:

«Хрыстус быў у расквіце гадоў, у моцы Духа, ззяла ў Ім падвойная прыгажосць: душы і цела» (PG 52, 479).

Сваёй маляўнічай мовай гэты абраз перадае сінтэз першых Сусветных Сабораў — прадстаўляе бляск чалавечнасці і ззянне боскасці Езуса.

Хрыстус апрануты ў чырвоную туніку, пакрытую цёмна-сінім плашчом. Два колеры нагадваюць пра Яго падвойную натуру, а залацісты бляск сведчыць аб боскай асобе Слова. З правага пляча спадае залатая стула — сімвал Яго вечнага святарства. Яго велічны і спакойны твар у густой капне валасоў абкружаны арэолам са знакам крыжа, на якім прадстаўлена *трыграма* «Ο Ω Ν» (*«ТОЙ, ЯКІ ЁСЦЬ»*), што нагадвае аб'яўленне імя Бога ў кнізе Зыходу (3, 14). Уверсе па баках абраза знаходзяцца дзве *дыграмы:* «IC — XC» (*«Езус» — «Хрыстус»*), якія з'яўляюцца назвай самога абраза.

Правая рука з сагнутымі, амаль зведзенымі вялікім і персценевым пальцамі (што ўказвае на падвойную натуру Хрыста ў еднасці асобы), паказана ў тыповым жэсце благаслаўлення. Левая рука трымае кнігу Евангелля, упрыгожаную трыма спражкамі, пярлінамі і каштоўнымі камянямі. Евангелле — сімвал і сінтэз Божага слова, мае таксама літургічнае значэнне, паколькі падчас эўхарыстычнай цэлебрацыі чытаецца з яго ўрывак і прамаўляюцца словы самога Езуса падчас кансэкрацыі.

Гэты вобраз — выдатны сінтэз натуралістычных і сімвалічных элементаў — запрашае да кантэмпляцыі і наследавання. Таксама сёння Езус праз Касцёл, сваю абранніцу і сваё Містычнае цела, працягвае благаслаўляць чалавецтва і асвячае яго сваім Евангеллем, аўтэнтычнай кнігай праўды, шчасця і збаўлення чалавека.

У жніўні 386 г. св. Аўгустын падчас знаходжання ў садзе пачуў голас, які казаў: «Бяры і чытай, бяры і чытай» (*Confessioni*, 8, 12, 29). *Кампендый Катэхізіса Каталіцкага Касцёла,* будучы сінтэзам Евангелля Езуса, якое прадстаўлена ў катэхезе Касцёла, — гэта запрашэнне адкрыць кнігу праўды і чытаць яе, больш за тое, праглынуць яе, як зрабіў гэта прарок Эзэхіэль (пар. Эзх 3, 1–4).

---

Тэафан Крыцкі. *Абраз Хрыста* (1546 г.). Кляштар Стаўранікіты, гара Афон

# УВОДЗІНЫ

1. 11 кастрычніка 1992 г. папа Ян Павел II перадаў вернікам усяго свету *Катэхізіс Каталіцкага Касцёла*, прадстаўляючы яго як «*тэкст аднясення*»[1] для катэхезы, адноўленай каля жывых крыніц веры. Такім чынам, праз трыццаць гадоў пасля адкрыцця Другога Ватыканскага Сабору (1962–1965) было паспяхова здзейснена выказанае ў 1985 г. Надзвычайным Сходам Сіноду Біскупаў жаданне скласці катэхізіс усёй каталіцкай дактрыны адносна веры і маралі.

Праз пяць гадоў, 15 жніўня 1997 г., абвясціўшы *ўзорнае выданне Катэхізіса Каталіцкага Касцёла*, Найвышэйшы Пантыфік пацвердзіў асноўную мэту гэтай працы: «Поўнае і цэласнае прадстаўленне каталіцкага веравучэння, якое дазволіць усім пазнаць, што сам Касцёл вызнае, цэлебруе, чым жыве, як моліцца ў сваім штодзённым жыцці»[2].

2. Каб больш падкрэсліць значэнне *Катэхізіса* і выйсці насустрач жаданню, выказанаму на Міжнародным Катэхетычным Кангрэсе ў 2002 г., Ян Павел II склікаў у 2003 г. Спецыяльную Камісію на чале з кард. Ёзафам Ратцынгерам, прэфектам Кангрэгацыі Веравучэння, абавязваючы яе распрацаваць *Кампендый Катэхізіса Каталіцкага Касцёла*, які змяшчаў бы больш сінтэтычныя фармулёўкі тых самых пастулатаў веры. Пасля двух гадоў працы быў падрыхтаваны *праект Кампендыя* і высланы на абмеркаванне кардыналам і старшыням Канферэнцый Біскупаў. *Праект* у цэлым атрымаў станоўчую ацэнку з боку абсалютнай большасці рэспандэнтаў. Таму Камісія распачала перагляд вышэйзгаданага *праекта*, беручы пад увагу атрыманыя прапановы па яго паляпшэнні, і падрыхтавала канчатковы тэкст.

3. *Кампендый* адзначаецца трыма характэрнымі рысамі: цеснай сувяззю з *Катэхізісам Каталіцкага Касцёла*; формай *дыялогу*; выкарыстаннем *ілюстрацый* у катэхезе.

Перш за ўсё *Кампендый* не з’яўляецца самастойнай працай і не імкнецца нейкім чынам замяніць *Катэхізіс Каталіцкага Касцёла*: на-

[1] Пар. Giovani Paolo II, Cost. ap. *Fidei depositum,* 11 ottobre 1992.
[2] Giovani Paolo II, Lett. ap. *Laetamur magnopere*, 15 agosto 1997.

адварот, ён пастаянна спасылаецца на яго, дакладна ўказваючы нумары адсылкі, а таксама ўвесь час нагадвае пра яго структуру, паслядоўнасць і змест. Больш за тое, мэта *Кампендыя* — нанова абудзіць зацікаўленасць і захапленне *Катэхізісам*, які дзякуючы сваім мудрым тлумачэнням і глыбокай духоўнасці надалей застаецца сёння асноўным тэкстам касцёльнай катэхезы.

*Кампендый,* як і *Катэхізіс,* падзелены на чатыры часткі ў адпаведнасці з асноўнымі законамі жыцця ў Хрысце.

Першая частка пад загалоўкам «Вызнанне веры» змяшчае неабходны сінтэз *lex credendi*, г.зн. вызнаванай Каталіцкім Касцёлам веры, і заканчваецца Апостальскім сімвалам веры, дапоўненым Нікейска-Канстанцінопальскім сімвалам веры, пастаяннае прамаўленне якога на хрысціянскіх сходах дазваляе захаваць жывую памяць пра галоўныя праўды веры.

Другая частка пад загалоўкам «Цэлебрацыя хрысціянскай таямніцы» прадстаўляе істотныя элементы *lex celebrandi*. Сапраўды, абвяшчэнне Евангелля знаходзіць свой прывілеяваны адказ у сакрамэнтальным жыцці. У ім вернікі зведваюць і даюць сведчанне ў кожны момант свайго існавання аб збаўчай плённасці Пасхальнай таямніцы, праз якую Хрыстус здзейсніў справу нашага адкуплення.

Трэцяя частка пад загалоўкам «Жыццё ў Хрысце» нагадвае пра *lex vivendi*, г.зн. пра абавязак, якім ахрышчаныя павінны кіравацца ў сваіх паводзінах і этычным выбары, — вернасць вызнаванай і цэлебраванай веры. Вернікі сапраўды пакліканы Панам Езусам здзяйсняць справы, якія надаюць ім годнасць дзяцей Айца ў любові Духа Святога.

Чацвёртая частка пад загалоўкам «Хрысціянская малітва» прадстаўляе сінтэз *lex orandi,* г.зн. малітоўнага жыцця. На ўзор Езуса, дасканалага прыкладу малітвы, хрысціянін таксама пакліканы да дыялогу з Богам у малітве, асаблівым выяўленнем якой ёсць *Ойча наш* — малітва, якой навучыў нас сам Езус.

4. Другая характэрная рыса *Кампендыя* — форма *дыялогу*, якая аднаўляе старажытны літаратурны жанр катэхезы ў форме пытанняў і адказаў. Гаворка ідзе аб тым, каб прапанаваць ідэальны дыялог паміж настаўнікам і вучнем пры дапамозе паслядоўных пытанняў, якія ўцягваюць чытача і запрашаюць яго пастаянна адкрываць новыя аспекты праўдаў сваёй веры. Форма дыялогу спрые таксама значнаму скарачэнню тэксту, зводзячы яго да істотных рэчаў. Гэта напэўна паспрые засваенню і магчымаму запамінанню зместу.

5. Трэцяя характэрная рыса — наяўнасць пэўных ілюстрацый, якія раскрываюць змястоўную цэласнасць *Кампендыя*. Яны паходзяць з вельмі багатай хрысціянскай іканаграфічнай спадчыны. Векавая саборная традыцыя сведчыць пра тое, што абразы таксама з'яўляюцца абвяшчэннем Евангелля. Мастакі ўсіх часоў прапанавалі вернікам для кантэмпляцыі і разважання вядомыя факты таямніцы збаўлення, паказваючы іх у багацці колераў і ў дасканалай прыгажосці. Гэта сведчанне таго, што сёння, у цывілізацыі вобраза, сакральны вобраз, як ніколі раней, можа выражаць нашмат больш, чым само слова, паколькі яго дынамізм камунікацыі і перадачы евангельскага паслання з'яўляецца нашмат больш дзейсным.

6. У саракавую гадавіну заканчэння Другога Ватыканскага Сабору і ў Год Эўхарыстыі *Кампендый* можа быць далейшай дапамогай як у наталенні голаду праўды для вернікаў усіх узростаў і асяроддзяў, так і ў задавальненні патрэбаў тых, хто, не з'яўляючыся вызнаўцамі веры, прагне праўды і справядлівасці. Абнародаванне *Кампендыя* адбудзецца ва ўрачыстасць св. апосталаў Пятра і Паўла, стаўпоў паўсюднага Касцёла і выдатных прапаведнікаў Евангелля ў старажытным свеце. Гэтыя Апосталы бачылі тое, што прапаведвалі, і сведчылі аб праўдзе Хрыста ажно да мучаніцтва. Будзем жа падобнымі да іх у місійным запале і просім Пана, каб Касцёл заўсёды наследаваў навучанне Апосталаў, ад якіх атрымаў першае радаснае абвяшчэнне веры.

20 сакавіка 2005 г., Пальмовая нядзеля.

Кард. Ёзаф Ратцынгер<br>*Старшыня Спецыяльнай Камісіі*





Гэты незвычайны абраз «Пакланенне мудрацоў» (пар. Мц 2, 1–12) прадстаўляе аб'яўленне Езуса ўсім людзям. Уцелаўленне — гэта не толькі дар веры Марыі, Юзафа, жанчын, пастухоў, простых людзей з ізраэльскага народу, але таксама веры гэтых іншаземцаў, якія прыйшлі з Усходу, каб пакланіцца нованароджанаму Месіі і ахвяраваць Яму свае дары:

«Увайшоўшы ў дом, яны ўбачылі Дзіця з Марыяй, Маці Яго, і ўпалі, і пакланіліся Яму. І адчыніўшы скарбніцы свае, ахвяравалі Яму золата, кадзіла і міру» (Мц 2, 11).

Мудрацы прадстаўляюць першыя народы, пакліканыя да веры, якія набліжаюцца да Езуса не з пустымі рукамі, але з багаццем сваіх зямель і культур.

Евангелле Езуса — гэта збаўчае слова для ўсяго чалавецтва. Св. Леў Вялікі казаў:

«Усе народы, прадстаўленыя трыма мудрацамі, няхай пакланяюцца Стварыцелю сусвету, каб Бог быў вядомы не толькі ў Юдэі, але на ўсёй зямлі, бо паўсюль у Ізраэлі ўзвялічваецца Яго імя (пар. Пс 76 [75], 2)» (*Discorso 3 per l'Epifania*).

Гэтая першая частка *Кампендыя* паказвае сустрэчу Бога і чалавека і адказ веры, які Касцёл ад імя ўсіх людзей дае на дар збаўчага ўцелаўлення Божага Сына і Яго боскага аб'яўлення.

---

Джэнціле да Фабрыяна. *Пакланенне мудрацоў* (1423 г.). Фларэнцыя, галерэя Уфіцы

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

# ВЫЗНАННЕ ВЕРЫ

РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

# «ВЕРУ» — «ВЕРЫМ»



Гэтая мініяцюра прадстаўляе поўны цыкл шасці дзён стварэння ажно да спакушэння першых бацькоў (пар. Быц 1–3).

«Незлічоныя, Пане, Твае справы.
Усё Ты мудра стварыў,
зямля напоўнілася Тваімі стварэннямі.
Вось распасцёрлася шырокае і вялікае мора,
у ім безліч паўзуноў, жывёлаў малых і вялікіх.
Там вандруюць караблі,
і левіятан, якога Ты стварыў, забаўляецца там.
Усе яны чакаюць, што Ты дасі ім есці ў свой час.
Калі даеш ім, яны збіраюць,
калі раскрываеш руку сваю,
яны насычаюцца дабром.
Няхай знікнуць з зямлі грэшнікі
і няхай не будзе больш бязбожных.
Благаславі, душа мая, Пана» (Пс 104 [103], 24–28.35).

Падчас Пасхальнай вігіліі Касцёл праслаўляе Пана за найвялікшую справу адкуплення чалавецтва і сусвету:

«Усемагутны вечны Божа, дзівосны Ты ва ўсіх Тваіх справах,
учыні, каб адкуплены Табою народ зразумеў,
наколькі цудоўнай была справа стварэння на пачатку
і яшчэ цудоўнейшай — справа адкуплення ў поўні часу,
калі як пасхальны Баранак быў ахвяраваны за нас Езус Хрыстус.
Які жыве і валадарыць на векі вечныя».

---

Біблія з Сувіны. *Мініяцюра на тэму дзён стварэння* (кан. XII ст.). Мулен, Муніцыпальная бібліятэка

**1. Які Божы намер адносна чалавека?**

Бог, бясконца дасканалы і благаслаўлёны ў самім сабе, на- 1-25
мерам чыстай дабрыні і свабодна стварыў чалавека, каб зрабіць яго ўдзельнікам свайго благаслаўлёнага жыцця. У поўні часу Бог Айцец паслаў свайго Сына як Адкупіцеля і Збаўцу людзей, якія ўпалі ў грэх, каб сабраць іх у сваім Касцёле і праз дзеянне Духа Святога зрабіць зноў сваімі дзецьмі і спадкаемцамі свайго вечнага шчасця.

## ГЛАВА ПЕРШАЯ

## ЧАЛАВЕК – «СВЯТЫНЯ» БОГА

*«Вялікі Ты, Пане, і годны хвалы [...]. Ты нас стварыў для* 30
*сябе, і неспакойнае сэрца нашае, пакуль не знойдзе спакой у Табе»* (св. Аўгустын).

**2. Чаму ў чалавеку ёсць прагненне Бога?**

Бог, ствараючы чалавека паводле свайго падабенства, уклаў 27-30
у ягонае сэрца прагненне бачыць Яго. І, нягледзячы на тое, што 44-45
гэтае прагненне часта ігнаруецца, Бог не перастае прыцягваць чалавека да сябе дзеля таго, каб ён жыў у Ім і ў Ім знаходзіў паўнату праўды і шчасця, якую няспынна шукае. Па сваёй натуры і згодна з пакліканнем чалавек – рэлігійная істота, здольная ўвайсці ў супольнасць з Богам. Гэтая асабістая і жыццёвая сувязь з Богам адкрывае чалавеку яго фундаментальную годнасць.

**3. Як можна пазнаць Бога пры дапамозе толькі святла розуму?**

Пачынаючы ад стварэння, а менавіта, свету і чалавечай асо- 31-36
бы, чалавек можа з упэўненасцю, пры дапамозе толькі розуму, 46-47

пазнаваць Бога як пачатак і канец сусвету і як найвышэйшую дабрыню, праўду і бясконцую прыгажосць.

**4. Ці дастаткова толькі святла розуму, каб пазнаць Божую таямніцу?**

37-38 Пазнаючы Бога толькі святлом розуму, чалавек сутыкаецца са шматлікімі цяжкасцямі. Акрамя таго, ён не можа ўласнымі сіламі спасцігнуць сутнасць Божай таямніцы. Таму Бог захацеў праліць святло свайго Аб’яўлення не толькі на праўды, якія пераўзыходзяць чалавечае разуменне, але таксама на рэлігійныя і маральныя праўды, якія, хоць самі па сабе даступныя розуму, праз гэта могуць з лёгкасцю быць пазнаныя ўсімі, з большай упэўненасцю і беспамылкова.

**5. Як можна гаварыць пра Бога?**

39-43 48-49 Пра Бога можна гаварыць усім і з усімі, зыходзячы з дасканаласці чалавека і іншых стварэнняў, якая з’яўляецца адлюстраваннем, хоць і абмежаваным, бясконцай дасканаласці Бога. Тым не менш, неабходна няспынна ачышчаць нашую мову ад усяго ўяўнага і недасканалага, добра ўсведамляючы, што немагчыма цалкам выказаць бясконцую Божую таямніцу.

## ГЛАВА ДРУГАЯ

# БОГ ВЫХОДЗІЦЬ НАСУСТРАЧ ЧАЛАВЕКУ

## Божае Аб’яўленне

**6. Што Бог аб’яўляе чалавеку?**

50-53 68-69 Бог у сваёй дабрыні і мудрасці аб’яўляецца чалавеку. Праз чыны і словы аб’яўляе сябе самога і свой добразычлівы намер, які адвеку заклаў у Хрысце на карысць чалавецтва. Гэты намер заключаецца ў тым, каб праз ласку Духа Святога даць у Яго адзіным Сыне магчымасць удзельнічаць у Божым жыцці ўсім людзям, якія з’яўляюцца Яго ўсыноўленымі дзецьмі.

### 7. Якія першыя этапы Божага Аб'яўлення?

Напачатку Бог аб'явіўся прабацькам, Адаму і Еве, і запрасіў 54-58
іх да глыбокай еднасці з Ім. Пасля іх упадку Ён не спыняе свай- 70-71
го Аб'яўлення і абяцае збаўленне ўсім іхнім нашчадкам. Пасля патопу Бог заключае запавет з Ноем і ўсімі жывымі істотамі.

### 8. Якія наступныя этапы Божага Аб'яўлення?

Бог выбірае Абрагама, заклікаючы яго пакінуць свой край, 59-64
каб зрабіць яго «айцом мноства народаў» (Быц 17, 5), і абяцаю- 72
чы благаславіць у ім «усе народы зямлі» (Быц 12, 3). Нашчадкі Абрагама будуць захавальнікамі Божага абяцання, дадзенага патрыярхам. Бог робіць Ізраэль сваім выбраным народам і, вызваляючы яго з егіпецкай няволі, заключае з ім запавет на гары Сінай, і дае яму праз Майсея свой Закон. Прарокі прадказваюць поўнае адкупленне народу і збаўленне, якое ахопіць усе народы ў новым і вечным запавеце. З народу Ізраэля, з роду караля Давіда народзіцца Месія: Езус.

### 9. Якім ёсць поўны і канчатковы этап Божага Аб'яўлення?

Гэта этап Аб'яўлення, здзейснены ва ўцелаўлёным Слове, 65-66
Езусе Хрысце, Пасрэдніку і Паўнаце Аб'яўлення. Хрыстус, 73
Адзінародны Сын Божы, які стаўся чалавекам, ёсць дасканалым і канчатковым Словам Айца. З пасланнем Сына і дарам Духа Святога Аб'яўленне ўрэшце было канчаткова завершана, але на працягу вякоў вера Касцёла павінна паступова спасцігаць яго сутнасць.

> *«Ад моманту, калі Бог даў нам свайго Сына, які з'яўляецца Яго адзіным і канчатковым Словам, Ён усё сказаў адразу ў гэтым адным сваім Слове і не мае больш нічога сказаць»* (св. Ян ад Крыжа).

### 10. Якое значэнне маюць прыватныя аб'яўленні?

Не з'яўляючыся дэпазітам веры, яны могуць дапамагаць 67
жыць верай пры ўмове, што іх адзіным арыентырам ёсць Хрыс-

тус. Таму Настаўніцкі Інстытут Касцёла, які павінен распазнаваць такія прыватныя аб’яўленні, не можа прымаць тыя, якія прэтэндуюць пераўзысці або выправіць канчатковае Аб’яўленне, якім ёсць Хрыстус.

## Перадаванне Божага Аб’яўлення

**11. Чаму і якім чынам перадаецца Божае Аб’яўленне?**

74 Бог «хоча, каб усе людзі былі збаўлены і дайшлі да пазнання праўды» (1 Цім 2, 4) — Езуса Хрыста. Таму неабходна, каб Хрыстус быў абвешчаны ўсім людзям, паводле свайго ж наказу: «Ідзіце і навучайце ўсе народы» (Мц 28, 19). Гэты наказ ажыццяўляецца праз Апостальскую Традыцыю.

**12. Што такое Апостальская Традыцыя?**

75-79 Апостальскай Традыцыяй называецца перадаванне паслан-
83 ня Хрыста, якое адбываецца ад пачатку хрысціянства праз пра-
96, 98 паведванне, сведчанне, інстытуцыі, культ і натхнёныя тэксты. Апосталы пераказалі сваім паслядоўнікам — біскупам, а праз іх усім пакаленням аж да сканчэння вякоў усё, што атрымалі ад Хрыста і чаму навучыліся ад Духа Святога.

**13. Якім чынам ажыццяўляецца Апостальская Традыцыя?**

76 Апостальская Традыцыя ажыццяўляецца двума шляхамі: жывым перадаваннем Божага слова (звычайна званым Традыцыяй) і праз Святое Пісанне, якое з’яўляецца такім жа абвяшчэннем збаўлення, замацаваным у пісьмовай форме.

**14. Якая сувязь існуе паміж Традыцыяй і Святым Пісаннем?**

80-82 Традыцыя і Святое Пісанне цесна ўзаемазвязаны паміж
97 сабой. Разам яны робяць прысутнай і жыватворчай у Касцёле таямніцу Хрыста і зыходзяць з адзінай Божай крыніцы: яны ствараюць адзіны святы дэпазіт веры, з якога Касцёл чэрпае сваю ўпэўненасць адносна ўсіх аб’яўленых праўдаў.

### 15. Каму даручаны дэпазіт веры?

Дэпазіт веры даручаны праз Апосталаў усёй супольнасці 84, 91
Касцёла. Увесь Божы народ са звышпрыродным пачуццём веры 94, 99
праз падтрымку Духа Святога і пад кіраўніцтвам Настаўніцкага Інстытута Касцёла прымае Божае Аб'яўленне, усё больш спасцігаючы яго і жывучы ім.

### 16. Каму належыць аўтэнтычнае тлумачэнне дэпазіту веры?

Аўтэнтычнае тлумачэнне дэпазіту веры даручана толькі 85-90
жывому Настаўніцкаму Інстытуту Касцёла, гэта значыць на- 100
ступніку Пятра — Біскупу Рыма — і біскупам у еднасці з ім. Настаўніцкі Інстытут Касцёла ў служэнні Божаму слову мае бясспрэчную харызму праўды. Ён упаўнаважаны таксама вызначаць дагматы, якія фармулююць праўды, змешчаныя ў Божым Аб'яўленні. Гэтае права распасціраецца на праўды, цесна звязаныя з Аб'яўленнем.

### 17. Якая сувязь існуе паміж Святым Пісаннем, Традыцыяй і Настаўніцкім Інстытутам Касцёла?

Усе яны так цесна звязаны паміж сабой, што ніводнае з трох 95
не можа існаваць без двух астатніх. Усе разам і кожнае па-свойму, пад кіраўніцтвам Духа Святога, яны плённа прычыняюцца да збаўлення людзей.

## Святое Пісанне

### 18. Чаму Святое Пісанне навучае праўдзе?

Таму што сам Бог з'яўляецца аўтарам Святога Пісання: па- 105-108
гэтаму яно называецца натхнёным і беспамылкова навучае 135-136
праўдам, неабходным для нашага збаўлення. Дух Святы сапраўды натхніў аўтараў-людзей, якія запісалі тое, чаму Ён захацеў нас навучыць. Тым не менш, хрысціянская вера — гэта не «рэлігія Кнігі», але рэлігія Божага слова, якое не з'яўляецца «словам напісаным і мёртвым, але Словам уцелаўлёным і жывым» (св. Бэрнард з Клерво).

**19. Як чытаць Святое Пісанне?**

109-119 137 Святое Пісанне трэба чытаць і тлумачыць з дапамогай Духа Святога і пад кіраўніцтвам Настаўніцкага Інстытута Касцёла згодна з трыма крытэрыямі: 1) звяртаць увагу на змест і адзінства ўсяго Святога Пісання; 2) чытаць Святое Пісанне ў кантэксце жывой Традыцыі Касцёла; 3) захоўваць аналогію веры, гэта значыць сувязь праўдаў веры паміж сабой.

**20. Што такое *канон* Святога Пісання?**

120 138 *Канон* Святога Пісання — гэта поўны спіс святых кніг, якія Апостальская Традыцыя дапамагла распазнаць Касцёлу. Гэты *канон* змяшчае 46 кніг Старога Запавету і 27 кніг Новага Запавету.

**21. Якое значэнне мае Стары Запавет для хрысціянаў?**

121-123 Хрысціяне ўшаноўваюць Стары Запавет як праўдзівае Божае слова: усе яго кнігі натхнёныя Богам і з'яўляюцца вечнай каштоўнасцю. Яны сведчаць пра Божую педагогіку збаўчай любові Бога. Былі напісаныя перш за ўсё дзеля таго, каб падрыхтаваць прыйсце Хрыста, Збаўцы сусвету.

**22. Якое значэнне мае Новы Запавет для хрысціянаў?**

124-127 139 Новы Запавет, у цэнтры якога знаходзіцца Езус Хрыстус, вучыць нас бясспрэчнай праўдзе Божага Аб'яўлення. Сэрца ўсяго Святога Пісання — чатыры Евангеллі: паводле Мацвея, Марка, Лукі і Яна. Яны з'яўляюцца галоўным сведчаннем аб жыцці і вучэнні Езуса і займаюць асаблівае месца ў Касцёле.

**23. Якая сувязь паміж Старым і Новым Запаветам?**

128-130 140 Святое Пісанне — адно, бо адно Божае слова, адзін план Божага збаўлення і адно Божае натхненне ў абодвух Запаветах. Стары Запавет падрыхтоўвае Новы, а Новы здзяйсняе Стары: абодва адзін аднаго тлумачаць.

**24. Якую функцыю выконвае Святое Пісанне ў жыцці Касцёла?**

Святое Пісанне з'яўляецца асновай і жыццядайнай моцай Касцёла. Для яго дзяцей яно з'яўляецца цвярдыняй веры і крыніцай духоўнага жыцця. Гэта душа тэалогіі і пастырскага навучання. Псальміст кажа: «Слова Тваё — светач для маёй нагі, святло на маёй сцежцы» (Пс 119 [118], 105). Касцёл заахвочвае да частага чытання Святога Пісання, бо «няведанне Пісання — гэта няведанне Хрыста» (св. Геранім). 131-133 141

## ГЛАВА ТРЭЦЯЯ

# ЧАЛАВЕК АДКАЗВАЕ БОГУ

## Веру

**25. Як чалавек адказвае Богу, які аб'яўляецца?**

Чалавек, узмоцнены дадзенай яму Божай ласкай, адказвае паслухмянасцю веры, што азначае поўны давер Богу і прыняцце Яго праўды, якую Ён гарантуе і якой сам жа з'яўляецца. 142-143

**26. Хто ў Святым Пісанні з'яўляецца галоўным сведкам паслухмянасці веры?**

Існуе шмат сведкаў, але галоўных двое: *Абрагам*, які падчас выпрабавання «паверыў Богу» (Рым 4, 3) і заўсёды быў паслухмяны Ягонаму закліку, таму і стаў «айцом усіх, хто паверыў» (Рым 4, 11.18), і *Дзева Марыя*, якая самым дасканалым чынам на працягу ўсяго свайго жыцця праяўляла паслухмянасць веры: «*Fiat mihi secundum Verbum tuum (Няхай Мне станецца паводле Твайго слова)*» (Лк 1, 38). 144-149

**27. Што значыць для чалавека верыць у Бога?**

Гэта значыць з'яднацца з самім Богам, давяраючы Яму і згаджаючыся з усімі аб'яўленымі Ім праўдамі, таму што Бог сам ёсць Праўдай. Гэта значыць верыць у адзінага Бога ў трох Асобах: Айца, Сына і Духа Святога. 150-152 176-178

### 28. Якія характэрныя рысы веры?

153-165 Вера — *бескарыслівы дар* Бога, даступны кожнаму, хто аб ім з
179-180 пакорай просіць, — гэта звышпрыродная цнота, *неабходная* для
183-184 збаўлення. Акт веры — гэта *людскі чын*, акт чалавечага розуму, які пад уздзеяннем Божай ласкі добравольна згаджаецца з Божай праўдай. Акрамя гэтага, вера *бясспрэчная*, бо заснаваная на Божым слове; яна *дзейсная*, «бо дзейнічае праз любоў» (Гал 5, 6); яна *няспынна ўзрастае* дзякуючы слуханню Божага слова і малітве. Вера *дае* нам *адчуць* нябесную радасць.

### 29. Чаму няма супярэчнасці паміж верай і навукай?

159 Хоць вера пераўзыходзіць розум, аднак ніколі не можа быць супярэчнасці паміж верай і навукай, бо абедзве паходзяць ад Бога. Менавіта Бог адорвае чалавека верай і святлом розуму.

> *«Вер, каб разумець; разумей, каб верыць»* (св. Аўгустын).

## Верым

### 30. Чаму вера з'яўляецца чынам асабістым і адначасова эклезіяльным?

166-169 Вера з'яўляецца чынам асабістым, бо гэта добравольны ад-
181 каз чалавека Богу, які аб'яўляецца. Але ў той жа час гэта чын эклезіяльны, які выяўляецца ў вызнанні: «Верым». І па сутнасці, менавіта Касцёл верыць: гэта ён праз дзеянне Духа Святога папярэднічае, узрошчвае і жывіць веру кожнага хрысціяніна. Таму Касцёл з'яўляецца Маці і Настаўнікам.

> *«Не можа мець Бога Айцом той, хто не прымае Касцёл як Маці»* (св. Кіпрыян).

### 31. Чаму формулы веры з'яўляюцца важнымі?

170-171 Формулы веры з'яўляюцца важнымі, таму што дазваляюць выказваць, засвойваць, цэлебраваць праўды веры і дзяліцца імі з іншымі людзьмі, карыстаючыся агульнай мовай.

**32. Як разумець, што вера Касцёла з'яўляецца адзінай?**

Касцёл, хоць і складаецца з людзей, якія размаўляюць на розных мовах, маюць розныя культуры і абрады, аднадушна вызнае адзіную веру, атрыманую ад адзінага Пана і перададзеную праз адзіную Апостальскую Традыцыю. Ён вызнае адзінага Бога — Айца, Сына і Духа Святога — і ўказвае адзіны шлях да збаўлення. Таму мы верым адзіным сэрцам і адзінай душой у тое, што змяшчаецца ў Божым слове, напісанным ці перададзеным, і ў што Касцёл прапануе верыць, як у аб'яўленае Богам. 172-175 182

РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

# ВЫЗНАННЕ ХРЫСЦІЯНСКАЙ ВЕРЫ



Гэтая антычная мазаіка рымскай базылікі св. Клімэнта праслаўляе трыумф Крыжа — цэнтральную таямніцу хрысціянскай веры. Мы бачым раскошны куст аканта ў цвіценні, яго шматлікія галіны з кветкамі і пладамі разыходзяцца ў розныя бакі. Жыццёвую моц гэтай расліне дае крыж Езуса, ахвяра якога нанова стварае чалавека і сусвет. Езус — новы Адам, які праз таямніцу сваёй мукі, смерці і ўваскрасення дазваляе зноў квітнець чалавецтву, паяднаўшы яго з Айцом.

Вакол церпячага Хрыста — дванаццаць белых галубоў, якія сімвалізуюць дванаццаць Апосталаў. Пад крыжам стаіць Марыя разам з Янам, умілаваным вучнем:

«Езус, убачыўшы Маці і вучня, які стаяў побач і якога Ён любіў, сказаў Маці: “Жанчына, вось сын Твой”. Потым сказаў вучню: “Вось Маці твая”. І з гэтага часу вучань узяў Яе да сябе» (Ян 19, 26–27).

Уверсе бачная рука Айца, што падносіць карону хвалы свайму Сыну, які перамог смерць сваёй Пасхальнай таямніцай.

Каля самага нізу куста знаходзіцца маленькае аленянё, якое змагаецца са змеем зла.

З гэтай расліны, што ўяўляе сабой дрэва адкуплення, б’е крыніца вады, якая дае пачатак чатыром патокам, што сімвалізуюць чатыры Евангеллі, з якіх спаталяюць смагу веруючыя, як гэта робяць алені каля крыніц жывой вады. Касцёл прадстаўлены тут як нябесны сад, ажыўлены Езусам — сапраўдным дрэвам жыцця.

---

Рым, базыліка св. Клімэнта. *Мазаіка ў апсідзе*. XII ст. (фрагмент — *Крыж: дрэва жыцця*). Рэпрадукцыя зробленая з дазволу ірландскіх айцоў дамініканаў

# ВЕРУ

## Апостальскі сімвал веры

Веру ў Бога, Айца ўсемагутнага,
Стварыцеля неба і зямлі,
і ў Езуса Хрыста, Сына Яго
адзінага, Пана нашага,
які быў зачаты ад Духа Святога,
нарадзіўся з Дзевы Марыі,
замучаны пры Понцкім Пілаце,
укрыжаваны, памёр і быў пахаваны;
зышоў да адхлані,
на трэці дзень уваскрос з памерлых,
узышоў на неба,
сядзіць праваруч Бога Айца
ўсемагутнага,
адтуль прыйдзе судзіць жывых і
памерлых.

Веру ў Духа Святога,
святы Касцёл каталіцкі,
еднасць святых,
адпушчэнне грахоў,
уваскрашэнне цела,
жыццё вечнае.
Амэн.

## Symbolum Apostolicum

Credo in Deum Patrem omnipo-
téntem, Creatórem cæli et terræ,
et in Iesum Christum, Fílium Eius
únicum, Dóminum nostrum,
qui concéptus est de Spíritu Sancto,
natus ex María Vírgine,
passus sub Póntio Piláto,
crucifíxus, mórtuus, et sepúltus,
descéndit ad ínferos,
tértia die resurréxit a mórtuis,
ascéndit ad cælos,
sedet ad déxteram Dei Patris
omnipoténtis,
inde ventúrus est iudicáre vivos et
mórtuos.

Credo in Spíritum Sanctum,
sanctam Ecclésiam cathólicam,
sanctórum communiónem,
remissiónem peccatórum,
carnis resurrectiónem,
vitam ætérnam.
Amen.

## Нікейска-Канстанціно-пальскі сімвал веры

Веру ў адзінага Бога,
Айца ўсемагутнага,
Стварыцеля неба і зямлі,
усяго бачнага і нябачнага.
І ў адзінага Пана Езуса Хрыста,
Сына Божага Адзінароднага,

## Symbolum Nicaenum Constantinopolitanum

Credo in unum Deum,
Patrem omnipoténtem,
Factórem cæli et terræ,
visibílium ómnium et invisibílium.
Et in unum Dóminum Iesum Christum,
Filium Dei unigénitum,

з Айца народжанага
перад усімі вякамі;
Бога ад Бога, Святло ад Святла,
Бога сапраўднага
ад Бога сапраўднага,
народжанага, не створанага,
адзінасутнага Айцу,
праз якога ўсё сталася.
Ён дзеля нас, людзей, і дзеля
нашага збаўлення зышоў з неба.
І ўцелавіўся ад Духа Святога з
Дзевы Марыі, і стаўся чалавекам.
Укрыжаваны таксама за нас
пры Понцкім Пілаце,
быў замучаны і пахаваны.
І на трэці дзень уваскрос паводле
Пісання, і ўзышоў на неба,
сядзіць праваруч Айца.
І зноў прыйдзе ў хвале судзіць
жывых і памерлых,
і Яго Валадарству не будзе канца.

Веру ў Духа Святога,
Пана і Жыватворцу,
які з Айца і Сына паходзіць;
якому разам з Айцом і Сынам
належыць пакланенне і хвала;
які прамаўляў праз прарокаў.

Веру ў адзіны святы каталіцкі і
апостальскі Касцёл.

Вызнаю адзіны хрост
для адпушчэння грахоў
і чакаю ўваскрашэння памерлых
і жыцця вечнага ў будучым свеце.
Амэн.

et ex Patre natum
ante ómnia sǽcula:
Deum de Deo, Lumen de Lúmine,
Deum verum
de Deo vero,
génitum, non factum,
consubstantiálem Patri:
per quem ómnia facta sunt;
qui propter nos hómines et propter
nostram salútem descéndit de cælis,
et incarnátus est de Spíritu Sancto ex
María Vírgine et homo factus est,
crucifíxus étiam pro nobis
sub Póntio Piláto,
passus et sepúltus est,
et resurréxit tértia die secúndum
Scriptúras, et ascéndit in cælum,
sedet ad déxteram Patris,
et íterum ventúrus est cum glória,
iudicáre vivos et mórtuos,
cuius regni non erit finis.

Credo in Spíritum Sanctum,
Dóminum et vivificántem,
qui ex Patre Filióque procédit,
qui cum Patre et Fílio
simul adorátur et conglorificátur,
qui locútus est per prophétas.

Et unam sanctam cathólicam et
apostólicam Ecclésiam.

Confíteor unum Baptísma
in remissiónem peccatórum.
Et expécto resurrectiónem mortu-
órum, et vitam ventúri sǽculi.
Amen.

## ГЛАВА ПЕРШАЯ
## ВЕРУ Ў БОГА АЙЦА
## *Сімвалы веры*

**33. Што такое сімвалы веры?**

Гэта складзеныя формулы, называныя таксама «вызнаннямі 185-188
веры», або «Credo», якімі Касцёл з самага пачатку сцісла выра- 192, 197
жаў і перадаваў сваю веру нарматыўнай мовай, агульнай для
ўсіх вернікаў.

**34. Якія найбольш даўнія сімвалы веры?**

Гэта *хросныя* сімвалы. Паколькі хрост удзяляецца «ў імя 189-191
Айца і Сына, і Духа Святога» (Мц 28, 19), падчас яго вызнаюцца праўды веры адносна трох Асобаў Найсвяцейшай Тройцы.

**35. Якія найбольш важныя сімвалы веры?**

Гэта *Апостальскі сімвал,* які з’яўляецца старажытным хрос- 193-195
ным сімвалам Рымскага Касцёла, і *Нікейска-Канстанцінопальскі сімвал,* які з’яўляецца вынікам першых двух Сусветных Сабораў, у Нікеі (325 г.) і Канстанцінопалі (381 г.), і які да сённяшняга дня з’яўляецца агульным для ўсіх вялікіх Касцёлаў Усходу і Захаду.

### «Веру ў Бога, Айца ўсемагутнага, Стварыцеля неба і зямлі»

**36. Чаму вызнанне веры пачынаецца словамі «Веру ў Бога»?**

Сцвярджэнне «Веру ў Бога» — найбольш важнае, гэта кры- 198-199
ніца ўсіх астатніх праўдаў пра чалавека і свет і пра ўсё жыццё кожнага, хто верыць у Бога.

**37. Чаму мы вызнаём веру ў *адзінага* Бога?**

Бог аб’явіўся народу Ізраэля як Адзіны, калі сказаў: «Слу- 200-202
хай, Ізраэль: Пан, Бог наш, — Пан адзіны» (Дрг 6, 4), «няма 228

іншых» (Іс 45, 22). Езус сам пацвердзіў гэта, кажучы, што Бог — «Пан адзіны» (Мк 12, 29). Вызнанне таго, што Езус і Дух Святы таксама з'яўляюцца Богам і Панам, не робіць ніякага падзелу ў адзіным Богу.

### 38. Пад якім імем аб'яўляецца Бог?

203-205 230-231 Майсею Бог аб'яўляецца як Бог жывы, «Бог Абрагама, Бог Ісаака, Бог Якуба» (Зых 3, 6). Таму ж Майсею Бог аб'яўляе сваё таемнае імя: «Я ЁСЦЬ ТОЙ, ЯКІ ЁСЦЬ (YHWH)». Невымоўнае імя Бога ўжо ў часы Старога Запавету было заменена тытулам *Пан*. У Новым Запавеце Езус, называны *Панам*, з'яўляецца як праўдзівы Бог.

### 39. Толькі Бог «ЁСЦЬ»?

212-213 У той час як стварэнні атрымалі ад Бога ўсё, чым яны з'яўляюцца, і ўсё, што маюць, толькі Бог ёсць паўнатой быцця і ўсялякай дасканаласці. Ён «ТОЙ, ЯКІ ЁСЦЬ», без пачатку і без канца. Езус аб'яўляе, што Ён таксама мае Божае імя: «Я ЁСЦЬ» (Ян 8, 28).

### 40. Чаму важным з'яўляецца аб'яўленне Божага імя?

206-213 Аб'яўленнем свайго імя Бог дае зразумець багацці, якія змяшчаюцца ў Яго неспасцігальнай таямніцы: толькі Ён, спрадвеку і назаўсёды, ёсць тым, хто пераўзыходзіць свет і гісторыю. Гэта Ён стварыў неба і зямлю. Ён Бог верны, заўсёды блізкі да свайго народу, каб яго збавіць. Ён выключна святы, «багаты на міласэрнасць» (Эф 2, 4), заўсёды гатовы прабачыць. Ён — Быццё духоўнае, трансцэндэнтнае, усемагутнае, вечнае, асабовае, дасканалае. Ён ёсць праўдай і любоўю.

> *«Бог — Быццё бясконца дасканалае, якім ёсць Найсвяцейшая Тройца»* (св. Турыбій Манграваха).

**41. У якім сэнсе Бог ёсць праўдай?**

Бог — гэта сама праўда, таму Ён не памыляецца і не ўводзіць 214-217
у зман. Ён «ёсць святло, і няма ў Ім цемры» (1 Ян 1, 5). Адвеч- 231
ны Сын Бога, уцелаўлёная Мудрасць, быў пасланы ў свет, «каб засведчыць аб праўдзе» (Ян 18, 37).

**42. Якім чынам Бог аб’яўляе, што Ён ёсць любоў?**

Бог аб’яўляецца Ізраэлю як той, чыя любоў большая за 218-221
любоў айца ці маці да сваіх дзяцей, або жаніха да сваёй нявесты. Ён у самым сабе «ёсць любоў» (1 Ян 4, 8.16). Ён той, які аддае сябе цалкам і бескарысліва, які «так палюбіў свет, што аддаў Сына свайго Адзінароднага, <...> каб свет быў збаўлены праз Яго» (Ян 3, 16–17). Пасылаючы свайго Сына і Духа Святога, Бог аб’яўляе, што Ён сам ёсць вечным абменам любові.

**43. Што вынікае з веры ў адзінага Бога?**

З веры ў Бога, Адзінага, вынікае наступнае: пазнаванне Яго 222-227
значнасці і велічы; жыццё ва ўдзячнасці; спадзяванне на Бога, 229
нават у безнадзейных сітуацыях; прызнанне непаўторнасці і сапраўднай годнасці ўсіх людзей, створаных паводле Яго падабенства; разумнае карыстанне створанымі Ім рэчамі.

**44. Што з’яўляецца цэнтральнай таямніцай веры і хрысціянскага жыцця?**

Цэнтральнай таямніцай веры і хрысціянскага жыцця з’яў- 232-237
ляецца таямніца Найсвяцейшай Тройцы. Хрысціяне прымаюць хрост у імя Айца і Сына, і Духа Святога.

**45. Ці можа таямніца Найсвяцейшай Тройцы быць зразуметая толькі чалавечым розумам?**

Бог пакінуў сляды свайго трынітарнага Быцця ў стварэнні 237
і ў Старым Запавеце, але глыбіня Яго Быцця як Найсвяцейшай Тройцы ёсць неспасцігальнай таямніцай для чалавечага розуму, а таксама для веры Ізраэля да ўцелаўлення Божага Сына

і спасланне Духа Святога. Гэтая таямніца была аб'яўлена Езусам Хрыстом і з'яўляецца крыніцай усіх іншых таямніц веры.

**46. Што аб'яўляе Езус Хрыстус аб таямніцы Айца?**

240-242 Езус Хрыстус аб'яўляе, што Бог ёсць «Айцом» не толькі таму, што з'яўляецца Стварыцелем сусвету і чалавека, але менавіта таму, што вечна нараджае ў сваім улонні Сына, які ёсць Яго Словам, «адлюстраваннем Ягонай славы, вобразам Ягонай сутнасці» (Гбр 1, 3).

**47. Кім ёсць Дух Святы, аб'яўлены нам Езусам Хрыстом?**

243-248 Гэта трэцяя Асоба Найсвяцейшай Тройцы. Гэта Бог, адзінасутны Айцу і Сыну. Дух Святы «паходзіць ад Айца» (Ян 15, 26), які, пачатак без пачатку, ёсць крыніцай усяго трынітарнага жыцця. Ён паходзіць таксама ад Сына (*Filioque*) ў выніку вечнага дару, які Айцец дае Сыну. Спасланы Айцом і ўцелаўлёным Сынам, Дух Святы накіроўвае Касцёл да пазнання «ўсёй праўды» (Ян 16, 13).

**48. Як Касцёл выяўляе сваю трынітарную веру?**

249-256 Касцёл выяўляе сваю трынітарную веру, вызнаючы аднаго
266 Бога ў трох Асобах: Айца, Сына і Духа Святога. Тры Божыя Асобы з'яўляюцца адным Богам, бо кожная з іх мае аднолькавую паўнату адзінай і непадзельнай Божай натуры. Божыя Асобы адрозніваюцца паміж сабой адносінамі кожнай з іх да дзвюх астатніх: Айцец нараджае Сына, Сын народжаны з Айца, Дух Святы паходзіць ад Айца і Сына.

**49. Як дзейнічаюць тры Божыя Асобы?**

257-260 Непадзельныя ў сваёй адзінай сутнасці Божыя Асобы не-
267 падзельныя таксама ў сваім дзеянні: дзеянне Найсвяцейшай Тройцы адзінае і тое ж самае. Аднак у адзіным Божым дзеянні кожная Асоба прадстаўляе тое, што ўласціва Ёй у Тройцы.

*«О, мой Божа, Тройца, якую праслаўляю... Супакой душу маю; зрабі яе сваім небам, сваім умілаваным прытулкам і месцам свайго адпачынку. Няхай ніколі не пакіну там Цябе ў адзіноце, але няхай буду там уся цалкам, чуваючы ў веры, трываючы ў пакланенні, аддаючыся поўнасцю Тваёй справе збаўлення»* (бл. Альжбета ад Тройцы).

**50. Як разумець, што Бог усемагутны?**

Бог аб'явіўся як «моцны і магутны» (Пс 25 [24]), 8), як той, 268-278
для якога «няма нічога немагчымага» (Лк 1, 37). Яго паўсюдная і таямнічая ўсемагутнасць выяўляецца ў стварэнні свету з нічога і чалавека з любові, але асабліва — ва ўцелаўленні і ўваскрасенні свайго Сына, у дары ўсынаўлення і прабачэння грахоў. Таму Касцёл скіроўвае сваю малітву да «Бога ўсемагутнага і вечнага» (*Omnipotens sempiterne Deus...*).

**51. Чаму важным з'яўляецца сцвярджэнне: «Напачатку Бог стварыў неба і зямлю» (Быц 1, 1)?**

Стварэнне — гэта падмурак усіх Божых намераў збаўлення; 279-289
яно выяўляе ўсемагутную і мудрую любоў Бога; гэта першы 315
крок у накірунку да Запавету адзінага Бога са сваім народам; гэта пачатак гісторыі збаўлення, якая дасягае сваёй кульмінацыі ў Хрысце; гэта першы адказ на асноўныя пытанні чалавека адносна праўды пра сваё паходжанне і сваю мэту.

**52. Хто стварыў свет?**

Айцец, Сын і Дух Святы з'яўляюцца адзіным і непадзель- 290-292
ным пачаткам свету, хоць справа стварэння свету асаблівым 316
чынам прыпісваецца Богу Айцу.

**53. Навошта быў створаны свет?**

Свет быў створаны дзеля хвалы Бога, які захацеў выявіць і 293-294
паказаць сваю дабрыню, праўду і прыгажосць. Канчатковая 319
мэта стварэння — каб Бог у Хрысце мог быць «усё ва ўсім» (1 Кар 15, 28) дзеля сваёй хвалы і дзеля нашага шчасця.

*«Хвалой Божай ёсць жывы чалавек, а жыццё чалавечае ёсць сузіраннем Бога»* (св. Ірэнэй).

**54. Як Бог стварыў сусвет?**

295-301 Бог стварыў сусвет свабодна, з мудрасцю і любоўю. Ства-
317-320 рэнне свету не з'яўляецца вынікам нейкай неабходнасці, сляпога лёсу ці выпадку. Бог стварыў «з нічога» (*ex nihilo*: 2 Мак 7, 28) ўпарадкаваны і добры свет, які Ён бясконца пераўзыходзіць. Бог захоўвае ў існаванні сваё стварэнне і падтрымлівае яго, дае яму здольнасць дзейнічаць і вядзе яго да спаўнення праз свайго Сына і Духа Святога.

**55. У чым заключаецца Божы Провід?**

302-306 Божы Провід заключаецца ў кіраванні, якім Бог вядзе свае
321 стварэнні да канчатковай дасканаласці, да якой Ён іх заклікае. Бог — суверэнны аўтар свайго намеру, але дзеля яго здзяйснення Богу неабходны саўдзел Яго стварэнняў. У той жа час Ён адорвае стварэнні годнасцю дзейнічаць самім, быць прычынамі адно для другога.

**56. Як супрацоўнічае чалавек з Божым Провідам?**

307-308 Бог адорвае і заклікае чалавека, паважаючы яго свабоду, каб
323 ён супрацоўнічаў з Ім праз свае справы, малітвы, а таксама праз пакуты, выклікаючы ў чалавеку «жаданне і дзеянне паводле свайго ўпадабання» (Флп 2, 13).

**57. Калі Бог усемагутны і прадбачлівы, чаму ўсё ж існуе зло?**

309-310 На гэтае пытанне, балючае і таямнічае, можа даць адказ
324, 400 толькі *паўната* хрысціянскай веры. Бог ніякім чынам, непасрэдна ці пасрэдна, не з'яўляецца прычынай зла. Ён тлумачыць таямніцу зла праз свайго Сына Езуса Хрыста, які памёр і ўваскрос, каб перамагчы гэтае вялікае маральнае зло, якім ёсць грэх людзей — корань усялякага іншага зла.

### 58. Чаму Бог дапускае зло?

Вера дае нам упэўненасць, што Бог не дапусціў бы зла, калі б не атрымаў з яго дабра. Бог ажыццявіў ужо гэта цудоўным чынам праз смерць і ўваскрасенне Хрыста. І сапраўды, з найвялікшага маральнага зла — забойства Яго Сына — Ён атрымаў найвялікшыя даброты: праслаўленне Хрыста і нашае адкупленне. 311-314 324

## *Неба і зямля*

### 59. Што стварыў Бог?

Святое Пісанне кажа: «Напачатку Бог стварыў неба і зямлю» (Быц 1, 1). Касцёл у сваім вызнанні веры абвяшчае, што Бог ёсць Стварыцелем усяго бачнага і нябачнага: усіх духоўных і матэрыяльных істотаў, гэта значыць анёлаў і бачнага свету, і асабліва чалавека. 325-327

### 60. Хто такія анёлы?

Анёлы — гэта стварэнні выключна духоўныя, бесцялесныя, нябачныя і несмяротныя; істоты асабовыя, адораныя розумам і воляй. Яны няспынна сузіраюць Бога тварам у твар, праслаўляюць Яго, служаць Яму і з'яўляюцца Яго пасланцамі дзеля здзяйснення справы збаўлення ўсіх людзей. 328-333 350-351

### 61. Якім чынам анёлы прысутнічаюць у жыцці Касцёла?

Касцёл далучаецца да анёлаў у пакланенні Богу, просіць іх аб дапамозе і літургічна адзначае ўспамін некаторых з іх. 334-336 352

*«Кожны вернік мае побач з сабой анёла як ахоўніка і пастыра, які вядзе яго да жыцця»* (св. Базыль Вялікі).

### 62. Чаму навучае Святое Пісанне адносна стварэння бачнага свету?

Праз аповед аб «шасці днях» стварэння Святое Пісанне дае нам зразумець каштоўнасць створанага і яго прызначэнне дзеля хвалы Божай і служэння чалавеку. Усё абавязана сваім існа- 337-344

ваннем Богу, ад якога атрымлівае ўласную якасць і дасканаласць, уласныя законы і ўласнае месца ў свеце.

### 63. Якое месца чалавека ў стварэнні?

343-344 Чалавек з'яўляецца вяршыняй бачнага стварэння, бо ён
353 створаны паводле вобраза і падабенства Бога.

### 64. Якая сувязь існуе паміж створанымі рэчамі?

342 Паміж стварэннямі існуе ўзаемазалежнасць і іерархія, як
354 гэтага пажадаў Бог. У той жа час паміж стварэннямі існуе адзінства і салідарнасць, паколькі ўсе маюць аднаго і таго ж Стварыцеля, з'яўляюцца Яго ўмілаванымі і скіраваныя да Яго хвалы. Павага да законаў, закладзеных у стварэнне, і суадносінаў, якія вынікаюць з прыроды рэчаў, з'яўляецца крыніцай мудрасці і падставай маральнасці.

### 65. Якая сувязь існуе паміж справай стварэння і справай адкуплення?

345-349 Справа стварэння завяршаецца ў яшчэ больш вялікай справе адкуплення. Сапраўды, яно дае пачатак новаму стварэнню, у якім усё знойдзе свой поўны сэнс і сваё здзяйсненне.

## *Чалавек*

### 66. У якім сэнсе чалавек створаны паводле «Божага вобраза»?

355-357 Чалавек створаны паводле Божага вобраза ў тым сэнсе, што здольны свабодна пазнаваць і любіць свайго Стварыцеля. Ён — адзінае стварэнне на гэтай зямлі, якое Бог пажадаў дзеля яго самога і якога паклікаў удзельнічаць праз пазнанне і любоў у сваім Божым жыцці. Паколькі чалавек створаны паводле Божага вобраза, ён мае годнасць асобы: з'яўляецца ні чымсьці, а кімсьці, здольны пазнаваць сябе, дабравольна даваць сябе і ўваходзіць у супольнасць з Богам і іншымі асобамі.

## 67. З якой мэтай Бог стварыў чалавека?

Бог усё стварыў для чалавека, чалавек жа створаны дзеля таго, каб пазнаваць Бога, служыць Яму і любіць Яго, каб праз гэта прыносіць Яму як выраз удзячнасці ўсё створанае ў гэтым свеце і быць узнесеным да жыцця з Богам у небе. Толькі ў таямніцы ўцелаўлёнага Слова знаходзіць сапраўднае святло таямніца чалавека, прадвызначанага ўзнаўляць вобраз Сына Божага, які стаўся чалавекам і які з'яўляецца дасканалым «вобразам нябачнага Бога» (Клс 1, 15). 358-359 381

## 68. Чаму людзі ўтвараюць адзінства?

Усе людзі ўтвараюць адзінства чалавечага роду паводле агульнага пачатку ў Богу. Акрамя таго, Бог «стварыў з аднаго ўвесь род чалавечы» (Дз 17, 26). Усе таксама маюць адзінага Збаўцу і пакліканыя да ўдзелу ў вечным шчасці Бога. 360-361

## 69. Якім чынам душа і цела ўтвараюць у чалавеку адзінства?

Чалавечая асоба адначасова з'яўляецца істотай цялеснай і духоўнай. Дух і матэрыя ў чалавеку ствараюць адну натуру. Гэтае адзінства настолькі глыбокае, што дзякуючы духоўнаму пачатку якім ёсць душа, цела, якое ёсць матэрыяй, становіцца жывым чалавечым целам і ўдзельнічае ў годнасці Божага вобраза. 362-365 382

## 70. Хто адорвае чалавека душой?

Духоўная душа не даецца бацькамі, але непасрэдна ствараецца Богам, яна несмяротная. Аддзяляючыся ад цела ў хвіліну смерці, не гіне; яна зноў з'ядноецца з целам у момант канчатковага ўваскрашэння. 366-368 382

## 71. Якія адносіны ўстанавіў Бог паміж мужчынам і жанчынай?

Мужчына і жанчына створаныя Богам з аднолькавай годнасцю чалавечай асобы і, у той жа час, будучы мужчынам і жанчынай, яны ўзаемадапаўняльныя. Бог стварыў іх адно *дзеля* аднаго, для супольнасці асобаў. Разам яны таксама пакліканыя пера- 369-373 383

даваць чалавечае жыццё, ствараючы ў сужэнстве адно цела (пар. Быц 2, 24), і валадарыць на зямлі як Божыя «кіраўнікі».

**72. Якім быў першапачатковы стан чалавека паводле Божага намеру?**

374-379 384 Бог, ствараючы мужчыну і жанчыну, надзяліў іх дарам асаблівага ўдзелу ў сваім Божым жыцці, у святасці і справядлівасці. Паводле Божага намеру чалавек не павінен быў пакутаваць і паміраць. Больш за тое, панавала дасканалая гармонія ў самім чалавеку, гармонія паміж стварэннем і Стварыцелем, паміж мужчынам і жанчынай, а таксама паміж першай чалавечай парай і ўсім стварэннем.

## *Упадак*

**73. Як зразумець рэчаіснасць граху?**

385-389 У гісторыі чалавека прысутнічае грэх. Гэтая рэчаіснасць цалкам раскрываецца толькі ў святле Божага Аб'яўлення і асабліва ў святле Хрыста, Збаўцы ўсіх, праз якога яшчэ больш памножылася ласка там, дзе памножыўся грэх.

**74. Што такое ўпадак анёлаў?**

391-395 414 Сатана і іншыя дэманы, пра якіх кажа Святое Пісанне і Традыцыя Касцёла як пра анёлаў, што былі створаныя Богам добрымі, сталі злымі, бо праз свабодны і канчатковы выбар адмовіліся ад Бога і Яго Валадарства, даючы такім чынам пачатак пеклу. Яны спрабуюць далучыць чалавека да свайго бунту супраць Бога, але Бог пацвярджае ў Хрысце сваю канчатковую перамогу над злым духам.

**75. У чым заключаецца першы грэх чалавека?**

396-403 415-417 Чалавек, паддаўшыся спакусе д'ябла, дазволіў пагаснуць у сваім сэрцы даверу да свайго Стварыцеля і, непаслухаўшыся Яго, захацеў стаць «як Бог» без Бога і не паводле Бога (Быц 3, 5). Такім чынам Адам і Ева ў той жа момант згубілі для сябе і ўсяго свайго патомства першапачатковую ласку святасці і справядлівасці.

**76. Што такое першародны грэх?**

Першародны грэх, з якім нараджаюцца ўсе людзі, гэта стан пазбаўленасці першапачатковай святасці і справядлівасці. Гэта грэх «атрыманы» намі, а не «здзейснены». Стан гэты звязаны з нараджэннем, а не з асабістым чынам. З прычыны адзінства чалавечага роду ён перадаецца патомкам Адама разам з чалавечай натурай «не праз перайманне, а праз нараджэнне». Гэтае перадаванне застаецца таямніцай, якую немагчыма спасцігнуць да канца. 404 419

**77. Якія іншыя наступствы выклікае першародны грэх?**

У выніку першароднага граху чалавечая натура не цалкам сапсаваная, але зраненая ў сваіх натуральных сілах, падпарадкаваная няведанню, пакутам, уладзе смерці і схільная да граху. Гэтая схільнасць называецца *пажадлівасцю*. 405-409 418

**78. Што ўчыніў Бог пасля першага граху?**

Пасля першага граху свет напоўніўся грахамі, але Бог не пакінуў чалавека ва ўладзе смерці, а, наадварот, таямнічым чынам прадказаў яму — у «Протаевангеллі» (Быц 3, 15) — перамогу над злом і паўстанне з упадку. Гэта першае прадказанне Месіі Адкупіцеля. Таму пазней упадак будзе названы нават *шчаслівай віной*, бо яе «знішчыў такі вялікі Адкупіцель» (літургія Пасхальнай вігіліі). 410-412 420

**ГЛАВА ДРУГАЯ**

## ВЕРУ Ў ЕЗУСА ХРЫСТА, СЫНА БОЖАГА АДЗІНАРОДНАГА

**79. Чым з’яўляецца Добрая Навіна для чалавека?**

Яна з’яўляецца абвяшчэннем Езуса Хрыста, «Сына Бога жывога» (Мц 16, 16), памерлага і ўваскрослага. У часы караля Ірада і цэзара Аўгуста Бог выканаў абяцанні, дадзеныя Абрагаму і яго нашчадкам, спасылаючы «Сына свайго, народжанага 422-424

ад жанчыны, падпарадкаванага Закону, каб адкупіць тых, хто падлягаў Закону, каб мы атрымалі ўсынаўленне» (Гал 4, 4-5).

**80. Як распаўсюджваецца гэтая Добрая Навіна?**

425-429 З самага пачатку першыя вучні мелі моцнае жаданне абвяшчаць Езуса Хрыста, каб прывесці ўсіх да веры ў Яго. Таксама і сёння з напоўненага любоўю пазнання Хрыста нараджаецца жаданне евангелізаваць і катэхізаваць, гэта значыць адкрываць у Яго асобе ўвесь Божы намер і весці чалавека да еднасці з Ім.

## «І ў Езуса Хрыста, Сына Яго адзінага, Пана нашага»

**81. Што азначае імя «Езус»?**

430-435
452 Імя «Езус», дадзенае анёлам у момант звеставання, азначае «Бог збаўляе». Яно выяўляе асобу Езуса і Яго місію, «бо Ён збавіць народ свой ад ягоных грахоў» (Мц 1, 21). Св. Пётр сцвярджае, што «няма іншага імя пад небам, дадзенага людзям, у якім маглі б мы атрымаць збаўленне» (Дз 4, 12).

**82. Чаму Езуса называюць Хрыстом?**

436-440
453 Грэцкае слова «Хрыстус» і габрэйскае «Месія» азначае «памазанік». Езус ёсць Хрыстом, бо Ён асвячаны Богам і памазаны Духам Святым для здзяйснення місіі адкуплення. Ён – Месія, якога чакаў Ізраэль і якога паслаў у свет Айцец. Езус прыняў імя Месіі, удакладняючы, аднак, яго сэнс: той, «хто зышоў з неба» (Ян 3, 13), укрыжаваны і затым уваскрослы, Ён — Слуга церпячы, які прыйшоў, «каб аддаць жыццё сваё дзеля адкуплення многіх» (Мц 20, 28). Ад імя *Хрыстус* паходзіць нашае імя — *хрысціяне*.

**83. У якім сэнсе Езус ёсць «Адзінародным Сынам Божым»?**

441-445
454 Езус з'яўляецца Адзінародным Сынам Божым у адзіным і поўным сэнсе. Падчас Ягонага хросту і перамянення голас Айца

называе Езуса «ўмілаваным Сынам». Прадстаўляючы сябе як Сына, які «ведае Айца» (Мц 11, 27), Езус пацвярджае сваю адзіную і вечную сувязь з Богам, сваім Айцом. Ён — «Адзінародны Сын» (1 Ян 4, 9) Божы, другая Асоба Найсвяцейшай Тройцы. Ён — цэнтр апостальскага прапаведвання: Апосталы бачылі «славу Ягоную, славу, якую мае ад Айца Адзінародны» (Ян 1, 14).

### 84. Што азначае тытул «Пан»?

У Бібліі гэты тытул звычайна азначае Бога Валадара. Езус надае гэты тытул сабе і аб'яўляе сваю Божую веліч праз сваю ўладу над прыродай, дэманамі, грахом і смерцю і асабліва праз сваё ўваскрасенне. Першыя хрысціянскія вызнанні сцвярджаюць, што належная Богу Айцу моц, годнасць і хвала ўласцівыя таксама і Езусу: Бог «даў Яму імя па-над усялякае імя» (Флп 2, 9). Ён — Пан свету і гісторыі, адзіны, каму чалавек павінен цалкам падпарадкоўваць сваю асабістую свабоду. 446-451 455

## «Езус Хрыстус быў зачаты ад Духа Святога, нарадзіўся з Дзевы Марыі»

### 85. Чаму Сын Божы стаўся чалавекам?

Сын Божы ўцелавіўся ва ўлонні Дзевы Марыі ад Духа Святога дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўлення, гэта значыць, каб паяднаць нас, грэшнікаў, з Богам; каб паказаць нам Яго бясконцую любоў; каб стаць для нас прыкладам святасці; каб зрабіць нас «саўдзельнікамі боскай натуры» (2 П 1, 4). 456-460

### 86. Што азначае слова «ўцелаўленне»?

Касцёл называе «ўцелаўленнем» цудоўную таямніцу з'яднання боскай і чалавечай натуры ў адзінай Божай Асобе Слова. Дзеля ажыццяўлення нашага збаўлення Сын Божы стаўся «целам» (Ян 1, 14), сапраўдным чалавекам. Вера ва ўцелаўленне — гэта адметная рыса хрысціянскай веры. 461-463 483

## 87. Якім чынам Езус Хрыстус ёсць сапраўдным Богам і сапраўдным чалавекам?

464-467 469 Езус непадзельна з'яўляецца сапраўдным Богам і сапраўдным чалавекам у адзінстве сваёй Божай Асобы. Ён, Сын Божы, «народжаны, не створаны, адзінасутны Айцу», стаўся сапраўдным чалавекам, нашым братам, не перастаючы пры гэтым быць Богам, нашым Панам.

## 88. Пра што ў сувязі з гэтым навучае Халкідонскі Сабор (451 г.)?

467 Халкідонскі Сабор навучае вызнаваць «аднаго і таго ж Сына, Пана нашага Езуса Хрыста, дасканалага ў сваёй боскасці і дасканалага ў сваёй чалавечнасці; сапраўднага Бога і сапраўднага чалавека, які мае разумную душу і цела; адзінасутнага Айцу ў боскасці, адзінасутнага нам у чалавечнасці, "падобнага да нас ва ўсім, апроч граху" (Гбр 4, 15); народжанага з Айца перад вякамі як Бог, і ў гэтыя апошнія часы, дзеля нас і нашага збаўлення, народжанага як чалавек з Дзевы Марыі, Маці Божай».

## 89. Як Касцёл вызнае таямніцу ўцелаўлення?

464-469 479-481 Касцёл вызнае гэтую таямніцу, сцвярджаючы, што Езус Хрыстус ёсць сапраўдным Богам і сапраўдным чалавекам, мае дзве натуры, боскую і чалавечую, не змешаныя, а з'яднаныя ў Асобе Слова. Усё ў чалавечнасці Езуса — цуды, цярпенні, смерць — павінна быць аднесена да Яго боскай Асобы, якая дзейнічае праз прынятую чалавечую натуру.

*«О, Сыне Адзінародны і Слова Бога, Ты, будучы несмяротным, пажадаў дзеля нашага збаўлення ўцелавіцца ва ўлонні Святой Багародзіцы і заўсёды Дзевы Марыі (...) Ты, які прабываеш у еднасці Святой Тройцы, праслаўлены з Айцом і Святым Духам, збаў нас!»* (Візантыйская літургія св. Яна Хрызастома).

**90. Ці Сын Божы, стаўшыся чалавекам, меў душу, надзеленую людскім пазнаннем?**

Сын Божы прыняў цела, ажыўленае разумнай чалавечай душой. Праз свой чалавечы досвед Езус пазнаў шмат рэчаў. Але таксама, будучы чалавекам, Сын Божы меў глыбокае і непасрэднае пазнанне Бога, свайго Айца. Ён спасцігаў патаемныя думкі людзей і ў той жа час валодаў поўным веданнем адвечных намераў, якія прыйшоў адкрыць. 470-474 482

**91. Як пагаджаюцца дзве волі ва ўцелаўлёным Слове?**

Езус мае волю Божую і волю чалавечую. У сваім зямным жыцці Сын Божы як чалавек хацеў таго, што Ён як Бог разам з Айцом і Духам Святым вызначыў для нашага збаўлення. Чалавечая воля Хрыста без супраціўлення і супрацьстаяння ідзе ўслед за Божай воляй, а дакладней, падпарадкоўваецца ёй. 475 482

**92. Ці меў Хрыстус сапраўднае чалавечае цела?**

Хрыстус прыняў сапраўднае чалавечае цела, праз якое нябачны Бог стаўся бачным. Таму Хрыстус можа быць прадстаўлены і шанаваны ў святых абразах. 476-477

**93. Што прадстаўляе Сэрца Езуса?**

Езус пазнаў і палюбіў нас чалавечым сэрцам. Яго прабітае дзеля нашага збаўлення Сэрца з'яўляецца сімвалам той бясконцай любові, якой Ён любіць Айца і кожнага чалавека. 478

**94. «Зачаты ад Духа Святога...»: што азначае гэты выраз?**

Гэты выраз азначае, што Дзева Марыя зачала адвечнага Сына ў сваім улонні праз дзеянне Духа Святога і без удзелу чалавека. «Дух Святы сыдзе на Цябе» (Лк 1, 35), — сказаў Ёй анёл пры звеставанні. 484-486

## 95. «...Нарадзіўся з Дзевы Марыі»: чаму Марыя сапраўды з'яўляецца Маці Божай?

495 509 Марыя сапраўды з'яўляецца *Маці Божай* таму, што Яна — Маці Езуса (Ян 2, 1; 19, 25). Насамрэч, той, хто быў зачаты праз дзеянне Духа Святога і сапраўды стаў Яе Сынам, ёсць адвечным Сынам Бога Айца. Ён сам з'яўляецца Богам.

## 96. Што азначае «Беззаганнае Зачацце»?

487-492 508 Бог спрадвеку выбраў Марыю на Маці свайго Сына: дзеля выканання гэтай місіі Яна была *беззаганна зачатай*. Гэта азначае, што дзякуючы Божай ласцы і паводле прадбачаных заслуг Езуса Хрыста Марыя была захавана ад першароднага граху з моманту свайго зачацця.

## 97. Як Марыя супрацоўнічала з Божым планам збаўлення?

493-494 508-511 Дзякуючы Божай ласцы Марыя заставалася вольнай ад усялякага асабістага граху на працягу ўсяго свайго жыцця. Яна – «поўная ласкі» (Лк 1, 28), «Усесвятая». Калі анёл абвяшчае, што Яна народзіць «Сына Найвышэйшага» (Лк 1, 32), Марыя, «паслухмяная веры» (Рым 1, 5), дае сваю дабравольную згоду. Яна цалкам прысвячае сябе асобе і справе свайго Сына — Езуса, прымаючы ўсёй душой Божую волю збаўлення.

## 98. Што азначае дзявоцкае зачацце Езуса?

496-498 503 Гэта азначае, што Езус быў зачаты ва ўлонні Дзевы толькі праз моц Духа Святога і без удзелу чалавека. Ён — Сын Нябеснага Айца паводле боскай натуры і Сын Марыі паводле натуры чалавечай; сапраўдны Сын Бога ў дзвюх натурах, у Ім ёсць толькі адна Асоба — боская.

## 99. У якім сэнсе Марыя «заўсёды Дзева»?

499-507 510-511 Марыя «застаецца Дзевай у зачацці свайго Сына, Дзевай – у нараджэнні, Дзевай — цяжарная, Дзевай — Маці, заўсёды Дзевай» (св. Аўгустын). Таму, калі Евангеллі кажуць пра «братоў і сёстраў Езуса», гаворка ідзе — паводле выразу, ужытага ў Святым Пісанні, — пра Яго бліжэйшых родных.

**100. Якім чынам духоўнае мацярынства Марыі з'яўляецца ўсеагульным?**

Марыя мае адзінага Сына, Езуса, але ў Ім Яе мацярынства распасціраецца на ўсіх людзей, якіх Ён прыйшоў збавіць. Знаходзячыся побач з новым Адамам, Езусам Хрыстом, паслухмяная Дзева з'яўляецца *новай Евай*, сапраўднай Маці жывых, якая з мацярынскай любоўю садзейнічае іх нараджэнню і выхаванню ў парадку ласкі. Марыя, Дзева і Маці, з'яўляецца вобразам Касцёла, яго самым дасканалым увасабленнем. 501-507 511

**101. У якім сэнсе ўсё жыццё Хрыста з'яўляецца *таямніцай*?**

Усё жыццё Хрыста — гэта Аб'яўленне. Тое, што бачнае ў зямным жыцці Езуса, вядзе да Яго *нябачнай таямніцы*, галоўным чынам, да *таямніцы Яго Божага паходжання*: «Хто бачыў Мяне, бачыў і Айца» (Ян 14, 9). Больш за тое, — нават, калі збаўленне цалкам здзяйсняецца праз крыж і ўваскрасенне, — усё жыццё Хрыста ёсць *таямніцай збаўлення*, бо ўсё, што зрабіў, сказаў і выцерпеў Езус, мела на мэце збаўленне грэшнага чалавека і аднаўленне ў ім паклікання Божага дзіцяці. 512-521 561-562

**102. Што рыхтавала да *таямніц* Езуса?**

Найперш, доўгая надзея, якая трывала многія стагоддзі і якую мы перажываем нанова падчас цэлебрацыі літургіі ў перыяд Адвэнту. Акрамя цмянага чакання, якое было ў сэрцах язычнікаў, Бог рыхтаваў прыйсце свайго Сына праз Стары Запавет аж да *Яна Хрысціцеля*, апошняга і найбольшага з прарокаў. 522-524

**103. Што кажа Евангелле адносна *таямніц* нараджэння і дзяцінства Езуса?**

*У Нараджэнні Пана* хвала нябёсаў выяўляецца ў слабасці дзіцяці; *абразанне* Езуса — гэта знак Яго прыналежнасці да габрэйскага народу і праобраз нашага хросту; *эпіфанія* — гэта аб'яўленне Караля і Месіі Ізраэля ўсім народам; падчас *ахвяра-* 525-530 563-564

*вання ў святыні* Сімяон і Ганна ўвасабляюць чаканне ўсяго Ізраэля, які выходзіць на *спатканне* са сваім Збаўцам; *уцёкі ў Егіпет* і забойства немаўлят прадказваюць, што ўсё жыццё Хрыста будзе пад знакам праследу; Яго *вяртанне з Егіпта* нагадвае пра Зыход і прадстаўляе Езуса як новага Майсея: Ён ёсць сапраўдным і канчатковым вызваленнем.

**104. Чаму навучае нас укрытае жыццё Езуса ў Назарэце?**

533-534 564 Падчас *укрытага жыцця* ў Назарэце Езус застаецца ў цішыні звычайнага жыцця. Такім чынам Ён дазваляе нам яднацца з Ім у святасці штодзённага жыцця, напоўненага малітвай, прастатой, працай і сямейнай любоўю. Падпарадкаванне Езуса Марыі і Юзафу, Яго названаму бацьку, з'яўляецца вобразам Яго сыноўняй паслухмянасці Айцу. Марыя і Юзаф у сваёй веры прымаюць таямніцу Езуса, хоць не заўсёды яе разумеюць.

**105. Навошта Езус прымае ад Яна «хрост навяртання для адпушчэння грахоў» (Лк 3, 3)?**

535-537 565 Каб даць пачатак свайму публічнаму жыццю і апярэдзіць «хрост» сваёй смерці: Ён, «Баранак Божы, які бярэ на сябе грахі свету» (Ян 1, 29), будучы без граху, дазваляе залічыць сябе да грэшнікаў. Айцец абвяшчае Яго «Сынам умілаваным» (Мц 3, 17), і Дух сыходзіць на Яго. Хрост Езуса — гэта правобраз нашага хросту.

**106. Што адкрывае спакушэнне Езуса ў пустыні?**

538-540 566 Спакушэнне Езуса ў пустыні паўтарае спакушэнне Адама ў раі і Ізраэля ў пустыні. Сатана спакушае Езуса ў Яго паслухмянасці місіі, даручанай Яму Айцом. Хрыстус, новы Адам, вытрымлівае, і Яго перамога прадказвае перамогу Ягонай мукі, у якой выявілася найбольшая паслухмянасць Яго сыноўняй любові. Касцёл асаблівым чынам злучаецца з гэтай таямніцай у літургічным перыядзе *Вялікага посту*.

**107. Хто запрошаны да ўдзелу ў Божым Валадарстве, абвешчаным і здзейсненым Хрыстом?**

Езус запрашае ўвайсці ў Божае Валадарства ўсіх людзей. 541-546 567
Нават найбольшы грэшнік пакліканы да навяртання і да таго, каб прыняць бясконцую міласэрнасць Айца. Валадарства — ужо тут, на зямлі, — належыць тым, хто яго прымае пакорным сэрцам. Гэта ім адкрытыя Яго таямніцы.

**108. Чаму Езус аб'яўляе Божае Валадарства праз знакі і цуды?**

Езус суправаджае свае словы *знакамі* і *цудамі*, каб засвед- 547-550 567
чыць, што гэтае Валадарства прысутнічае ў Ім, Месіі. Хоць Ён і аздараўляў некаторых людзей, аднак прыйшоў не для таго, каб знішчыць усё зло на зямлі, але перш за ўсё, каб вызваліць нас з няволі граху. Выгнанне злых духаў прадвяшчае, што Яго крыжам будзе пераможаны «князь гэтага свету» (Ян 12, 31).

**109. Якой уладай Езус надзяліў сваіх Апосталаў у Валадарстве?**

Езус выбірае *Дванаццаць* — будучых сведкаў свайго ўвас- 551-553 567
красення — і робіць іх удзельнікамі сваёй місіі і ўлады, каб яны навучалі, адпускалі грахі, будавалі Касцёл і кіравалі ім. У гэтай калегіі Пётр атрымлівае «ключы ад Валадарства» (Мц 16, 19) і займае першае месца ў місіі захавання цэласнасці веры і ўмацавання сваіх братоў.

**110. Якое значэнне мае перамяненне Езуса?**

У перамяненні з'явілася перадусім Найсвяцейшая Тройца: 554-556 568
«Айцец — у голасе, Сын — у чалавеку, Дух — у ззяючым воблаку» (св. Тамаш Аквінскі). Размаўляючы аб сваім «адыходзе» з Майсеем і Іллёй, Езус паказвае, што Яго хвала праходзіць праз крыж і апярэджвае Яго ўваскрасенне і хвалебнае прыйсце, калі Ён «пераменіць нашае прыніжанае цела ў падабенства свайго праслаўленага цела» (Флп 3, 21).

*«Ты перамяніўся на гары, і Твае вучні, наколькі былі здольныя, сузіралі Тваю хвалу, Хрысце Божа, каб, калі ўбачаць Цябе ўкрыжаваным, маглі спасцігнуць Тваю дабравольную муку і абвяшчаць свету, што Ты — сапраўды ззянне Айца»* (Візантыйская літургія).

**111. Як адбыўся месіянскі ўваход у Ерузалем?**

557-560 569-570 У вызначаны час Езус вырашыў увайсці ў Ерузалем, каб там цярпець, памерці і ўваскрэснуць. Будучы Каралём і Месіяй, які паказвае надыход Валадарства, Ён уваходзіць у свой горад, едучы вярхом на асле. Яго сустракаюць дзеці, чыё прывітальнае ўсклікање паўтараецца ў эўхарыстычным *Sanctus*: «Благаслаўлёны той, хто прыходзіць у імя Пана! *Гасанна (Збаў нас)*» (Мц 21, 9). Цэлебрацыяй гэтага ўваходу ў Ерузалем літургія Касцёла распачынае Вялікі тыдзень.

### «Езус Хрыстус замучаны пры Понцкім Пілаце, укрыжаваны, памёр і быў пахаваны»

**112. Якое значэнне мае Пасхальная таямніца Езуса?**

571-573 Пасхальная таямніца Езуса, якая ахоплівае Яго муку, смерць, уваскрасенне і праслаўленне, знаходзіцца ў цэнтры хрысціянскай веры, бо збаўчы намер Бога здзейсніўся раз і назаўсёды праз збаўчую смерць Яго Сына, Езуса Хрыста.

**113. За што быў асуджаны Езус?**

574-576 Некаторыя старэйшыны Ізраэля абвінавацілі Езуса ў дзеяннях супраць Закону, супраць ерузалемскай святыні і асабліва супраць веры ў адзінага Бога. За гэта Яго перадалі Пілату, каб той асудзіў Яго на смерць.

**114. Як Езус ставіўся да Закону Ізраэля?**

577-582 592 Езус не скасоўвае Закон, дадзены Богам праз Майсея на Сінаі, але выконвае яго, даючы яму канчатковае тлумачэнне. Ён — Божы Заканадаўца, які цалкам здзяйсняе гэты Закон. Ак-

рамя таго, Ён, Слуга верны, прыносіць сваёй збаўчай смерцю ахвяру, здольную выбавіць усіх «ад злачынстваў, учыненых у першым Запавеце» (Гбр 9, 15).

### 115. Якім было стаўленне Езуса да ерузалемскай святыні?

Езус быў абвінавачаны ў варожых адносінах да святыні. Але 583-586
Ён ушаноўваў яе як «жыллё свайго Айца» (Ян 2, 16) і надаваў 593
ёй важную ролю ў сваім вучэнні. Аднак прадказваў таксама яе разбурэнне, звязваючы гэта са сваёй смерцю, і прадстаўляў самога сябе як канчатковае жыллё Бога сярод людзей.

### 116. Ці супярэчыў Езус веры Ізраэля ў адзінага Бога і Збаўцу?

Езус ніколі не супярэчыў веры ў адзінага Бога, нават тады, 587-591
калі здзяйсняў выключна Божую справу, якой выконваліся 594
месіянскія абяцанні і пацвярджалася Яго роўнасць Богу: прабачэнне грахоў. Заклік Езуса верыць у Яго і навярнуцца, дазваляе зразумець трагічнае неразуменне Сінэдрыёна, які палічыў, што Езус варты смерці як блюзнерца.

### 117. Хто нясе адказнасць за смерць Езуса?

У муках і смерці Езуса не могуць быць абвінавачаны ўсе без 595-598
выключэння тагачасныя габрэі, а таксама іншыя габрэі, якія жылі пасля. Кожны грэшнік, гэта значыць кожны чалавек, з'яўляецца сапраўднай прычынай цярпенняў Збаўцы. Таму больш вінаватыя тыя — асабліва, калі яны хрысціяне, — хто часцей за ўсё ўпадае ў грэх або атрымлівае асалоду ад сваіх заганаў.

### 118. Чаму смерць Хрыста з'яўляецца часткай Божага плану збаўлення?

Каб паяднаць з сабою ўсіх людзей, што падлягаюць смерці 599-605
з прычыны граху, Бог праявіў поўную любові ініцыятыву, па- 619
сылаючы свайго Сына, каб Ён аддаў сябе на смерць дзеля грэшнікаў. Смерць Езуса, прадказаная ў Старым Запавеце, галоўным чынам як ахвяра церпячага Слугі, здзейснілася «паводле Пісання».

### 119. Якім чынам Хрыстус ахвяраваў сябе самога Айцу?

606-609 Усё жыццё Хрыста — гэта дабравольнае ахвяраванне сябе
620 Айцу для выканання Яго збаўчага намеру. Хрыстус аддае «жыццё сваё для адкуплення многіх» (Мк 10, 45), каб такім чынам прымірыць з Богам усё чалавецтва. Яго мука і смерць паказваюць, якім чынам Яго чалавечая натура стала свабоднай і дасканалай прыладай Божай любові, што прагне збаўлення ўсіх людзей.

### 120. Якім чынам падчас Апошняй Вячэры выяўляецца ахвяраванне Езуса?

610-611 Падчас Апошняй Вячэры з Апосталамі, напярэдадні мукі,
621 Езус прадвяшчае, гэта значыць загадзя абʼяўляе і здзяйсняе дабравольнае ахвяраванне сябе самога: «Гэта ёсць Цела Маё, якое за вас *будзе выдана*» (Лк 22, 19), «гэта Кроў Мая, якая *будзе праліта...*» (Мц 26, 28). Так Ён устанаўлівае Эўхарыстыю як «успамін» (1 Кар 11, 25) сваёй ахвяры, а сваіх Апосталаў — як святароў новага Запавету.

### 121. Што адбываецца падчас агоніі ў Гетсіманскім садзе?

612 Нягледзячы на страх, які выклікае смерць у цалкам святой чалавечай натуры таго, хто зʼяўляецца «Валадаром жыцця» (Дз 3, 15), чалавечая воля Божага Сына яднаецца з воляй Айца: каб нас збавіць, Езус згаджаецца несці ў сваім целе нашыя грахі, стаўшы «паслухмяным ажно да смерці» (Флп 2, 8).

### 122. Якія вынікі ахвяры Хрыста на крыжы?

613-617 Езус дабравольна аддаў сваё жыццё ў адкупленчай ахвя-
622-623 ры, гэта значыць адкупіў нашыя правіны праз цалкавітую паслухмянасць сваёй любові ажно да смерці. Гэтая любоў «дарэшты» (Ян 13, 1) Сына Божага яднае з Айцом усё чалавецтва. Пасхальная ахвяра Хрыста здзяйсняе адкупленне людзей адзіным, дасканалым і канчатковым чынам і аднаўляе іх лучнасць з Богам.

**123. Чаму Езус заклікае сваіх вучняў узяць крыж?**

Заклікаючы сваіх вучняў, каб яны ўзялі свой крыж і наследавалі Яго, Езус хоча далучыць да сваёй адкупленчай ахвяры менавіта тых, хто першы скарыстаў з яе. 618

**124. У якім стане было цела Хрыста, калі знаходзілася ў магіле?**

Хрыстус сапраўды памёр і сапраўды быў пахаваны. Але ласка Божая захавала Яго цела ад тлення. 624-630

## «Езус Хрыстус зышоў да адхлані, на трэці дзень уваскрос з памерлых»

**125. Што такое «адхлань», у якую зышоў Езус?**

«Адхлань» — у адрозненне ад *пекла* асуджаных — гэта стан усіх тых, праведнікаў і грэшнікаў, якія памерлі да Хрыста. З душой, з'яднанай з Яго боскай Асобай, Езус зышоў у адхлань да праведнікаў, якія чакалі свайго Адкупіцеля, каб удастоіцца ўрэшце сузірання Бога. Пасля таго як Езус праз сваю смерць перамог смерць і д'ябла, які «мае ўладу над смерцю» (Гбр 2, 14), Ён вызваліў праведнікаў, што чакалі Адкупіцеля, і адчыніў ім брамы неба. 632-637

**126. Якое месца ў нашай веры займае ўваскрасенне Езуса?**

Уваскрасенне Езуса з'яўляецца галоўнай праўдай нашай веры ў Хрыста і выяўляе, разам з крыжом, істотную частку Пасхальнай таямніцы. 631 638

**127. Якія «знакі» пацвярджаюць уваскрасенне Езуса?**

Акрамя асноўнага знаку — пустой магілы — уваскрасенне Езуса пацверджана жанчынамі, якія першымі сустрэлі Езуса і паведамілі аб гэтым Апосталам. Пазней Езус «з'явіўся Кіфе (Пятру), а потым — Дванаццаці. Пасля з'явіўся больш чым пяцістам братам адначасова» (1 Кар 15, 5–6) і яшчэ іншым. Апосталы не маглі выдумаць уваскрасення, бо гэта здавалася ім немагчымым: Езус нават дакараў іх за нявер'е. 639-644 656-657

### 128. Чаму ўваскрасенне з'яўляецца адначасова трансцэндэнтнай падзеяй?

647 656-657 Будучы падзеяй гістарычнай, пацверджанай і падмацаванай знакамі і сведчаннямі, уваскрасенне, у якім адбываецца ўваход чалавечай натуры Хрыста ў хвалу Бога, пераўзыходзіць і ўзвышаецца над гісторыяй як таямніца веры. Таму ўваскрослы Хрыстус аб'явіўся не свету, але сваім вучням, робячы іх сваімі сведкамі перад народам.

### 129. Які стан уваскрослага цела Езуса?

645-646 Уваскрасенне Езуса не з'яўляецца вяртаннем да зямнога жыцця. Яго ўваскрослае цела тое ж, якое было ўкрыжавана, і мае знакі Ягонай мукі, але адначасова яно ўдзельнічае ў Божым жыцці ў стане хвалебнага цела. З гэтай прычыны ўваскрослы Езус меў абсалютную свабоду з'яўляцца сваім вучням так, як захоча, і там, дзе захоча, і ў розных постацях.

### 130. Якім чынам уваскрасенне з'яўляецца справай Найсвяцейшай Тройцы?

648-650 Уваскрасенне Хрыста — гэта трансцэндэнтная справа Бога. Тры Асобы дзейнічаюць разам, паводле таго, што ім уласціва: Айцец праяўляе сваю магутнасць; Сын зноў прымае жыццё, якое дабравольна ахвяраваў (пар. Ян 10, 17), злучаючы зноў сваю душу са сваім целам, якое Дух Святы ажыўляе і праслаўляе.

### 131. У чым сэнс і збаўчае значэнне ўваскрасення?

651-655 658 Уваскрасенне з'яўляецца вяршыняй уцелаўлення. Яно пацвярджае боскасць Хрыста і ўсё тое, што Ён зрабіў і чаму навучаў, а таксама спаўняе ўсе Божыя абяцанні, дадзеныя нам. Больш за тое, Уваскрослы, пераможца граху і смерці, з'яўляецца прычынай нашага апраўдання і нашага ўваскрашэння: з гэтага часу дае нам ласку ўсынаўлення, якая з'яўляецца сапраўдным удзелам у жыцці Адзінароднага Сына; пазней, напрыканцы часоў, Ён уваскрасіць нашае цела.

## «Езус узышоў на неба, сядзіць праваруч Бога Айца ўсемагутнага»

**132. Што прадстаўляе ўнебаўшэсце?**

Хрыстус, праз сорак дзён пасля таго як аб’явіўся Апосталам у чалавечым абліччы, якое ўкрывала хвалу Уваскрослага, узышоў на неба і сядзіць праваруч Айца. Ён — Пан, які цяпер у сваёй чалавечнасці валадарыць у вечнай хвале Сына Божага і няспынна заступаецца за нас перад Айцом. Ён спасылае нам свайго Духа і, маючы падрыхтаванае нам месца, дае надзею, што мы некалі будзем разам з Ім. 659-667

## «Адтуль прыйдзе судзіць жывых і памерлых»

**133. Як валадарыць Пан Езус сёння?**

Пан сусвету і гісторыі, Валадар свайго Касцёла, праслаўлены Хрыстус таямнічым чынам застаецца на зямлі, дзе Яго Валадарства ўжо прысутнае ў Касцёле як крыніца і пачатак. Ён аднойчы вернецца ў хвале, але мы не ведаем гэтага часу. Таму жывём у чуванні, просячы: «Прыйдзі, Пане» (Ап 22, 20). 668-674 680

**134. Якім будзе прыйсце Пана ў хвале?**

Пасля апошняга касмічнага ўзрушэння гэтага свету, які мінае, хвалебнае прыйсце Хрыста будзе канчатковым трыумфам Бога ў Парузіі і Апошнім Судом. Так здзейсніцца Божае Валадарства. 675-677 680

**135. Як Хрыстус будзе судзіць жывых і памерлых?**

Хрыстус будзе судзіць моцай, якую Ён атрымаў як Збаўца свету, што прыйшоў збавіць людзей. Таямніцы сэрцаў будуць адкрытыя, як і паводзіны кожнага ў адносінах да Бога і да бліжняга. Кожны чалавек паводле сваіх чынаў будзе адораны жыццём або навекі пакараны. Так будзе дасягнута Хрыстовая паўната (пар. Эф 4, 13), у якой Бог будзе «ўсё ва ўсім» (1 Кар 15, 28). 678-679 681-682

## ГЛАВА ТРЭЦЯЯ

# ВЕРУ Ў ДУХА СВЯТОГА

## «Веру ў Духа Святога»

### 136. Што хоча сказаць Касцёл, калі вызнае: «Веру ў Духа Святога»?

683-686 Верыць у Духа Святога — значыць вызнаваць трэцюю Асобу Найсвяцейшай Тройцы, якая паходзіць ад Айца і Сына і якой «разам з Айцом і Сынам належыць пакланенне і хвала». Дух быў пасланы «ў сэрцы нашыя» (Гал 4, 6), каб мы атрымалі новае жыццё дзяцей Божых.

### 137. Чаму місія Сына і місія Духа Святога непадзельныя?

687-690
742-743 У непадзельнай Найсвяцейшай Тройцы Сын і Дух Святы адрозныя, але непадзельныя. Сапраўды, ад пачатку і да сканчэння вякоў, тады, калі Айцец пасылае свайго Сына, Ён пасылае таксама свайго Духа, які яднае нас з Хрыстом у веры, каб мы маглі як усыноўленыя дзеці называць Бога «Айцом» (Рым 8, 15). Дух нябачны, але мы пазнаем Яго праз Ягонае дзеянне, калі Ён абвяшчае нам Слова і калі дзейнічае ў Касцёле.

### 138. Якія імёны Духа Святога?

691-693 «Дух Святы» — гэта асабістае імя трэцяй Асобы Найсвяцейшай Тройцы. Езус называе Яго таксама: Дух Параклет (Суцяшыцель, Заступнік) і Дух Праўды. Новы Запавет называе Яго, акрамя таго, Духам Хрыста, Духам Пана, Духам Бога, Духам хвалы, Духам абяцання.

### 139. Якія сімвалы Духа Святога?

694-701 Іх шмат: *жывая вада*, якая выходзіць з прабітага сэрца Хрыста і заспакойвае прагу ахрышчаных; *намашчэнне* алеем, што з'яўляецца сакрамэнтальным знакам канфірмацыі; *полымя,* якое перамяняе ўсё, да чаго датыкаецца; *воблака*, то цёмнае, то

светлае, у якім аб'яўляецца Божая хвала; *ускладанне рук,* праз якое ўдзяляецца Дух; *голуб*, які падчас хросту спускаецца на Хрыста і застаецца на Ім.

**140. Што значыць, што Дух «прамаўляў праз прарокаў»?**

Пад словам *прарокі* разумеюцца людзі, натхнёныя Духам 687-688
Святым прамаўляць у імя Божае. Дух Святы прыводзіць да 702-706
поўнага спаўнення прароцтвы Старога Запавету ў Хрысце, та- 743
ямніцу якога адкрывае ў Новым Запавеце.

**141. Што здзяйсняе Дух Святы ў Яну Хрысціцелю?**

Дух напаўняе Яна Хрысціцеля, апошняга прарока Старога 717-720
Запавету, пасланага пад Яго дзеяннем «падрыхтаваць для Пана народ дасканалы» (Лк 1, 17) і абвясціць прыйсце Хрыста, Сына Божага: таго, над якім Ян бачыў Духа, што сыходзіў і заставаўся на Ім, і які будзе «хрысціць Духам» (Ян 1, 33).

**142. Як дзейнічае Дух Святы ў Марыі?**

Дух Святы завяршае ў Марыі чаканні і прыгатаванні Ста- 721-726
рога Запавету да прыйсця Хрыста. Незвычайным чынам Ён 744
напаўняе Яе ласкай і робіць Яе дзявоцтва пладавітым, каб даць свету ўцелаўлёнага Божага Сына. Робіць Яе Маці «ўсяго Хрыста», гэта значыць Хрыста-Галавы і Касцёла, Ягонага цела. Марыя прысутнічае сярод Дванаццаці ў дзень Пяцідзесятніцы, калі Дух Святы распачынае «апошнія часы» аб'яўленнем Касцёла.

**143. Якая сувязь існавала паміж Духам Святым і Езусам Хрыстом падчас Яго зямной місіі?**

Сын Божы ад моманту свайго ўцелаўлення памазаннем 727-730
Духа кансэкраваны на Месію. Ён аб'яўляе Духа ў сваім наву- 745-746
чанні, выконваючы дадзенае Айцом абяцанне, і спасылае Яго Касцёлу, які нараджаецца, «дыхнуўшы» на Апосталаў пасля свайго ўваскрасення.

### 144. Што адбываецца ў дзень Пяцідзесятніцы?

731-732 Праз пяцьдзесят дзён пасля свайго ўваскрасення, у дзень
738 Пяцідзесятніцы, праслаўлены Езус Хрыстус шчодра праlівае Духа і аб'яўляе Яго як боскую Асобу. Так поўнасцю аб'яўляецца Найсвяцейшая Тройца. Місія Хрыста і Духа Святога становіцца місіяй Касцёла, пасланага абвяшчаць і распаўсюджваць таямніцу трынітарнай еднасці.

> *«Мы ўбачылі сапраўднае Святло, мы атрымалі нябеснага Духа, мы знайшлі сапраўдную веру: мы пакланяемся непадзельнай Тройцы, бо Яна нас збавіла»* (Візантыйская літургія. Трапар з Нешпараў на Пяцідзесятніцу).

### 145. Што здзяйсняе Дух Святы ў Касцёле?

733-741 Дух будуе, ажыўляе і асвячае Касцёл: Дух любові нанова
747 адорвае ахрышчаных Божым падабенствам, страчаным з прычыны граху, і дазваляе ім жыць у Хрысце, удзельнічаць у жыцці Святой Тройцы. Ён пасылае іх сведчыць аб Праўдзе Хрыстовай і ўзгадняе іх узаемныя абавязкі, каб усе прыносілі «плод Духа» (Гал 5, 22).

### 146. Як дзейнічаюць Хрыстус і Дух Святы ў сэрцах веруючых?

738-741 Праз *сакрамэнты* Хрыстус усім членам свайго цела дае свайго Духа і Божую ласку, якая прыносіць плады *новага жыцця* паводле Духа. Урэшце, Дух Святы ёсць Настаўнікам *малітвы*.

## «Веру ў святы Касцёл каталіцкі»

## ***Касцёл у Божым намеры***

### 147. Што азначае тэрмін *Касцёл*?

751-752 Ён азначае народ, які Бог запрашае і збірае з усіх межаў зямлі,
777, 804 каб стварыць супольнасць тых, якія праз веру і хрост становяцца дзецьмі Божымі, членамі Хрыста і святыняй Духа Святога.

## 148. Якія іншыя назвы і вобразы Касцёла ёсць у Бібліі?

У Святым Пісанні мы знаходзім шмат вобразаў, якія выяўляюць дадатковыя аспекты таямніцы Касцёла. Стары Запавет аддае перавагу вобразам, звязаным з *Божым народам*; Новы Запавет — вобразам, звязаным з Хрыстом, як Галавою гэтага народу, які ёсць Яго целам, а таксама вобразам, узятым з жыцця пастухоў (аўчарня, паства, авечкі), з земляробства (ніва, аліўкавае дрэва, вінаграднік), будаўніцтва (жыллё, камень, святыня), сямейнага жыцця (абранніца, маці, сям'я). 753-757

## 149. Якім ёсць пачатак і завяршэнне Касцёла?

Касцёл знаходзіць свой пачатак і завяршэнне ў адвечным намеры Бога. Ён быў прыгатаваны ў Старым Запавеце выбраннем Ізраэля — знаку будучага з'яднання ўсіх народаў. Заснаваны на словах і справах Езуса Хрыста, ён быў галоўным чынам здзейснены праз Яго збаўчую смерць і ўваскрасенне. Пазней быў аб'яўлены як таямніца збаўлення праз праліццё Духа Святога ў дзень Пяцідзесятніцы. Напрыканцы часоў ён асягне сваё завяршэнне ў нябесным сходзе ўсіх збаўленых. 758-766 778

## 150. Якая місія Касцёла?

Місіяй Касцёла з'яўляецца абвяшчэнне і будаванне сярод усіх людзей Божага Валадарства, урачыста распачатага Езусам Хрыстом. Ён тут, на зямлі, з'яўляецца насеннем і пачаткам гэтага збаўчага Валадарства. 767-769

## 151. У якім сэнсе Касцёл з'яўляецца *таямніцай*?

Касцёл — гэта *таямніца*, бо ў яго бачнай рэчаіснасці прадстаўлена і ажыццяўляецца духоўная, боская рэчаіснасць, якую можна ўбачыць толькі вачыма веры. 770-773 779

## 152. Што значыць, што Касцёл — гэта паўсюдны сакрамэнт збаўлення?

Касцёл з'яўляецца знакам і прыладай паяднання і еднасці ўсяго чалавецтва з Богам і адзінства ўсяго чалавечага роду. 774-776 780

## *Касцёл: Божы народ, цела Хрыста, святыня Духа Святога*

### 153. Чаму Касцёл — гэта Божы народ?

781 Касцёл — гэта Божы народ таму, што спадабалася Богу ас-
802-804 вячаць і збаўляць людзей не паасобку, але як з’яднаны народ, злучаны адзінствам Айца, Сына і Духа Святога.

### 154. Якія характэрныя рысы Божага народу?

782 Гэта народ, членамі якога становяцца праз веру ў Хрыста і хрост; яго *пачатак* — Бог Айцец, яго *Галава* — Езус Хрыстус, яго *стан* — годнасць і свабода дзяцей Божых, яго *закон* — новая запаведзь любові, яго *місія* — быць соллю зямлі і святлом свету, яго *мэта* — Божае Валадарства, распачатае ўжо тут, на зямлі.

### 155. У якім сэнсе Божы народ удзельнічае ў трох функцыях Хрыста: Святара, Прарока, Караля?

787-786 Божы народ удзельнічае ў *святарскім* служэнні Хрыста, бо ахрышчаныя кансэкруюцца Духам Святым, каб складаць духоўныя ахвяры; удзельнічае ў Яго *прароцкім* служэнні, бо са звышпрыродным пачуццём веры трывае ў гэтай веры, паглыбляе яе і сведчыць аб ёй; удзельнічае ў Яго *каралеўскім* служэнні, наследуючы Езуса Хрыста, Валадара сусвету, які ўчыніў сябе слугой усіх, асабліва бедных і церпячых.

### 156. У якім сэнсе Касцёл ёсць целам Хрыста?

786-791 Праз Духа Святога памерлы і ўваскрослы Хрыстус глыбо-
805-806 ка яднае з сабой сваіх верных. Такім чынам веруючыя ў Хрыста, якія яднаюцца з Ім асабліва ў Эўхарыстыі, яднаюцца паміж сабой у любові, ствараючы адзінае цела — Касцёл, адзінства якога ажыццяўляецца ў разнастайнасці членаў і іх функцый.

### 157. Хто з’яўляецца галавой гэтага цела?

792-795 Хрыстус — «Галава цела, гэта значыць Касцёла» (Клс 1, 18).
807 Касцёл жыве ў Ім, з Ім, і праз Яго. Хрыстус і Касцёл ствараюць

«усяго Хрыста» (св. Аўгустын); «Галава і члены, так бы мовіць, гэта адзіная містычная асоба» (св. Тамаш Аквінскі).

**158. Чаму Касцёл называюць абранніцай Хрыста?**

Сам Пан назваў сябе «жаніхом» (Мк 2, 19), які палюбіў Кас- 796
цёл, яднаючы яго з сабою праз вечны запавет. Ён даў сябе само- 808
га Касцёлу, каб ачысціць яго сваёй крывёю, «асвяціць яго» (Эф 5, 26) і зрабіць пладавітай маці ўсіх дзяцей Божых. У той час, як тэрмін «цела» ўказвае на адзінства «Галавы» з яго членамі, тэрмін «абранніца» падкрэслівае адрозненне паміж імі ў асабовых адносінах.

**159. Чаму Касцёл называецца святыняй Духа Святога?**

Дух Святы жыве ў целе, якім ёсць Касцёл: у яго Галаве і 797-798
членах; акрамя таго, Ён у любові будуе Касцёл праз Божае сло- 809-810
ва, сакрамэнты, цноты і *харызмы*.

> *«Чым ёсць наш дух, гэта значыць наша душа, для нашых членаў, тым жа ёсць Дух Святы для членаў Хрыста, для цела Хрыста, якім ёсць Касцёл»* (св. Аўгустын).

**160. Што такое харызмы?**

Харызмы – гэта асаблівыя дары Духа Святога, дадзеныя 799-801
асобным вернікам дзеля дабра людзей, для патрэб свету і асабліва для будавання Касцёла, Настаўніцкі Інстытут якога павінен распазнаваць гэтыя харызмы.

## *Касцёл ёсць адзіны, святы, каталіцкі і апостальскі*

**161. Чаму Касцёл *адзіны*?**

Касцёл адзіны, бо яго крыніца і ўзор – еднасць адзінага Бога 813-815
ў трох Асобах; бо яго заснавальнік і Галава – Езус Хрыстус, які 866
аднаўляе адзінства ўсіх народаў у адным целе; бо яго душа – Дух Святы, які яднае ўсіх вернікаў у супольнасці з Хрыстом.

Касцёл вызнае адну веру, мае адно сакрамэнтальнае жыццё, адну апостальскую сукцэсію, адну агульную надзею і тую самую любоў.

**162. Дзе існуе адзіны Хрыстовы Касцёл?**

816 870 Адзіны Хрыстовы Касцёл, заснаваны і арганізаваны ў свеце як супольнасць, трывае (*subsistit in*) ў каталіцкім Касцёле, якім кіруе наступнік св. Пятра і біскупы ў еднасці з ім. Толькі праз Касцёл можна атрымаць паўнату сродкаў збаўлення, бо Пан даручыў усе даброты Новага Запавету адзінай Калегіі Апосталаў, галавой якой з'яўляецца св. Пётр.

**163. Як ставіцца да хрысціянаў некатолікаў?**

817-819 У Касцёлах і касцёльных супольнасцях, якія адышлі ад поўнай еднасці з каталіцкім Касцёлам, існуюць многія элементы асвячэння і праўды. Усе гэтыя даброты паходзяць ад Хрыста і вядуць да каталіцкага адзінства. Члены гэтых Касцёлаў і супольнасцяў далучаныя да Хрыста праз хрост: мы лічым іх братамі.

**164. Як можна прычыніцца да будавання адзінства хрысціянаў?**

820-822 866 Жаданне аднавіць адзінства ўсіх хрысціянаў ёсць дарам Хрыста і заклікам Духа Святога. Гэта датычыць усяго Касцёла і ажыццяўляецца праз навяртанне сэрца, малітву, узаемнае братэрскае пазнанне, тэалагічны дыялог.

**165. У якім сэнсе Касцёл *святы?***

823-829 867 Касцёл святы, бо Найсвяцейшы Бог з'яўляецца яго заснавальнікам; Хрыстус аддаў сябе самога за яго, каб асвяціць яго і зрабіць тым, хто асвячае; Дух Святы ажыўляе яго любоўю. У Касцёле ёсць паўната сродкаў збаўлення. Святасць з'яўляецца пакліканнем кожнага яго члена і мэтаю кожнай яго дзейнасці. Да Касцёла належыць Дзева Марыя і незлічоная колькасць святых, якія з'яўляюцца для яго прыкладам і заступнікамі. Святасць Касцёла — крыніца асвячэння яго дзяцей, якія тут, на

зямлі, прызнаюць сябе грэшнікамі і якія заўсёды маюць патрэбу ў навяртанні і ачышчэнні.

### 166. Чаму Касцёл называюць *каталіцкім*?

Касцёл называецца *каталіцкім*, гэта значыць *паўсюдным*, бо ў ім прысутнічае Хрыстус: «Там, дзе ёсць Езус Хрыстус, там ёсць каталіцкі Касцёл» (св. Ігнацый з Антыёхіі). Касцёл абвяшчае сукупнасць і цэласнасць веры; нясе ў сабе і кіруе паўнатой сродкаў збаўлення; ён пасланы да ўсіх народаў, усіх часоў і розных культур. 830-831 868

### 167. Ці з'яўляецца каталіцкім *мясцовы* Касцёл?

Каталіцкім з'яўляецца ўсялякі *мясцовы* (г.зн. *дыяцэзія* і *епархія*) Касцёл, які стварае супольнасць хрысціянаў, што прабываюць у еднасці веры і сакрамэнтаў са сваім біскупам, пасвячаным у апостальскай сукцэсіі, і з Рымскім Касцёлам, які «кіруе ў любові» (св. Ігнацый з Антыёхіі). 832-835

### 168. Хто належыць да каталіцкага Касцёла?

Усе людзі розным чынам належаць або прызначаныя да каталіцкага адзінства Божага народу. Цалкам далучанымі да каталіцкага Касцёла з'яўляюцца тыя, хто, маючы Духа Хрыста, злучаны з ім повязямі вызнання веры, сакрамэнтаў, касцёльнага кіраўніцтва і еднасці. Ахрышчаныя, якія ва ўсёй паўнаце не ўдзельнічаюць у гэтым каталіцкім адзінстве, таксама знаходзяцца ў еднасці, хоць і недасканалай, з каталіцкім Касцёлам. 836-838

### 169. Як каталіцкі Касцёл ставіцца да габрэйскага народу?

Каталіцкі Касцёл прызнае сваю сувязь з габрэйскім народам, бо гэты народ Бог выбраў першым сярод усіх, каб ён прыняў Яго слова. Гэта габрэйскаму народу належаць усынаўленне, і хвала, і запаветы, і ўстанаўленне законаў, і Божае служэнне, і абяцанні. Да яго належаць патрыярхі і з яго, паводле цела, — Хрыстус (пар. Рым 9, 4.5). У адрозненне ад іншых нехрысціянскіх рэлігій габрэйская вера — гэта ўжо адказ на Аб'яўленне Бога ў Старым Запавеце. 839-840

### 170. Якая сувязь існуе паміж каталіцкім Касцёлам і нехрысціянскімі рэлігіямі?

841-845 Існуе сувязь, перш за ўсё, праз паходжанне і агульную мэту ўсяго чалавецтва. Каталіцкі Касцёл прызнае, што ўсё добрае і праўдзівае, што існуе ў іншых рэлігіях, паходзіць ад Бога, ёсць промнем Ягонай праўды, можа падрыхтаваць да прыняцця Евангелля і схіліць да адзінства чалавецтва ў Хрыстовым Касцёле.

### 171. Што азначае сцвярджэнне: «Па-за Касцёлам няма збаўлення»?

846-848 Кожнае збаўленне паходзіць ад Хрыста-Галавы праз Касцёл, які ёсць Яго целам. Таму не могуць быць збаўленыя тыя, хто, ведаючы, што Касцёл заснаваны Хрыстом і неабходны для збаўлення, не ўваходзіць у яго і не трывае ў ім. У той жа час, дзякуючы Хрысту і Ягонаму Касцёлу могуць атрымаць вечнае збаўленне тыя, хто не па-сваёй віне не ведае Евангелля Хрыста і Ягонага Касцёла, але шчыра шукае Бога і пад уздзеяннем ласкі імкнецца выканаць Яго волю, пазнаную праз голас сумлення.

### 172. Чаму Касцёл павінен абвяшчаць Евангелле ўсяму свету?

849-851 Хрыстус наказаў: «Ідзіце і навучайце ўсе народы, і хрысціце іх у імя Айца і Сына, і Духа Святога» (Мц 28, 19). Гэты місійны наказ Пана мае крыніцу ў вечнай любові Бога, які паслаў свайго Сына і свайго Духа, бо «хоча, каб усе людзі былі збаўленыя і дайшлі да пазнання праўды» (1 Цім 2, 4).

### 173. У якім сэнсе Касцёл з’яўляецца місійным?

852-856 Касцёл, якім кіруе Дух Святы, на працягу гісторыі працягвае місію самога Хрыста. Таму хрысціяне павінны абвяшчаць усім Добрую Навіну, прынесеную Хрыстом, ідучы Яго шляхам, і быць гатовымі на самаахвярнасць ажно да мучаніцтва.

### 174. Чаму Касцёл *апостальскі*?

857 Касцёл апостальскі паводле свайго *паходжання*, бо пабуда-
869 ваны на «падмурку Апосталаў» (Эф 2, 20); паводле свайго *на-*

*вучання*, якое і ёсць апостальскім; паводле сваёй *структуры*, бо — ажно да паўторнага прыйсця Хрыста – яго навучаюць, асвячаюць і ім кіруюць Апосталы праз сваіх наступнікаў, біскупаў, у еднасці з наступнікам св. Пятра.

**175. У чым заключаецца місія Апосталаў?**

Слова «*апостал*» азначае «пасланнік». Езус, пасланы Айцом, паклікаў да сябе Дванаццаць сярод сваіх вучняў і ўстанавіў іх сваімі Апосталамі, выбранымі сведкамі свайго ўваскрасення і падмуркам свайго Касцёла. Езус даў ім наказ працягваць Яго місію, кажучы: «Як Айцец паслаў Мяне, так і Я пасылаю вас» (Ян 20, 21) і абяцаючы быць з імі ажно да сканчэння свету. 858-861

**176. Што такое апостальская сукцэсія?**

Апостальская сукцэсія — гэта перараказванне місіі і ўлады Апосталаў іх пераемнікам, біскупам, праз сакрамэнт пасвячэння. Дзякуючы гэтаму перараказванню Касцёл застаецца ў еднасці веры і жыцця са сваёй крыніцай і на працягу стагоддзяў выкарыстоўвае розныя формы апостальства для пашырэння Валадарства Хрыста на зямлі. 861-865

## *Вернікі:*
## *іерархія, свецкія, кансэкраванае жыццё*

**177. Хто такія вернікі?**

Вернікі — гэта тыя, хто, далучыўшыся да Хрыста праз хрост, належыць да Божага народу. Стаўшы паводле асабістага стану ўдзельнікамі святарскай, прароцкай і каралеўскай функцый Хрыста, яны пакліканыя ажыццяўляць місію, якую Бог дaручыў Касцёлу. Паміж імі існуе сапраўдная роўнасць у іх годнасці дзяцей Божых. 871-872

**178. З каго складаецца Божы народ?**

У Касцёле як Божай установе ёсць *святыя распарадчыкі*, 873
якія атрымалі сакрамэнт пасвячэння і ствараюць касцёльную 934
іерархію. Астатнія называюцца *свецкімі*. Ёсць вернікі, што на-

лежаць да першай і другой катэгорыі, якія асаблівым чынам *прысвячаюць* сябе Богу праз абяцанне евангельскіх парадаў: чыстасці ў цэлібаце, убоства і паслухмянасці.

**179. Навошта Хрыстус устанавіў касцёльную іерархію?**

874-876 935 Хрыстус устанавіў касцёльную іерархію для пастырства над Божым народам ад Яго імя і даў ёй для гэтага ўладу. Касцёльная іерархія складаецца са святых распарадчыкаў: біскупаў, прэзбітэраў і дыяканаў. Дзякуючы сакрамэнту пасвячэння біскупы і прэзбітэры здзяйсняюць свае абавязкі ад імя і ў асобе Хрыста-Галавы; дыяканы служаць Божаму народу ў *дыяконіі* (служэнні) слова, літургіі і любові.

**180. У чым выяўляецца калегіяльны характар эклезіяльнага служэння?**

877 Па прыкладзе дванаццаці Апосталаў, разам выбраных і пасланых Хрыстом, адзінства членаў касцёльнай іерархіі служыць еднасці ўсіх вернікаў. Кожны біскуп выконвае сваё служэнне як член Калегіі Біскупаў у еднасці з Папам, клапоцячыся разам з ім аб паўсюдным Касцёле. Святары выконваюць сваю справу ў прэзбітэрыі мясцовага Касцёла ў еднасці са сваім біскупам і пад яго кіраўніцтвам.

**181. Чаму эклезіяльнае служэнне мае таксама асабовы характар?**

878-879 Эклезіяльнае служэнне мае таксама асабовы характар, бо з прычыны сакрамэнту пасвячэння кожны нясе адказнасць перад Хрыстом, які асабіста яго паклікаў і даручыў яму місію.

**182. У чым заключаецца місія Папы?**

881-882 936-937 Папа, Біскуп Рыма і наступнік св. Пятра, з’яўляецца трывалым і бачным пачаткам і падмуркам адзінства Касцёла. З’яўляецца вікарыем Хрыста, галавой Калегіі Біскупаў і пастырам усяго Касцёла, над якім, паводле Божага ўстанаўлення, мае поўную, найвышэйшую, непасрэдную і паўсюдную ўладу.

**183. Якое заданне Калегіі Біскупаў?**

Калегія Біскупаў, у еднасці з Папам і ніколі без яго, ажыццяўляе над Касцёлам найвышэйшую і поўную ўладу. 883-885

**184. Як біскупы здзяйсняюць сваю місію навучання?**

Біскупы ў еднасці з Папам як праўдзівыя сведкі апостальскай веры і ўлады, дадзенай ім Хрыстом, маюць абавязак верна і аўтарытэтна абвяшчаць усім Евангелле. Праз звышпрыроднае пачуццё веры Божы народ цвёрда трывае ў ёй пад кіраўніцтвам жывога Настаўніцкага Інстытута Касцёла. 888-890 939

**185. Калі ажыццяўляецца беспамылковасць Настаўніцкага Інстытута Касцёла?**

Беспамылковасць ажыццяўляецца, калі Рымскі Пантыфік як найвышэйшы Пастыр Касцёла або Калегія Біскупаў, сабраная перадусім на Сусветным Саборы, у еднасці з Папам абвяшчае дэфінітыўным актам дактрыну, якая датычыць веры або маральнасці; а таксама, калі Папа і біскупы, здзяйсняючы сваё звычайнае настаўніцтва, узгоднена падаюць дактрыну, якая мае дэфінітыўны характар. Такое навучанне кожны вернік павінен прымаць у паслухмянасці веры. 891

**186. Як біскупы выконваюць місію асвячэння?**

Біскупы асвячаюць Касцёл, размяркоўваючы ласку Хрыста праз паслугу слова і сакрамэнтаў, галоўным чынам Эўхарыстыі, а таксама сваёй малітвай, сваім прыкладам і сваёй працай. 893

**187. Як біскупы выконваюць абавязак кіравання?**

Паколькі кожны біскуп з’яўляецца членам Калегіі Біскупаў, то калегіяльна, разам з іншымі біскупамі, з’яднанымі з Папам, ён бярэ на сябе клопат пра ўсе мясцовыя Касцёлы і пра ўвесь Касцёл. Біскуп, якому даверany адзін мясцовы Касцёл, кіруе ім з аўтарытэтам святой улады, уласнай, звычайнай і непасрэднай, якая здзяйсняецца ў імя Хрыста, Добрага Пастыра, у еднасці з усім Касцёлам і пад кіраўніцтвам наступніка св. Пятра. 894-896

## 188. Якое пакліканне свецкіх вернікаў?

897-900 940 Свецкія вернікі, згодна са сваім пакліканнем, павінны шукаць Божае Валадарства, асвячаючы і кіруючы часовай рэчаіснасцю паводле Божай задумы. Такім чынам яны ажыццяўляюць заклік да святасці і апостальства, скіраваны да ўсіх ахрышчаных.

## 189. Як свецкія вернікі ўдзельнічаюць у святарскім служэнні Хрыста?

901-903 Яны ўдзельнічаюць у ім, прыносячы, галоўным чынам у Эўхарыстыі, «духоўныя ахвяры, прыемныя Богу, праз Езуса Хрыста» (1 П 2, 5): асабістае жыццё з усімі справамі, малітву і апостальскія ініцыятывы, сямейнае жыццё і штодзённую працу, цярпліва перанесеныя жыццёвыя цяжкасці, цялесны і духоўны адпачынак. Такім чынам і свецкія, прысвечаныя Хрысту і намашчаныя Духам Святым, прыносяць у дар Богу гэты свет.

## 190. Як свецкія вернікі ўдзельнічаюць у Яго прароцкім служэнні?

904-907 942 Яны ўдзельнічаюць у ім, усё больш прымаючы ў веры слова Хрыста і абвяшчаючы яго свету праз сведчанне жыццём і словам, праз евангелізацыю і катэхезу. Гэтыя евангелізацыйныя ўчынкі набываюць асаблівую дзейснасць таму, што здзяйсняюцца ў звычайных умовах гэтага свету.

## 191. Як свецкія вернікі ўдзельнічаюць у Яго каралеўскім служэнні?

908-913 943 Свецкія ўдзельнічаюць у каралеўскім служэнні Хрыста, атрымліваючы ад Яго моц перамагаць грэх у сабе і ў свеце самавыярачэннем і святасцю свайго жыцця. Яны выконваюць розныя абавязкі ў служэнні супольнасці, напаўняючы маральнымі каштоўнасцямі зямныя справы чалавека і грамадскіх устаноў.

**192. Што такое кансэкраванае жыццё?**

Гэта стан жыцця, устаноўлены Касцёлам. Гэта добраахвотны адказ на асаблівы заклік Хрыста, калі кансэкраваныя асобы цалкам прысвячаюць сябе Богу і пад натхненнем Духа Святога імкнуцца да дасканалай любові. Гэтая кансэкрацыя характарызуецца практыкаваннем евангельскіх парадаў. 914-916 944

**193. Што ўносіць кансэкраванае жыццё ў місію Касцёла?**

Кансэкраванае жыццё ўдзельнічае ў місіі Касцёла праз поўную адданасць Хрысту і братам у сведчанні надзеі Нябеснага Валадарства. 931-933 945

## *Веру ў еднасць святых*

**194. Што азначае выраз *еднасць святых*?**

Гэты выраз указвае перш за ўсё на агульны ўдзел усіх членаў Касцёла ў святых рэчах (*sancta*): у веры, у сакрамэнтах, асабліва ў Эўхарыстыі, у харызмах і іншых духоўных дарах. Падставай еднасці з'яўляецца любоў, якая «не шукае свайго» (1 Кар 13, 5), але схіляе вернікаў да таго, каб у іх «усё было агульнае» (Дз 4, 32), каб таксама іх уласныя матэрыяльныя даброты служылі бяднейшым. 946-953 960

**195. Што яшчэ азначае выраз *еднасць святых*?**

Гэты выраз азначае таксама еднасць паміж святымі асобамі (*sancti*), гэта значыць паміж тымі, хто дзякуючы ласцы з'яднаны з Хрыстом, памерлым і ўваскрослым. Адны з'яўляюцца пілігрымамі на зямлі; іншыя, хто адышоў з гэтага свету і знаходзіцца ў стане ачышчэння, падтрымліваюцца нашымі малітвамі; а іншыя, урэшце, ужо цяпер цешацца хвалой Божай і заступаюцца за нас. Усе разам яны ствараюць у Хрысце адну сям'ю, Касцёл, дзеля хвалы і праслаўлення Найсвяцейшай Тройцы. 954-959 961-962

## *Марыя – Маці Хрыста, Маці Касцёла*

### 196. У якім сэнсе благаслаўлёная Дзева Марыя з’яўляецца Маці Касцёла?

963-966 973 Благаслаўлёная Дзева Марыя з’яўляецца Маці Касцёла ў парадку ласкі, бо нарадзіла на свет Езуса, Сына Божага, Галаву цела, якім ёсць Касцёл. Езус, паміраючы на крыжы, даў Яе як маці вучню такімі словамі: «Вось Маці твая» ( Ян 19, 27).

### 197. Як Дзева Марыя дапамагае Касцёлу?

967-970 Пасля ўнебаўшэсця свайго Сына Дзева Марыя падтрымлівае сваімі малітвамі ўзнікаючы Касцёл. Нават пасля свайго ўнебаўзяцця Яна працягвае заступацца за сваіх дзяцей, з’яўляецца для ўсіх прыкладам веры і любові і мае на іх збаўчы ўплыў, які выцякае з паўнаты заслуг Хрыста. Вернікі бачаць у Ёй вобраз і прадвесце ўваскрашэння, якога яны чакаюць, і звяртаюцца да Яе як да Заступніцы, Успамогі, Выратавальніцы, Пасрэдніцы.

### 198. Які від культу належыць Святой Дзеве?

971 Гэта выключны культ, але ён істотна адрозніваецца ад культу пакланення, што належыць толькі Найсвяцейшай Тройцы. Гэта культ асаблівай пашаны, які выражаецца ў літургічных святах, прысвечаных Маці Божай, і ў такіх марыйных малітвах, як Святы Ружанец, які з’яўляецца кароткім зместам усяго Евангелля.

### 199. Якім чынам благаслаўлёная Дзева Марыя з’яўляецца эсхаталагічным вобразам Касцёла?

972 974-975 Гледзячы на Марыю, усесвятую і ўжо праслаўленую душой і целам, Касцёл сузірае ў Ёй тое, чым ён пакліканы быць тут, на зямлі, і тое, чым ён будзе ў Нябеснай Айчыне.

## «Веру ў адпушчэнне грахоў»

**200. Як адпускаюцца грахі?**

Першы і галоўны сакрамэнт прабачэння грахоў — хрост. Для грахоў, учыненых пасля хросту, Хрыстус устанавіў сакрамэнт паяднання або пакаяння, з дапамогай якога ахрышчаныя яднаюцца з Богам і Касцёлам. 976-980 984-985

**201. Чаму Касцёл мае ўладу прабачаць грахі?**

Касцёл мае місію і ўладу прабачаць грахі, бо сам Хрыстус даў яму гэтыя паўнамоцтвы: «Прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаныя, на кім пакінеце, на тым застануцца» (Ян 20, 22-23). 981-983 986-987

## «Веру ва ўваскрашэнне цела»

**202. Што азначае тэрмін *цела*, і якое яно мае значэнне?**

Тэрмін *цела* азначае чалавека ў стане слабасці і смяротнасці. «Цела — аснова збаўлення» (Тэртуліян). І сапраўды, мы верым у Бога, які стварыў цела; верым у Слова, якое сталася целам дзеля адкуплення цела; верым ва ўваскрашэнне цела — завяршэнне стварэння і акупленне цела. 990 1015

**203. Што азначае выраз «уваскрашэнне цела»?**

Канчатковым станам чалавека будзе не толькі духоўная душа, аддзеленая ад цела, але таксама нашыя смяротныя целы аднойчы зноў атрымаюць жыццё. 990

**204. Якая сувязь паміж уваскрасеннем Хрыста і нашым уваскрашэннем?**

Таксама як Хрыстус уваскрос з памерлых і жыве вечна, Ён сам уваскрасіць усіх у апошні дзень у незнішчальным целе: «Тыя, хто чыніў добрае, уваскрэснуць для жыцця, а тыя, хто рабіў зло, уваскрэснуць для асуджэння» (Ян 5, 29). 998 1002-1003

**205. Што адбываецца з нашым целам і душой падчас смерці?**

992-1004 У хвіліну смерці, калі адбываецца аддзяленне душы ад цела,
1016-1018 цела паддаецца тленню, а несмяротная душа ідзе насустрач Божаму Суду і чакае з'яднання з целам, калі падчас паўторнага прыйсця Пана яно ўваскрэсне адноўленым. Разуменне таго, *як* адбудзецца ўваскрашэнне, пераўзыходзіць магчымасці нашага ўяўлення і розуму.

**206. Што значыць памерці ў Езусе Хрысце?**

1005-1014 Гэта значыць памерці ў стане Божай ласкі, без смяротнага
1019 граху. Той, хто верыць у Хрыста, наследуючы Яго прыклад, можа перамяніць сваю смерць у акт паслухмянасці і любові да Айца. «Праўдзівае слова: калі мы разам з Ім памерлі, то з Ім і ажывём» (2 Цім 2, 11).

## «Веру ў жыццё вечнае»

**207. Што такое жыццё вечнае?**

1020 Жыццё вечнае — гэта жыццё, якое пачнецца адразу пасля
1051 смерці. Яно не будзе мець канца. Яму будзе папярэднічаць — для кожнага — падрабязны суд, які здзяйсняецца Хрыстом — Суддзёй жывых і памерлых, і які будзе пацверджаны Апошнім Судом.

**208. Што такое падрабязны суд?**

1021-1022 Гэта суд непасрэднай Божай адплаты, якую кожны чалавек
1051 адразу пасля смерці атрымлівае ў сваёй несмяротнай душы паводле сваёй веры і сваіх учынкаў. Гэтая адплата заключаецца ў тым, што душа ўваходзіць або ў нябеснае шчасце — адразу ці пасля адпаведнага ачышчэння, — або ў вечнае пакаранне ў пекле.

**209. Што маецца на ўвазе пад словам «неба»?**

1023-1026 Пад словам «неба» маецца на ўвазе стан найвышэйшага і кан-
1053 чатковага шчасця. Тыя, хто памірае ў стане Божай ласкі і не мае патрэбы ў далейшым ачышчэнні, збіраюцца вакол Езуса і Марыі,

анёлаў і святых. Яны ствараюць такім чынам нябесны Касцёл, дзе бачаць Бога «тварам у твар» (1 Кар 13, 12), жывуць у супольнасці любові з Найсвяцейшай Тройцай і заступаюцца за нас.

> *«Жыццё, у сваёй рэчаіснасці і праўдзе, ёсць Айцец, які праз Сына ў Духу Святым выліваецца, як з крыніцы, на ўсіх нас свае нябесныя дары. Па сваёй дабрыні сапраўды абяцае таксама нам, людзям, боскія даброты вечнага жыцця»* (св. Кірыл Ерузалемскі).

**210. Што такое чысцец?**

Чысцец — гэта стан тых, хто памірае ў сяброўстве з Богам, 1030-1031
але, хоць і ўпэўнены ў сваім вечным збаўленні, мае ўсё ж патрэ- 1054
бу ў ачышчэнні дзеля таго, каб увайсці ў нябеснае шчасце.

**211. Як мы можам дапамагчы ачышчэнню душ у чыстцы?**

З прычыны еднасці святых вернікі, якія яшчэ пілігрымую- 1032
юць на зямлі, могуць дапамагаць чыстцовым душам, ахвяруючы за іх малітвы ўміласціўлення, асабліва эўхарыстычную Ахвяру, а таксама міласціну, адпусты і справы пакаяння.

**212. Што такое пекла?**

Пекла — гэта вечнае пакаранне тых, хто памірае ў смярот- 1033-1035
ным граху, добравольна выбраўшы яго. Асноўная кара пекла 1056-1057
заключаецца ў вечным адлучэнні ад Бога, а чалавек толькі ў Богу мае жыццё і шчасце, дзеля гэтага ён быў створаны і да гэтага імкнецца. Хрыстус выражае гэтую рэчаіснасць словамі: «Ідзіце ад Мяне, праклятыя, у агонь вечны» (Мц 25, 41).

**213. Як спалучаецца існаванне пекла з бясконцай дабрынёй Бога?**

Бог, жадаючы, «каб усе прыйшлі да пакаяння» (2 П 3, 9), 1036-1037
стварыў аднак чалавека свабодным і адказным і шануе яго выбар. Таму сам чалавек, будучы цалкам свабодным, добравольна адлучаецца ад еднасці з Богам, калі аж да моманту сваёй смерці трывае ў смяротным граху, адкідваючы міласэрную любоў Бога.

### 214. Што такое Апошні Суд?

1038-1041 Апошні (паўсюдны) Суд будзе заключацца ў прысудзе да
1058-1059 благаслаўлёнага жыцця або да вечнага пакарання, які Пан Езус, вяртаючыся як Суддзя жывых і памерлых, вынесе для «справядлівых і несправядлівых» (Дз 24, 15), што сабраліся разам перад Ім. У выніку гэтага Апошняга Суда ўваскрослае цела будзе ўдзельнічаць у адплаце, якую душа атрымала на падрабязным судзе.

### 215. Калі адбудзецца Апошні Суд?

1040 Гэты суд адбудзецца напрыканцы свету, дзень і час якога ведае толькі Бог.

### 216. Што такое надзея новага неба і новай зямлі?

1042-1050 Пасля Апошняга Суда ўвесь сусвет, вызвалены з няволі сап-
1060 саванасці, будзе ўдзельнічаць у хвале Хрыста праз урачыстае адкрыццё «новых нябёсаў» і «новай зямлі» (2 П 3, 13). Такім чынам дасягнецца паўната Божага Валадарства, гэта значыць канчатковага ажыццяўлення збаўчага намеру Бога «аднавіць усё ў Хрысце: тое, што на нябёсах і на зямлі» (Эф 1, 10). Бог тады будзе «ўсё ва ўсім» (1 Кар 15, 28) у вечным жыцці.

## *«Амэн»*

### 217. Што азначае слова *«амэн»*, якім завяршаецца нашае вызнанне веры?

1061-1065 Габрэйскае слова *«амэн»*, якім завяршаецца таксама апошняя кніга Святога Пісання, а таксама некаторыя малітвы Новага Запавету і літургічныя малітвы Касцёла, азначае нашае ўпэўненае і поўнае «так» вызнаванай намі веры, з цалкавітым даверам таму, хто ёсць канчатковым *«Амэн»* (Ап 3, 14), — Езусу Хрысту.



На абразе прадстаўлены Езус, які набліжаецца да Апосталаў, што сабраліся вакол стала, і кожнаму з іх удзяляе святую Камунію. Гэты жывапісны абраз дэманструе вялікую эўхарыстычную пабожнасць Касцёла на працягу стагоддзяў.

«*Sine dominico non possumus*», — казаў Эмэрыт, мучанік пачатку IV ст., падчас аднаго з найбольш жорсткіх ганенняў на хрысціянаў у 304 г., у часы праўлення Дыяклетыяна. Абвінавачаны ў тым, што разам са сваёй супольнасцю ўдзельнічаў у Эўхарыстыі, ён, не тоячыся, прызнаецца: «Без Эўхарыстыі мы не можам жыць». І адна з мучаніц дадае: «Так, я пайшла на сход і святкавала Вячэру Пана з маімі братамі і сёстрамі, бо я хрысціянка» (*Atti dei martiri di Abitene*, глава 11 і 7, 16). За сваю вернасць Эўхарыстыі 49 паўночна-афрыканскіх мучанікаў былі асуджаныя на смерць. Эўхарыстычны Езус быў сапраўдным жыццём для Сатурніна і яго паплечнікаў, мучанікаў з Абітэна ў праконсульскай Афрыцы. Яны жадалі лепш памерці, чым пазбавіць сябе эўхарыстычнага спажытку, хлеба вечнага жыцця.

Св. Тамаш Аквінскі меў звычай апоўдні ўваходзіць у касцёл і там, поўны даверу, набліжаў галаву да табэрнакулюма і размаўляў з эўхарыстычным Езусам сам на сам. Вялікі сярэднявечны тэолаг вядомы таксама тым, што склаў Афіцый на ўрачыстасць Цела Пана (*Corpus Domini*), у якім выказаў усю сваю глыбокую эўхарыстычную пабожнасць.

У гімне з Ютрані (*Verbum supernum prodiens*) прадстаўлены сінтэз эўхарыстычнай каталіцкай духоўнасці:

Каб збавіць люд свой на крыжы,
Прыняў людское цела Ён [Езус].

На смерць адданы вучнем быў
У рукі ворагаў сваіх.
А перад смерцю на крыжы
Сакрамэнт свой устанавіў.

Пад відам хлеба і віна
Пакінуў Цела нам і Кроў,
Каб той, хто будзе іх прымаць,
Стаў Ім адроджаны наноў.

Паплечнікам для нас Ён стаў,
А за сталом — спажываю,
Цаной — калі жыццё аддаў,
А ў небе — ўзнагародаю.

Называючы Эўхарыстыю «вяршыняй і дасканаласцю ўсяго духоўнага жыцця», св. Тамаш Аквінскі выражае свядомасць веры Касцёла, які верыць у Эўхарыстыю як жывую прысутнасць Езуса сярод нас і як неабходны пасілак для духоўнага жыцця. Эўхарыстыя з'яўляецца залатой ніццю, якая, выходзячы з Апошняй Вячэры, звязвае ўсе вякі гісторыі Касцёла ажно да нашых часоў. Словы кансэкрацыі «Гэта ёсць Цела Маё» і «Гэта ёсць Кроў Мая», вымаўляліся заўсёды і ўсюды, нават у гулагах, у канцэнтрацыйных лагерах, у тысячах вязніц, якія існуюць і сёння. У гэтай эўхарыстычнай перспектыве Касцёл будуе сваё жыццё, сваю еднасць і сваю місію.

---

Ёс ван Васенховэ. *Эўхарыстыя* (каля 1474 г.). Урбіна, Нацыянальная галерэя Маркэ

ЧАСТКА ДРУГАЯ

# ЦЭЛЕБРАЦЫЯ ХРЫСЦІЯНСКАЙ ТАЯМНІЦЫ

РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

# САКРАМЭНТАЛЬНАЯ ЭКАНОМІЯ



Ахвяра крыжа з'яўляецца крыніцай сакрамэнтальнай эканоміі Касцёла. На мазаіцы — Марыя, сімвал Касцёла. Левай рукой Яна збірае з прабітага боку Езуса кроў і ваду, сімвалы сакрамэнтаў Касцёла:

«Падышлі да Езуса і ўбачылі, што Ён ужо мёртвы; не ламалі Яму ногі, але адзін з жаўнераў прабіў дзідай Ягоны бок, і адразу выцеклі кроў і вада» (Ян 19, 34).

Св. Аўгустын дае такі каментар:

«Хрыстус, наш Пан, які ў муках ахвяраваў за нас тое, што пры нараджэнні атрымаў ад нас, стаўшы навекі Найвышэйшым Святаром, наказаў, каб здзяйснялася ахвяра, якую вы бачыце, гэта значыць ахвяра Яго Цела і Крыві. Сапраўды, з Яго цела, прабітага дзідай, выцеклі вада і кроў, якімі Ён змыў нашыя грахі. Успамінаючы гэтую ласку і прычыняючыся да вашага збаўлення (што сам Бог здзяйсняе ў вас), з бояззю і трымценнем наблізьцеся, каб зачэрпнуць з гэтага алтара. Распазнайце ў хлебе тое самае Цела, якое вісела на крыжы, і ў келіху — тую самую Кроў, якая выцекла з Ягонага боку. Таксама старажытныя ахвяры Божага народу, ва ўсёй іх разнастайнасці, прадказваюць гэтую адзіную ахвяру, якая павінна была адбыцца. Хрыстус з'яўляецца і баранкам паводле нявіннасці сваёй чыстай душы, і адначасова ахвярным казлянём з прычыны свайго цела, падобнага да грэшнага цела. І іншыя рэчы, якія рознымі і шматлікімі спосабамі прадказваліся ў ахвярах Старога Запавету, адносяцца толькі да гэтай Ахвяры, якая была аб'яўлена ў Новым Запавеце.

Таму бярыце і ешце Цела Хрыста, цяпер, калі вы таксама сталі членамі Хрыста ў целе Хрыстовым; бярыце і піце Кроў Хрыста. Каб не раз'яднацца, ешце тое, што вас яднае; каб не лічыць адзін аднаго за нішто, піце цану вашага адкуплення. Як пераменяецца ў вас тое, што спажываеце і п'яце, так і вы перамяняецеся ў цела Хрыста, калі жывяце ў паслухмянасці і адданасці. Ён жа, набліжаючыся да сваёй мукі і святкуючы Пасху са сваімі вучнямі, узяў хлеб, благаславіў яго, кажучы: «*Гэта ёсць Цела Маё, якое за вас будзе выдана*». Таксама, благаславіўшы келіх, узяў яго, кажучы: «*Гэта ёсць Кроў Мая новага запавету, якая за многіх будзе праліта дзеля адпушчэння грахоў*». Усё гэта вы ўжо прачыталі і пачулі ў Евангеллі, але не ведалі, што гэтая Эўхарыстыя — сам Сын Божы; таму цяпер з чыстым сэрцам, незабруджаным сумленнем і з целам, абмытым чыстай вадой, *наблізьцеся да Яго — і будзеце асвячаныя, і твары вашыя не спазнаюць сораму*» (*Discorso* 228B).

---

Капліца «Redemptoris Mater». *Насценная мазаіка.* Ватыкан

**218. Што такое літургія?**

Літургія — гэта цэлебрацыя таямніцы Хрыста і, асабліва, Яго Пасхальнай таямніцы. У ёй праз святарскае служэнне Езуса Хрыста з дапамогай знакаў аб'яўляецца і здзяйсняецца асвячэнне людзей, а Містычным целам Хрыста, гэта значыць Галавой і членамі, ажыццяўляецца публічны культ, належны Богу. 1066-1070

**219. Якое месца займае літургія ў жыцці Касцёла?**

Літургія, як выключна святое дзеянне, з'яўляецца вяршыняй, да якой скіравана дзейнасць Касцёла, а таксама крыніцай, з якой выцякае яго жыццёвая моц. Праз літургію Хрыстус працягвае ў сваім Касцёле, з ім і праз яго, справу нашага адкуплення. 1071-1075

**220. Што такое сакрамэнтальная эканомія?**

Сакрамэнтальная эканомія — гэта ўдзяленне пладоў Хрыстовага адкуплення праз цэлебрацыю сакрамэнтаў Касцёла, перадусім Эўхарыстыі, «пакуль Ён [Хрыстус] не прыйдзе» (1 Кар 11, 26). 1076

## ГЛАВА ПЕРШАЯ

## ПАСХАЛЬНАЯ ТАЯМНІЦА Ў ЧАСЕ КАСЦЁЛА

### Літургія — справа Найсвяцейшай Тройцы

**221. У якім сэнсе Бог Айцец з'яўляецца крыніцай і мэтай літургіі?**

Падчас літургіі Бог Айцец напаўняе нас сваімі благаслаўленнямі ва ўцелаўлёным Сыне, памерлым і ўваскрослым дзеля нас, і ўлівае ў нашыя сэрцы Духа Святога. Адначасова Касцёл благаслаўляе Айца ў пакланенні, праслаўленні і чынах падзякі і просіць аб дары Ягонага Сына і Духа Святога. 1077-1083 1110

**222. Што здзяйсняе Хрыстус у літургіі?**

1084-1090 У літургіі Касцёла Хрыстус азначае і здзяйсняе, галоўным чынам, сваю Пасхальную таямніцу. Даючы Апосталам Духа Святога, Ён даручыў ім і іх наступнікам уладу ажыццяўляць справу збаўлення праз эўхарыстычную Ахвяру і сакрамэнты, у якіх Ён сам дзейнічае, каб удзяляць сваю ласку вернікам ва ўсе часы і ва ўсім свеце.

**223. Як у літургіі дзейнічае Дух Святы адносна Касцёла?**

1091-1109 У літургіі адбываецца найбольш цеснае ўзаемадзеянне
1112 паміж Духам Святым і Касцёлам. Дух Святы падрыхтоўвае Касцёл да сустрэчы са сваім Панам; нагадвае пра Хрыста і абʼяўляе Яго супольнасці веры; ажыццяўляе і актуалізуе таямніцу Хрыста; яднае Касцёл з жыццём і місіяй Хрыста і чыніць так, каб у Касцёле дар еднасці прыносіў плён.

## Пасхальная таямніца ў сакрамэнтах Касцёла

**224. Што такое сакрамэнты і колькі іх?**

1113-1131 Сакрамэнты — гэта бачныя і дзейсныя знакі ласкі, устаноўленыя Хрыстом і дaручаныя Касцёлу, праз якія нам удзяляецца Божае жыццё. Іх сем: хрост, канфірмацыя, Эўхарыстыя, пакаянне, намашчэнне хворых, пасвячэнне, сужэнства.

**225. Як сакрамэнты звязаныя з Хрыстом?**

1114-1116 Таямніцы жыцця Хрыста — аснова таго, што Хрыстус праз распарадчыкаў Касцёла ўдзяляе цяпер у сакрамэнтах.

*«Тое, што было бачным у нашым Збаўцы, перайшло ў Яго сакрамэнты»* (св. Леў Вялікі).

**226. Якая сувязь сакрамэнтаў з Касцёлам?**

1117-1119 Хрыстус даручыў сакрамэнты свайму Касцёлу. Яны «касцёльныя» ў падвойным сэнсе: «праз Касцёл», паколькі зʼяўляюцца дзеяннем Касцёла, які сам ёсць сакрамэнтам дзеяння Хрыста; і «для Касцёла», таму што будуюць Касцёл.

## 227. Што такое сакрамэнтальны *характар*?

Гэта духоўная *пячаць*, якую пакідаюць сакрамэнты хросту, канфірмацыі і пасвячэння, з'яўляецца абяцаннем і гарантыяй Божай апекі. Праз гэтую пячаць хрысціянін прыпадабняецца да Хрыста, розным чынам удзельнічае ў Яго святарстве і ўваходзіць у супольнасць Касцёла паводле свайго стану і выконваемых функцый. Такім чынам хрысціянін пакліканы да Божага культу і да служэння Касцёлу. Паколькі гэтая пячаць (характар) незнішчальная, то сакрамэнты, якія яе пакідаюць, удзяляюцца толькі адзін раз у жыцці. 1121

## 228. Якая сувязь сакрамэнтаў з верай?

Сакрамэнты не толькі прадугледжваюць веру, але насычаюць, умацоўваюць і выяўляюць яе словамі і абрадавымі элементамі. Цэлебруючы сакрамэнты, Касцёл вызнае веру, атрыманую ад Апосталаў. Гэта вынікае са старажытнага выказвання: «*Lex orandi, lex credendi*», гэта значыць, Касцёл верыць так, як моліцца. 1122-1126 1133

## 229. Чаму сакрамэнты з'яўляюцца плённымі?

Сакрамэнты з'яўляюцца плённымі *ex opere operato* («праз сам факт здзяйснення сакрамэнтальнага дзеяння»), бо гэта Хрыстус дзейнічае ў іх і ўдзяляе ласку, якую яны перадаюць незалежна ад асабістай святасці распарадчыка. Але плён сакрамэнтаў залежыць таксама ад падрыхтаванасці таго, хто іх прымае. 1127-1128 1131

## 230. Чаму сакрамэнты неабходныя для збаўлення?

Для веруючых у Хрыста сакрамэнты неабходныя для збаўлення — нават, калі не ўсе яны ўдзяляюцца паасобным вернікам, — бо даюць сакрамэнтальныя ласкі, прабачэнне грахоў, Божае ўсынаўленне, прыпадабненне да Хрыста Пана і прыналежнасць да Касцёла. Дух Святы аздараўляе і перамяняе тых, хто іх прымае. 1129

### 231. Што такое сакрамэнтальная ласка?

1129, 1131 1134, 2003 Сакрамэнтальная ласка — гэта ласка Духа Святога, дадзеная Хрыстом і ўласцівая кожнаму сакрамэнту. Гэтая ласка дапамагае верніку на яго шляху да святасці, а праз гэта дапамагае таксама Касцёлу ўзрастаць у любові і сведчанні.

### 232. Якая сувязь існуе паміж сакрамэнтамі і вечным жыццём?

1130 У сакрамэнтах Касцёл атрымлівае задатак вечнага жыцця, «чакаючы шчаслівай надзеі і аб'яўлення хвалы вялікага Бога і Збаўцы нашага, Езуса Хрыста» (Ціт 2, 13).

## ГЛАВА ДРУГАЯ

## САКРАМЭНТАЛЬНАЯ ЦЭЛЕБРАЦЫЯ ПАСХАЛЬНАЙ ТАЯМНІЦЫ

### Цэлебрацыя літургіі Касцёла

### *Хто цэлебруе?*

### 233. Хто дзейнічае падчас літургіі?

1135-1137 1187 У літургіі дзейнічае *«ўвесь Хрыстус» («Christus totus»)*, Галава і цела. Як Найвышэйшы Святар Ён цэлебруе яе разам са сваім целам, якім ёсць нябесны і зямны Касцёл.

### 234. Хто цэлебруе нябесную літургію?

1138-1139 Нябесную літургію цэлебруюць анёлы, святыя Старога і Новага Запавету, а менавіта Маці Божая, Апосталы, мучанікі і «вялікі натоўп, якога ніхто» не можа падлічыць, «з усіх народаў, плямёнаў, родаў і моваў» (Ап 7, 9). Калі мы ў сакрамэнтах цэлебруем таямніцу збаўлення, то ўдзельнічаем у гэтай вечнай літургіі.

**235. Як Касцёл на зямлі цэлебруе літургію?**

Касцёл як народ святарскі цэлебруе на зямлі літургію, у якой кожны ўдзельнічае згодна са сваёй функцыяй, у еднасці Духа Святога: ахрышчаныя складаюць духоўную ахвяру; пасвячаныя распарадчыкі здзяйсняюць цэлебрацыю паводле атрыманага пасвячэння дзеля служэння ўсім членам Касцёла; біскупы і прэзбітэры дзейнічаюць у асобе Хрыста-Галавы. 1140-1144 1188

## *Як цэлебраваць?*

**236. Як цэлебруецца літургія?**

Цэлебрацыя літургіі складаецца са знакаў і сімвалаў, значэнне якіх замацавана ў справе стварэння і ў чалавечай культуры, удакладняецца ў падзеях Старога Запавету і цалкам адкрываецца ў асобе і справе Хрыста. 1145

**237. Адкуль паходзяць сакрамэнтальныя знакі?**

Некаторыя паходзяць ад створаных рэчаў (святло, вада, агонь, хлеб, віно, алей); іншыя ўзятыя з грамадскага жыцця (абмыванне, памазанне, ламанне хлеба); яшчэ іншыя — з гісторыі збаўлення Старога Запавету (абрады Пасхі, ахвярапрынашэнні, ускладанне рук, кансэкрацыі). Гэтыя атрыманыя ад Хрыста знакі, некаторыя з якіх нарматыўныя і нязменныя, становяцца носьбітамі дзеянняў збаўлення і асвячэння. 1146-1152 1189

**238. Якая існуе сувязь паміж дзеяннямі і словамі падчас сакрамэнтальных цэлебрацый?**

У сакрамэнтальных цэлебрацыях дзеянні і словы цесна звязаныя. На самай справе, нават калі сімвалічныя дзеянні ўжо самі па сабе прамаўляюць, усё ж неабходна, каб словы абраду суправаджалі і ажыўлялі гэтыя дзеянні. Літургічныя словы і дзеянні непадзельныя як знакі і навучанне ў здзяйсненні таго, што яны азначаюць. 1153-1155 1190

**239. Паводле якіх крытэрыяў спеў і музыка выконваюць сваю функцыю ў літургічнай цэлебрацыі?**

1156-1158 1191 Паколькі спеў і музыка цесна звязаныя з літургічнымі дзеяннямі, яны павінны прытрымлівацца наступных крытэрыяў: адпаведнасць каталіцкай дактрыне тэкстаў, браць якія трэба пераважна са Святога Пісання і літургічных крыніц; выразная прыгажосць малітвы; якасць музыкі; удзел супольнасці; выкарыстанне культурнага багацця Божага народу; захаванне сакральнага і ўрачыстага характару цэлебрацыі. «*Хто спявае — моліцца двойчы*» (св. Аўгустын).

**240. Навошта патрэбны святыя абразы?**

1159-1161 1192 Выява Хрыста — гэта найлепшы літургічны абраз. Іншыя, якія прадстаўляюць Божую Маці і святых, сімвалізуюць Хрыста, праслаўленага імі. Яны абвяшчаюць тое самае евангельскае пасланне, якое Святое Пісанне перадае праз слова, і дапамагаюць абудзіць і ўмацаваць веру вернікаў.

## *Калі цэлебраваць?*

**241. Што з'яўляецца цэнтрам літургічнага часу?**

1163-1167 1193 Цэнтрам літургічнага часу з'яўляецца нядзеля — падмурак і ядро ўсяго літургічнага года, вяршыняй якога ёсць штогадовы Вялікдзень, свята святаў.

**242. Якая функцыя літургічнага года?**

1168-1173 1194-1195 На працягу літургічнага года Касцёл цэлебруе ўсю таямніцу Хрыста, ад уцелаўлення да Яго хвалебнага прыйсця. Ва ўстаноўленыя дні Касцёл з асаблівай любоўю ўшаноўвае благаслаўлёную Марыю, Божую Маці, і ўспамінае святых, якія жылі дзеля Хрыста, з Ім пакутавалі і з Ім праслаўленыя.

### 243. Што такое Літургія гадзінаў?

Літургія гадзінаў — публічная і супольная малітва Касцё- 1174-1178
ла — гэта малітва Хрыста і Яго цела, Касцёла. Праз яе таямніца 1196
Хрыста, якую мы цэлебруем у Эўхарыстыі, асвячае і пераменяе час кожнага дня. Літургія гадзінаў складаецца ў асноўным з псальмаў і іншых біблійных тэкстаў, а таксама з чытання твораў Айцоў Касцёла і настаўнікаў духоўнага жыцця.

## *Дзе целебраваць?*

### 244. Ці патрэбны Касцёлу месцы для цэлебрацыі літургіі?

Культ у «духу і праўдзе» (Ян 4, 24) Новага Запавету не звя- 1179-1181
заны з нейкім выключным месцам, бо Хрыстус з'яўляецца сап- 1197-1198
раўднай святыняй Бога, дзякуючы гэтаму хрысціяне і ўвесь Касцёл пад дзеяннем Духа Святога становяцца святынямі жывога Бога. Тым не менш, Божаму народу, у яго зямным існаванні, патрэбныя месцы, у якіх супольнасць можа збірацца для цэлебрацыі літургіі.

### 245. Што такое святыня?

Гэта дом Бога, сімвал Касцёла, які жыве ў гэтым месцы, а 1181
таксама сімвал нябеснага жылля. Гэта месца малітвы, у якім 1198-1199
Касцёл цэлебруе перадусім Эўхарыстыю і пакланяецца Хрысту, які рэальна прысутнічае ў табэрнакулюме.

### 246. Якія месцы ў святыні з'яўляюцца прывілеяванымі?

Гэта алтар, табэрнакулюм, месца для захоўвання святога 1182-1186
хрызма і іншых святых алеяў, пасад (катэдра) біскупа ці прэзбітэра, амбона, хрысцільня, канфесіянал.

## Літургічная разнастайнасць і адзінства таямніцы

**247. Чаму адзіная таямніца Хрыста цэлебруецца Касцёлам паводле розных літургічных традыцый?**

1200-1204 1207-1209 Бязмежнае багацце таямніцы Хрыста не можа быць вычарпана ніводнай літургічнай традыцыяй. Вось чаму з самага пачатку гэтае багацце знаходзіла адлюстраванне ў розных народаў і ў розных культурах у формах, якія адзначаюцца дзівоснай разнастайнасцю і ўзаемадапаўняльнасцю.

**248. Які крытэрый запэўнівае адзінства ў разнастайнасці?**

1209 Гэта вернасць Апостальскай Традыцыі, а менавіта, еднасць веры і сакрамэнтаў, атрыманых ад Апосталаў, якая адзначаецца і гарантуецца апостальскай сукцэсіяй. Касцёл з'яўляецца каталіцкім, таму можа спалучаць у сваім адзінстве сапраўдныя культурныя багацці.

**249. Ці ўсё ў літургіі з'яўляецца нязменным?**

1205-1206 У літургіі, асабліва што датычыць сакрамэнтаў, існуюць нязменныя — з увагі на Божае ўстанаўленне — элементы, якія Касцёл верна захоўвае. Але існуюць яшчэ і зменныя элементы, якія ён мае ўладу, а часам нават абавязаны, дастасоўваць да культур розных народаў.

РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

# СЕМ САКРАМЭНТАЎ КАСЦЁЛА



**Сем сакрамэнтаў Касцёла**

Хрост
Канфірмацыя
Эўхарыстыя
Пакаянне
Намашчэнне хворых
Пасвячэнне
Сужэнства

**Septem Ecclesiae Sacramenta**

Baptísmum
Confirmátio
Eucharístia
Paeniténtia
Únctio infirmórum
Ordo
Matrimónium

Сакрамэнты Касцёла з'яўляюцца плёнам збаўчай ахвяры Езуса на крыжы. На трыпціху прадстаўлены касцёл, у якім адбываецца цэлебрацыя сямі сакрамэнтаў. У цэнтры ўзносіцца, дамінуючы над усім, крыж. Каля яго падножжа — знясіленая болем Марыя, якую падтрымлівае св. Ян і пабожныя жанчыны. У глыбіні цэлебрант уздымае кансэкраваную Гостыю, паказваючы гэтым, што ахвяра крыжа нанова актуалізуецца ў постаці хлеба і віна падчас эўхарыстычнай цэлебрацыі.



На палатне злева, на якім паказана бакавая капліца, прадстаўлены сакрамэнты хросту, канфірмацыі, якую ўдзяляе біскуп, і пакаяння. На палатне справа прадстаўлены сакрамэнт пасвячэння, які таксама ўдзяляе біскуп, сакрамэнты сужэнства і намашчэння хворых.

———

Рагір ван дэр Вэйдэн. *Трыпціх сямі сакрамэнтаў* (каля 1460 г.). Антверпен, Каралеўскі музей выяўленчага мастацтва



**250. Які існуе падзел сакрамэнтаў Касцёла?**

Яны дзеляцца на сакрамэнты хрысціянскага ўтаямнічання (хрост, канфірмацыя і Эўхарыстыя); сакрамэнты аздараўлення (пакаянне і намашчэнне хворых); сакрамэнты служэння супольнасці і місіі (пасвячэнне і сужэнства). Яны ахопліваюць важныя моманты хрысціянскага жыцця. Усе сакрамэнты скіраваныя да Эўхарыстыі «як да сваёй канчатковай мэты» (св. Тамаш Аквінскі). 1210-1211

### ГЛАВА ПЕРШАЯ

## САКРАМЭНТЫ ХРЫСЦІЯНСКАГА ЎТАЯМНІЧАННЯ

**251. Як адбываецца хрысціянскае ўтаямнічанне?**

Яно адбываецца праз сакрамэнты, якія закладваюць *падмуркі* хрысціянскага жыцця: вернікі нанова нараджаюцца праз хрост, умацоўваюцца канфірмацыяй і жывяцца Эўхарыстыяй. 1212 1275

### Сакрамэнт хросту

**252. Якія назвы мае першы сакрамэнт ўтаямнічання?**

Мае перш за ўсё назву *хрост* з прычыны галоўнага абраду цэлебрацыі: «хрысціць» азначае «акунаць у ваду». Ахрышчаны акунаецца ў смерць Хрыста і адраджаецца з Ім як «новае стварэнне» (2 Кар 5, 17). Гэты сакрамэнт называецца таксама купеллю «адраджэння і аднаўлення Духам Святым» (Ціт 3, 5) і «асвячэннем», бо ахрышчаны становіцца «дзіцём святла» (Эф 5, 8). 1213-1216 1276-1277

**253. Як прадказваўся хрост у Старым Запавеце?**

У Старым Запавеце сустракаюцца розныя праўобразы хросту: *вада* — крыніца жыцця і смерці; *каўчэг Ноя,* які ратуе праз 1217-1222

ваду; *пераход праз Чырвонае мора,* які вызваляе Ізраэль з егіпецкай няволі; *пераправа праз Ярдан,* якая ўводзіць Ізраэль у абяцаную зямлю, вобраз вечнага жыцця.

**254. Хто здзейсніў гэтыя правобразы?**

1223-1224 Езус Хрыстус. Напачатку сваёй публічнай дзейнасці Ён быў ахрышчаны Янам Хрысціцелем у Ярдане; на крыжы з Яго прабітага боку выцеклі кроў і вада, якія з’яўляюцца знакамі хросту і Эўхарыстыі; пасля свайго ўваскрасення Езус даручае Апосталам місію: «Ідзіце і навучайце ўсе народы, і хрысціце іх у імя Айца і Сына, і Духа Святога» (Мц 28, 19).

**255. З якога часу і каму Касцёл удзяляе хрост?**

1226-1228 З дня Пяцідзесятніцы Касцёл удзяляе хрост тым, хто верыць у Езуса Хрыста.

**256. Які галоўны абрад хросту?**

1229-1245 Галоўны абрад гэтага сакрамэнту — акунанне ў ваду канды-
1278 дата або паліванне яго галавы вадой з адначасовым заклíканнем імя Айца і Сына, і Духа Святога.

**257. Хто можа атрымаць хрост?**

1246-1252 Хрост можа атрымаць кожны яшчэ не ахрышчаны чалавек.

**258. Чаму Касцёл хрысціць дзяцей?**

1250 Нараджаючыся з першародным грахом, дзеці маюць патрэбу ў вызваленні з моцы злога духа і перанясення ў валадарства свабоды дзяцей Божых.

**259. Што патрабуецца ад ахрышчанага?**

1253-1255 Ад кожнага, хто прымае хрост, патрабуецца вызнанне веры, выказанае асабіста, калі гэта дарослы, або бацькамі і Касцёлам, калі гэта дзіця. Таксама хросны бацька або хросная маці і ўся супольнасць Касцёла часткова нясуць адказнасць за падрыхтоўку да хросту (катэхумэнат), а таксама за ўзрастанне ў веры і ласцы хросту.

### 260. Хто можа хрысціць?

Звычайнымі распарадчыкамі хросту з'яўляюцца біскуп і прэзбітэр; у Лацінскім Касцёле — таксама дыякан. У выпадку неабходнасці хрысціць можа кожны, галоўнае, каб у яго быў намер здзейсніць тое, што здзяйсняе Касцёл. Той, хто хрысціць, палівае вадой галаву кандыдата і вымаўляе трынітарную формулу хросту: «Я цябе хрышчу ў імя Айца і Сына, і Духа Святога». 1256 1284

### 261. Ці хрост неабходны для збаўлення?

Хрост неабходны для збаўлення тым, каму было абвешчана Евангелле і хто мае магчымасць прасіць аб гэтым сакрамэнце. 1257

### 262. Ці магчыма збаўленне без хросту?

Паколькі Хрыстус памёр дзеля збаўлення ўсіх, могуць быць збаўленыя нават без хросту тыя, хто памірае за веру (*хрост крывёю*), і катэхумэны, а таксама ўсе, хто пад дзеяннем ласкі, не ведаючы Хрыста і Касцёла, шчыра шукае Бога і імкнецца выконваць Ягоную волю (*хрост жадання*). Што датычыць дзяцей, якія памерлі без хросту, Касцёл у сваёй літургіі даручае іх Божай міласэрнасці. 1258-1261 1281-1283

### 263. Які плён хросту?

Хрост адпускае першародны грэх, усе асабістыя грахі і кары за грэх; праз асвячальную ласку — ласку апраўдання — дае ўдзел у трынітарным боскім жыцці, далучаючы да Хрыста і Яго Касцёла; дае ўдзел у святарстве Хрыста і з'яўляецца падставай супольнасці ўсіх хрысціянаў; адорвае тэалагальнымі цнотамі і дарамі Духа Святога. Ахрышчаны назаўсёды належыць Хрысту: пазначаецца незнішчальнай пячаццю Хрыста (*характарам*). 1262-1274 1279-1280

### 264. Якое значэнне мае хрысціянскае імя, атрыманае падчас хросту?

Імя важнае, бо кожнага Бог ведае па імені, гэта значыць, у яго выключнасці. Падчас хросту хрысціянін атрымлівае ў Касцёле 2156-2159 2167

ўласнае імя, пераважна імя якога-небудзь святога, які з’яўляецца для ахрышчанага ўзорам святасці і заступніцтва перад Богам.

## Сакрамэнт канфірмацыі

### 265. Якое месца займае канфірмацыя ў Божым плане збаўлення?

1285-1288 У Старым Запавеце прарокі абвясцілі, што Дух Пана будзе
1315 ўдзелены чаканаму Месіі і ўсяму месіянскаму народу. Усё жыццё і місія Езуса праходзіць у поўнай еднасці з Духам Святым. Апосталы атрымліваюць Духа Святога ў дзень Пяцідзесятніцы і абвяшчаюць «вялікія справы Божыя» (Дз 2, 11). Яны перадаюць новаахрышчаным праз ускладанне рук дар самога Духа. На працягу стагоддзяў Касцёл працягвае жыць Духам Святым і перадае Яго сваім дзецям.

### 266. Чаму гэты сакрамэнт называецца *хрызмаваннем* або *канфірмацыяй?*

1289 Называецца *хрызмаваннем* (ва Усходніх Касцёлах — памазаннем святым мірам, мірапамазаннем) з прычыны галоўнага абраду — памазання. Называецца *канфірмацыяй*, бо пацвярджае і ўмацоўвае ласку хросту.

### 267. Які галоўны абрад канфірмацыі?

1290-1301 Галоўны абрад канфірмацыі — намашчэнне святым хрыз-
1318 мам (алеем, змяшаным з бальзамам і асвячаным біскупам), якое
1320-1321 адбываецца праз ускладанне рукі распарадчыка, які вымаўляе сакрамэнтальныя словы адпаведна абраду. На Захадзе здзяйсняецца памазанне чала ахрышчанага са словамі: «Прымі знак Дару Духа Святога». Ва Усходніх Касцёлах візантыйскага абраду адбываецца таксама памазанне іншых частак цела з вымаўленнем формулы: «Пячаць Дару Духа Святога».

### 268. Які плён канфірмацыі?

1302-1305 Плёнам канфірмацыі ёсць асаблівае ўдзяленне Духа Свя-
1316-1317 тога, такое, як у дзень Пяцідзесятніцы. Яно пакідае ў душы не-

знішчальны характар (пячаць) і дае ўзрастанне ласкі хросту: больш глыбока ўкараняе ў Божым усынаўленні; больш цесна яднае з Хрыстом і Ягоным Касцёлам; умацоўвае ў душы дары Духа Святога; адорвае асаблівай моцай для сведчання аб хрысціянскай веры.

**269. Хто можа прыняць гэты сакрамэнт?**

Яго можа і павінен прыняць — толькі адзін раз — кожны 1306-1311
ахрышчаны, які, дзеля большай плённасці сакрамэнту, павінен 1319
быць у стане ласкі.

**270. Хто з’яўляецца распарадчыкам канфірмацыі?**

Першым распарадчыкам з’яўляецца біскуп. Такім чынам 1312-1314
выяўляецца сувязь канфірмаванага з Касцёлам у яго апостальскім вымярэнні. Калі гэты сакрамэнт удзяляе прэзбітэр, што звычайна мае месца на Усходзе і ў асаблівых выпадках — на Захадзе, сувязь з біскупам і Касцёлам выяўляецца праз прэзбітэра, супрацоўніка біскупа, і праз святое хрызма, асвячанае біскупам.

## Сакрамэнт Эўхарыстыі

**271. Што такое Эўхарыстыя?**

Гэта ахвяра Цела і Крыві Пана Езуса, якую Ён устанавіў, 1322-1323
каб увекавечыць ажно да свайго прыйсця ахвяру Крыжа, дару- 1409
чаючы такім чынам Касцёлу ўспамін сваёй смерці і ўваскрасення. Гэта знак адзінства, повязь любові, пасхальная гасціна, на якой мы прымаем Хрыста, напаўняем душу ласкай і атрымліваем задатак вечнага жыцця.

**272. Калі Езус Хрыстус устанавіў Эўхарыстыю?**

Езус устанавіў яе ў Вялікі чацвер, у «ноч, калі быў выданы» 1323
(1 Кар 11, 23), у той час, калі цэлебраваў са сваімі Апосталамі 1337-1340
Апошнюю Вячэру.

**273. Якім чынам яе ўстанавіў?**

1337-1340 Езус, пасля таго як сабраў сваіх Апосталаў на Апошняй
1365 Вячэры, узяў у свае рукі хлеб, ламаў і даваў ім, кажучы: «Бяры-
1406 це і ешце з гэтага ўсе, бо гэта ёсць Цела Маё, якое за вас будзе выдана». Затым узяў у рукі келіх з віном і сказаў ім: «Бярыце і піце з яго ўсе, бо гэта ёсць келіх Крыві Маёй новага і вечнага запавету, якая за вас і за многіх будзе праліта дзеля адпушчэння грахоў. Гэта чыніце на Маю памяць».

**274. Чым ёсць Эўхарыстыя ў жыцці Касцёла?**

1324-1327 Гэта крыніца і вяршыня ўсяго хрысціянскага жыцця. Пад-
1407 час Эўхарыстыі асвячальная справа Бога адносна нас і наш культ адносна Яго дасягаюць сваёй вяршыні. Эўхарыстыя змяшчае ў сабе ўсё духоўнае дабро Касцёла: самога Хрыста — нашу Пасху. Еднасць Божага жыцця і адзінства Божага народу выражаюцца і здзяйсняюцца ў ёй. Праз цэлебрацыю Эўхарыстыі мы ўжо цяпер яднаемся з нябеснай літургіяй і маем прадчуванне вечнага жыцця.

**275. Як называецца гэты сакрамэнт?**

1328-1332 Бясконцае багацце гэтага сакрамэнту выражаецца словамі, якія закранаюць яго асаблівыя аспекты. Найчасцей ужываюцца наступныя выразы: Эўхарыстыя; святая Імша; Вячэра Пана; ламанне хлеба; эўхарыстычная цэлебрацыя; успамін мукі, смерці і ўваскрасення Пана; святая Ахвяра; святая і Божая Літургія; святая таямніца; Найсвяцейшы Сакрамэнт алтара; святая Камунія.

**276. Якое месца Эўхарыстыі ў Божым плане збаўлення?**

1333-1344 У Старым Запавеце Эўхарыстыя прадказана перадусім у штогадовай пасхальнай вячэры, падчас якой габрэі кожны год спажывалі прэсны хлеб на ўспамін раптоўнага і вызваленчага выйсця з Егіпта. Езус абвяшчае яе ў сваім навучанні і ўстанаўлівае яе, калі цэлебруе са сваімі Апосталамі Апошнюю Вячэру падчас пасхальнай гасціны. Касцёл, верны наказу Пана: «Гэта чыніце на Маю памяць» (1 Кар 11, 24), заўсёды цэлебраваў Эўхарыстыю, асабліва ў нядзелю, дзень уваскрасення Езуса.

**277. Як цэлебруецца Эўхарыстыя?**

Цэлебрацыя Эўхарыстыі складаецца з дзвюх вялікіх частак, якія ствараюць адзіны акт культу: літургіі слова, якая змяшчае ў сабе абвяшчэнне і слуханне Божага слова; эўхарыстычнай літургіі, якая ўключае прыгатаванне хлеба і віна, эўхарыстычную малітву (г.зн. анафару) са словамі кансэкрацыі і Камунію. 1345-1355 1408

**278. Хто з'яўляецца распарадчыкам цэлебрацыі Эўхарыстыі?**

Распарадчыкам з'яўляецца святар (біскуп або прэзбітэр), які атрымаў сапраўднае пасвячэнне і дзейнічае ў асобе Хрыста-Галавы і ад імя Касцёла. 1348 1411

**279. Якія істотныя і неабходныя элементы здзяйснення Эўхарыстыі?**

Гэта пшанічны хлеб і вінаграднае віно. 1412

**280. У якім сэнсе Эўхарыстыя з'яўляецца *ўспамінам* ахвяры Хрыста?**

Эўхарыстыя з'яўляецца *ўспамінам,* таму што выяўляе і здзяйсняе ахвяру, якую Хрыстус прынёс Айцу аднойчы за ўсіх на крыжы дзеля чалавецтва. Ахвярны характар Эўхарыстыі раскрываецца ў саміх словах устанаўлення: «Гэта ёсць Цела Маё, якое за вас будзе выдана» і «Гэты келіх ёсць новым запаветам у Крыві Маёй, якая за вас будзе праліта» (Лк 22, 19-20). Ахвяра крыжа і ахвяра Эўхарыстыі — гэта *адна ахвяра.* Адным з'яўляюцца ахвяра і ахвярадаўца, рознымі з'яўляюцца толькі спосабы ахвярапрынашэння: крывавы — на крыжы, некрывавы — у Эўхарыстыі. 1362-1367

**281. Якім чынам Касцёл удзельнічае ў эўхарыстычнай Ахвяры?**

У Эўхарыстыі ахвяра Хрыста становіцца таксама ахвярай членаў Ягонага цела. Жыццё вернікаў, іх ахвяра, іхнія праслаўленні, іх пакуты, малітва і праца злучаныя з Хрыстом. Паколькі 1368-1372 1414

Эўхарыстыя з'яўляецца ахвярай, яна ахвяруецца за ўсіх жывых і памерлых вернікаў як кампенсацыя за грахі ўсіх людзей, а таксама дзеля атрымання ад Бога духоўных і зямных дабротаў. Нябесны Касцёл таксама яднаецца з ахвярай Хрыста.

### 282. Якім чынам Езус прысутнічае ў Эўхарыстыі?

1373-1375 Езус Хрыстус прысутнічае ў Эўхарыстыі выключным і не-
1413 параўнальным чынам. Ён насамрэч прысутны праўдзіва, рэальна і субстанцыяльна: са сваім Целам і сваёй Крывёю, са сваёй Душой і Боскасцю. У Эўхарыстыі сакрамэнтальна, гэта значыць у эўхарыстычных постацях хлеба і віна, прысутнічае ўвесь Хрыстус: Бог і Чалавек.

### 283. Што азначае *пераўтварэнне*?

1376-1377 *Пераўтварэнне* азначае перамену ўсёй субстанцыі хлеба ў
1413 субстанцыю Цела Хрыста і ўсёй субстанцыі віна ў субстанцыю Ягонай Крыві. Гэтае пераўтварэнне здзяйсняецца падчас эўхарыстычнай малітвы праз дзейснасць слоў Хрыста і дзеянне Духа Святога. Аднак, характэрныя рысы хлеба і віна, гэта значыць «эўхарыстычных постацяў», застаюцца нязменнымі.

### 284. Ці ламанне хлеба падзяляе Хрыста?

1377 Ламанне хлеба не падзяляе Хрыста: Ён прысутнічае ўвесь і цалкам у кожнай эўхарыстычнай постаці і ў кожнай яе частцы.

### 285. Як доўга працягваецца эўхарыстычная прысутнасць Хрыста?

1377 Яна працягваецца да таго часу, пакуль існуюць эўхарыстычныя постаці.

### 286. Які культ належыць сакрамэнту Эўхарыстыі?

1378-1381 Гэта павінен быць культ *latria* — пакланення, які належыць
1418 аднаму толькі Богу як падчас цэлебрацыі Эўхарыстыі, так і па-за ёй. Касцёл з найбольшай стараннасцю захоўвае кансэкраваную Гостыю, заносіць яе хворым і іншым асобам, пазбаўленым

магчымасці ўдзельнічаць у святой Імшы, выстаўляе яе вернікам для ўрачыстай адарацыі, нясе яе ў працэсіі і заахвочвае да частага наведвання і адарацыі Найсвяцейшага Сакрамэнту, які захоўваецца ў табэрнакулюме.

**287. Чаму Эўхарыстыя з'яўляецца пасхальнай гасцінай?**

Эўхарыстыя з'яўляецца пасхальнай гасцінай, бо Хрыстус, 1382-1384
здзяйсняючы сакрамэнтальна сваю Пасху, дае нам сваё Цела і 1391-1396
сваю Кроў як ежу і напой, яднае нас з сабою і паміж сабою ў сваёй ахвяры.

**288. Што такое алтар?**

*Алтар* — гэта сімвал самога Хрыста, які прысутнічае як ах- 1383
вяра (алтар — ахвяра Крыжа) і як нябесная ежа, якую Ён дае 1410
нам (алтар — эўхарыстычны стол).

**289. Калі Касцёл абавязвае ўдзельнічаць у святой Імшы?**

Касцёл абавязвае вернікаў удзельнічаць у святой Імшы кож- 1389
ную нядзелю і ў абавязковыя святы, рэкамендуе таксама ўдзель- 1417
нічаць у ёй і ў іншыя дні.

**290. Калі належыць прымаць святую Камунію?**

Вернікам, якія ўдзельнічаюць у святой Імшы, Касцёл рэка- 1389
мендуе таксама прымаць з належнай падрыхтоўкай святую Камунію, прадпісваючы рабіць гэта прынамсі на Пасху.

**291. Што патрабуецца для прыняцця святой Камуніі?**

Каб прыняць святую Камунію, неабходна быць цалкам да- 1385-1389
лучаным да каталіцкага Касцёла і быць у стане ласкі, гэта зна- 1415
чыць не мець на сумленні смяротнага граху. Той, хто ўсведамляе, што ўчыніў цяжкі грэх, павінен прыступіць да сакрамэнту паяднання перад тым, як будзе прымаць святую Камунію. Важнымі з'яўляюцца таксама дух засяроджанасці і малітвы, захаванне прадпісанага Касцёлам посту і пастаў цела (жэсты, адзенне), што з'яўляецца знакам павагі да Хрыста.

### 292. Які плён святой Камуніі?

1391-1397 1416 Святая Камунія ўмацоўвае нашую лучнасць з Хрыстом і Яго Касцёлам, ахоўвае і аднаўляе жыццё ў ласцы, атрыманае падчас хросту і канфірмацыі, дазваляе нам узрастаць у любові да бліжняга. Узмацняючы нас у любові, знішчае лёгкія грахі і захоўвае нас ад смяротных грахоў у будучыні.

### 293. Калі можна ўдзяляць святую Камунію іншым хрысціянам?

1398-1401 Каталіцкія распарадчыкі маюць права ўдзяляць святую Камунію членам Усходніх Касцёлаў, якія не маюць поўнай еднасці з каталіцкім Касцёлам, калі тыя дабравольна просяць аб ёй і адпаведна да яе падрыхтаваныя.

Што датычыць членаў іншых касцёльных супольнасцяў, то каталіцкія распарадчыкі могуць правамоцна ўдзяляць святую Камунію вернікам, калі яны пры наяўнасці сур'ёзнай неабходнасці просяць аб ёй, адпаведна падрыхтаваныя да яе і вызнаюць каталіцкую веру адносна гэтага сакрамэнту.

### 294. Чаму Эўхарыстыя — гэта «задатак будучай хвалы»?

1402-1405 Кожнага з нас Эўхарыстыя напаўняе ласкай і благаслаўленнем неба, узмацняе ў пілігрымаванні па зямным жыцці і абуджае прагу вечнага жыцця, яднае ўжо цяпер з Хрыстом, які сядзіць праваруч Айца, з нябесным Касцёлам, з благаслаўлёнай Дзевай і з усімі святымі.

> *У Эўхарыстыі мы ламаем «адзін хлеб, які ёсць ежай несмяротнасці, лекам, каб мы не памерлі, але жылі ў Езусе Хрысце назаўсёды»* (св. Ігнацый з Антыёхіі).

## ГЛАВА ДРУГАЯ

# САКРАМЭНТЫ АЗДАРАЎЛЕННЯ

**295. Навошта Хрыстус устанавіў сакрамэнты пакаяння і намашчэння хворых?**

Хрыстус, лекар душы і цела, устанавіў іх, бо новае жыццё, 1420-1421
якое Ён нам дае ў сакрамэнтах хрысціянскага ўтаямнічання, 1426
можа быць аслаблена і нават згублена з прычыны граху. Таму Хрыстус пажадаў, каб Яго справу аздараўлення і збаўлення Касцёл працягваў праз гэтыя два сакрамэнты.

## Сакрамэнт пакаяння і паяднання

**296. Як называецца гэты сакрамэнт?**

Ён называецца сакрамэнтам пакаяння, паяднання, праба- 1422-1424
чэння, споведзі, навяртання.

**297. Навошта існуе сакрамэнт паяднання пасля хросту?**

Новае жыццё ў ласцы, атрыманае падчас хросту, не знішчае 1425-1426
слабасці чалавечай натуры і яе схільнасці да граху (г. зн. *па-* 1484
*жадлівасці*). Хрыстус устанавіў гэты сакрамэнт для навяртання ахрышчаных, якія аддаліліся ад Яго праз грэх.

**298. Калі быў устаноўлены гэты сакрамэнт?**

Уваскрослы Пан устанавіў гэты сакрамэнт, калі вечарам у 1485
дзень Пасхі аб’явіўся сваім Апосталам і сказаў ім: «Прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаныя, на кім пакінеце, на тым застануцца» (Ян 20, 22–23).

**299. Ці ахрышчаныя патрабуюць навяртання?**

Заклік Хрыста да навяртання пастаянна гучыць у жыцці 1427-1429
ахрышчаных. Навяртанне — гэта пастаянны абавязак усяго Касцёла, які з’яўляецца святым, але прымае ў сваё ўлонне грэшнікаў.

### 300. Што такое ўнутранае пакаянне?

1430-1433 Гэта актыўнасць «скрушанага сэрца» (Пс 51 [50], 19), ажыў-
1490 ленага Божай ласкай для адказу на міласэрную любоў Бога. Уключае жаль і агіду ад учыненых грахоў, цвёрды намер не грашыць больш у будучыні і веру ў Божую дапамогу. Жывіцца надзеяй на Божую міласэрнасць.

### 301. У якіх формах выражаецца пакаянне ў хрысціянскім жыцці?

1434-1439 Пакаянне выражаецца ў шматлікіх формах, асабліва праз пост, малітву, міласціну. Гэтыя і іншыя шматлікія формы пакаяння могуць практыкавацца ў штодзённым жыцці хрысціяніна, перадусім у перыяд Вялікага посту і ў дзень пакаяння — пятніцу.

### 302. Якія галоўныя элементы сакрамэнту паяднання?

1440-1449 Іх два: чыны чалавека, які навяртаецца пад дзеяннем Духа Святога, і адпушчэнне грахоў святаром, які ад імя Хрыста прабачае і вызначае спосаб сатысфакцыі.

### 303. Якія ёсць чыны пэнітэнта?

1450-1460 Гэта: належны *рахунак сумлення*; *жаль* (або скруха), які з'яў-
1487-1492 ляецца дасканалым тады, калі матывуецца любоўю да Бога, недасканалым, калі грунтуецца на іншых матывах, і які ўключае намер больш не грашыць; *споведзь*, якая заключаецца ў вызнанні перад святаром учыненых грахоў; *сатысфакцыя* або выкананне пэўных чынаў пакаяння, якія спаведнік вызначае пэнітэнту для выпраўлення шкоды, учыненай грахом.

### 304. Якія грахі неабходна вызнаваць?

1456 Неабходна вызнаваць усе цяжкія грахі, якія яшчэ не былі вызнаныя і якія ўспомніліся пасля належнага рахунку сумлення. Вызнаванне цяжкіх грахоў з'яўляецца адзіным звычайным спосабам для атрымання прабачэння.

**305. Калі неабходна вызнаваць цяжкія грахі?**

Кожны вернік, дасягнуўшы свядомага ўзросту, мае абавязак вызнаваць асабістыя цяжкія грахі прынамсі раз у год і ў кожным выпадку перад тым, як прыняць святую Камунію. 1457

**306. Чаму лёгкія грахі таксама могуць быць прадметам сакрамэнтальнай споведзі?**

Вызнанне лёгкіх грахоў, хоць гэта не з'яўляецца неабходным, горача рэкамендуецца Касцёлам, бо дапамагае нам правільна фарміраваць сумленне, змагацца супраць дрэнных схільнасцяў, даверыцца аздараўляльнай моцы Хрыста і ўзрастаць у духоўным жыцці. 1458

**307. Хто з'яўляецца распарадчыкам гэтага сакрамэнту?**

Хрыстус даручыў паслугу паяднання сваім Апосталам, іх 1461-1466
наступнікам — біскупам, і супрацоўнікам біскупаў — прэзбітэ- 1495
рам, якія такім чынам становяцца прыладамі Божай міласэрнасці і справядлівасці. Яны здзяйсняюць уладу прабачэння грахоў *у імя Айца і Сына, і Духа Святога*.

**308. За кім замацавана права адпушчэння некаторых грахоў?**

Права адпушчэння некаторых асабліва цяжкіх грахоў (напр., тых, якія караюцца экскамунікай) замацавана за Апостальскай Сталіцай або за мясцовым біскупам ці за ўпаўнаважанымі ім прэзбітэрамі; аднак кожны святар можа адпускаць кожны грэх і здымаць экскамуніку з таго, хто знаходзіцца ў небяспецы смерці. 1463

**309. Ці абавязаны спаведнік захоўваць таямніцу?**

Беручы пад увагу далікатнасць і значнасць гэтай паслугі, а таксама належную павагу да асобы, кожны спаведнік абавязаны без выключэнняў і пад вельмі суровымі карамі захоўваць сакрамэнтальную пячаць, гэта значыць абсалютную таямніцу адносна вызнаных на споведзі грахоў. 1467

### 310. Які плён гэтага сакрамэнту?

1468-1470 Плён сакрамэнту пакаяння наступны: паяднанне з Богам і
1496 тым самым прабачэнне грахоў; паяднанне з Касцёлам; вяртанне стану ласкі, калі ён быў страчаны; дараванне вечнай кары, заслужанай з прычыны смяротных грахоў і, часткова, кар часовых, якія з'яўляюцца наступствамі граху; спакой сумлення, а таксама духоўнае суцяшэнне; павелічэнне духоўных сілаў для хрысціянскага змагання.

### 311. Ці можна ў некаторых выпадках цэлебраваць гэты сакрамэнт з агульным вызнаннем і агульным адпушчэннем грахоў?

1480-1484 У выпадках сур'ёзнай неабходнасці (напр., небяспека блізкай смерці) можна здзейсніць супольную цэлебрацыю паяднання з агульным вызнаннем і агульным адпушчэннем грахоў згодна з нормамі Касцёла і пры наяўнасці намеру вернікаў індывідуальна вызнаць цяжкія грахі ў адпаведны час.

### 312. Што такое адпуст?

1471-1479 Адпуст — гэта дараванне перад Богам часовай кары за грахі,
1498 віна за якія ўжо прабачана. Вернік атрымлівае яго пры пэўных умовах, для сябе самога або для памерлых, праз паслугу Касцёла, які, як той, хто раздае ласкі адкуплення, размяркоўвае скарб заслуг Хрыста і святых.

## Сакрамэнт намашчэння хворых

### 313. Як перажывалася хвароба ў Старым Запавеце?

1499-1502 У Старым Запавеце чалавек падчас хваробы адчуваў сваю бездапаможнасць і ў той жа час разумеў, што хвароба таямнічым чынам звязана з грахом. Прарокі прадбачылі, што яна можа мець таксама збаўчую каштоўнасць адносна ўласных грахоў і грахоў іншых. Такім чынам, хвароба перажывалася перад абліччам Бога, якога чалавек прасіў аб аздараўленні.

### 314. Што азначае спачуванне Езуса хворым?

Спачуванне Езуса хворым і шматлікія аздараўленні Ім хворых з’яўляюцца выразным знакам таго, што надыходзіць Божае Валадарства, а значыць — перамога над грахом, пакутамі і смерцю. Праз сваю муку і смерць Езус надае новы сэнс пакутам, якія, калі яны злучаныя з Ягонымі, могуць стаць сродкам ачышчэння і збаўлення для нас і для іншых. 1503-1505

### 315. Якое стаўленне Касцёла да хворых?

Касцёл, атрымаўшы ад Пана наказ аздараўляць хворых, абавязаны здзяйсняць яго, клапоцячыся пра хворых, узносячы за іх малітвы заступніцтва. Перадусім Касцёл мае спецыяльны сакрамэнт, устаноўлены для хворых самім Хрыстом і засведчаны св. Якубам: «Нехта сярод вас хварэе? Няхай пакліча прэзбітэраў Касцёла, а яны няхай памоляцца над ім і намасцяць яго алеем у імя Пана» (Як 5, 14–15). 1506-1513 1526-1527

### 316. Хто можа атрымаць сакрамэнт намашчэння хворых?

Яго можа атрымаць вернік, які знаходзіцца ў небяспецы смерці з-за хваробы ці старасці. Той жа вернік можа атрымаць яго таксама зноў, калі абвастраецца хвароба або калі з ім здараецца іншая цяжкая хвароба. Цэлебрацыі гэтага сакрамэнту павінна, па магчымасці, папярэднічаць індывідуальная споведзь хворага. 1514-1515 1528-1529

### 317. Хто ўдзяляе гэты сакрамэнт?

Ён можа быць удзелены толькі святарамі (біскупамі ці прэзбітэрамі). 1516 1530

### 318. Як цэлебруецца гэты сакрамэнт?

Цэлебрацыя гэтага сакрамэнту, па-сутнасці, складаецца з *намашчэння* чала і рук (згодна з рымскім абрадам) або таксама іншых частак цела (у іншых абрадах) алеем, па магчымасці благаслаўленым біскупам; намашчэнне суправаджаецца *малітвай* святара, які просіць аб асаблівай ласцы гэтага сакрамэнту. 1517-1519 1531

### 319. Які плён гэтага сакрамэнту?

1520-1523 1532 Сакрамэнт намашчэння хворых удзяляе асаблівую ласку, якая найбольш глыбока яднае хворага з мукай Хрыста дзеля дабра самога хворага і ўсяго Касцёла, адорвае хворага суцяшэннем, спакоем, мужнасцю, а таксама прабачэннем грахоў, калі хворы не мог прыступіць да споведзі. Гэты сакрамэнт дае, калі гэтага хоча Бог, таксама фізічнае аздараўленне. У кожным выпадку, гэтае намашчэнне рыхтуе хворага да пераходу ў дом Айца.

### 320. Што такое Віятык?

1524-1525 Гэта Эўхарыстыя, якую атрымліваюць тыя, хто адыходзіць з зямнога жыцця і рыхтуецца да пераходу ў жыццё вечнае. Атрыманая ў момант пераходу з гэтага свету да Айца, Камунія Цела і Крыві Хрыста, памерлага і ўваскрослага, з'яўляецца зародкам вечнага жыцця і моцаю ўваскрашэння.

## ГЛАВА ТРЭЦЯЯ

# САКРАМЭНТЫ СЛУЖЭННЯ СУПОЛЬНАСЦІ І МІСІІ

### 321. Якія сакрамэнты служаць супольнасці і місіі?

1533-1535 Два сакрамэнты — пасвячэнне і сужэнства — удзяляюць спецыяльную ласку для асаблівай місіі ў Касцёле і служаць будаванню Божага народу. Яны асаблівым чынам прычыняюцца да будавання касцёльнай супольнасці і збаўлення іншых людзей.

## Сакрамэнт пасвячэння

### 322. Што такое сакрамэнт пасвячэння?

1536 Гэта сакрамэнт, дзякуючы якому місія, якую даручыў Хрыстус сваім Апосталам, працягвае здзяйсняцца ў Касцёле аж да сканчэння веку.

### 323. Чаму ён называецца сакрамэнтам пасвячэння?

*Пасвячэнне* азначае касцёльны стан, да якога ўваходзяць праз спецыяльную кансэкрацыю (*ordinatio* — пасвячэнне), якая праз асаблівы дар Духа Святога дазваляе здзяйсняць «святую ўладу» (*sacra potestas*) ад імя і моцаю Хрыста дзеля служэння Божаму народу. 1537-1538

### 324. Якое месца мае сакрамэнт пасвячэння ў Божым плане збаўлення?

У Старым Запавеце правобразам гэтага сакрамэту з'яўляецца служэнне левітаў, а таксама святарства Аарона і ўстанаўленне сямідзесяці «старэйшын» (Ліч 11, 25). Гэтыя правобразы знаходзяць сваё здзяйсненне ў Езусе Хрысце, які праз ахвяру свайго крыжа з'яўляецца адзіным «пасрэднікам паміж Богам і людзьмі» (1 Цім 2, 5), «Першасвятаром на ўзор Мэльхізэдэка» (Гбр 5, 10). Адзінае святарства Хрыста ажыццяўляецца праз службовае святарства. 1539-1546 1590-1591

*«Хрыстус ёсць адзіным сапраўдным Святаром, іншыя — толькі Яго слугі»* (св. Тамаш Аквінскі).

### 325. Якія ступені сакрамэнту пасвячэння?

Сакрамэнт пасвячэння мае тры ступені, якія з'яўляюцца неад'емнымі ў арганічнай структуры Касцёла: біскупства, прэзбітэрат, дыяканат. 1554 1593

### 326. Які плён біскупскага пасвячэння?

Біскупскае пасвячэнне дае паўнату сакрамэнту пасвячэння, робіць біскупа легітымным наступнікам Апосталаў, далучае яго да Калегіі Біскупаў, у якой ён падзяляе з Папам і іншымі біскупамі клопат аб усім Касцёле, а таксама даручае яму абавязак навучаць, асвячаць і кіраваць. 1557-1558 1594

## 327. Якія абавязак мае біскуп у даручаным яму мясцовым Касцёле?

1560-1561 Біскуп, якому даручаны мясцовы Касцёл, з'яўляецца бачным пачаткам і падмуркам адзінства гэтага Касцёла, у якім ён як вікарый Хрыста выконвае пастырскі абавязак з дапамогаю сваіх прэзбітэраў і дыяканаў.

## 328. Які плён прэзбітэрскага пасвячэння?

1562-1567 Намашчэнне Духам Святым пазначае прэзбітэра незні-
1595 шчальнай духоўнай пячаццю (характарам), прыпадабняе яго да Хрыста-Святара і робіць здольным дзейнічаць у імя Хрыста-Галавы. З'яўляючыся супрацоўнікам біскупа, ён кансэкраваны, каб абвяшчаць Евангелле і цэлебраваць Божы культ, асабліва Эўхарыстыю, з якой атрымлівае моц для свайго служэння, а таксама, каб быць пастырам вернікаў.

## 329. Якім чынам прэзбітэр выконвае сваю паслугу?

1568 Будучы пасвячаным дзеля паўсюднай місіі, прэзбітэр здзяйсняе яе ў мясцовым Касцёле ў сакрамэнтальным братэрстве з іншымі прэзбітэрамі, якія ствараюць «прэзбітэрый» і, у еднасці з біскупам і падпарадкоўваючыся яму, нясуць адказнасць за мясцовы Касцёл.

## 330. Які плён дыяканскага пасвячэння?

1569-1571 Дыякан, прыпадабняючыся да Хрыста, які служыў усім,
1596 пасвячаны дзеля служэння Касцёлу, якое ён здзяйсняе пад кіраўніцтвам свайго біскупа і якое датычыць паслугі слова, Божага культу, пастырскіх заданняў і дабрачыннасці.

## 331. Як цэлебруецца сакрамэнт пасвячэння?

1572-1574 Сакрамэнт пасвячэння ўсіх трох ступеняў удзяляецца праз
1597 *ускладанне рук* біскупа на галаву кандыдата. Пры гэтым біскуп вымаўляе ўрачыстую кансэкрацыйную *малітву*. У ёй біскуп просіць Бога аб асаблівым праліцці Духа Святога і Яго дароў на кандыдата, адпаведна яго будучаму служэнню.

**332. Хто можа ўдзяляць гэты сакрамэнт?**

Сапраўдна пасвячаныя біскупы, паколькі з’яўляюцца наступнікамі Апосталаў, могуць удзяляць сакрамэнт пасвячэння ўсіх трох ступеняў. 1575-1576 1600

**333. Хто можа атрымаць гэты сакрамэнт?**

Яго можа сапраўдна атрымаць толькі ахрышчаны мужчына: Касцёл абавязаны да такога выбару, зробленага самім Панам. Ніхто не можа патрабаваць атрымання сакрамэнту пасвячэння, але павінен быць прызнаны прыгодным да такога служэння ўладамі Касцёла. 1577-1578 1598

**334. Ці патрабуецца цэлібат ад таго, хто прымае сакрамэнт пасвячэння?**

Для біскупства заўсёды патрабуецца цэлібат. Для прэзбітэрату ў Лацінскім Касцёле звычайна выбіраюцца веруючыя нежанатыя мужчыны, якія маюць намер захаваць цэлібат «дзеля Нябеснага Валадарства» (Мц 19, 12); ва Усходніх Касцёлах не дазваляецца жаніцца пасля атрымання пасвячэння. Да сталага дыяканату могуць быць дапушчаныя таксама і жанатыя мужчыны. 1579-1580 1599

**335. Які плён сакрамэнту пасвячэння?**

Гэты сакрамэнт дае асаблівыя ласкі Духа Святога, які прыпадабняе асвячанага да Хрыста ў Яго патройнай функцыі: Святара, Прарока і Караля адпаведна ступеням сакрамэнту. Пасвячэнне пакідае незнішчальны духоўны характар (пячаць), таму не можа паўтарацца і не можа ўдзяляцца на абмежаваны час. 1581-1589

**336. Якой уладай здзяйсняецца службовае святарства?**

Пасвячаныя святары, здзяйсняючы святое служэнне, навучаюць і дзейнічаюць не ўласнай уладай і не па загадзе ці даручэнні супольнасці, але ў асобе Хрыста-Галавы і ад імя Касцёла. Таму службовае святарства істотна адрозніваецца, і не толькі ўзроўнем, ад агульнага святарства вернікаў, дзеля служэння якому яго ўстанавіў Хрыстус. 1547-1553 1592

## Сакрамэнт сужэнства

**337. Які Божы намер адносна мужчыны і жанчыны?**

1601-1605 Бог, які ёсць любоўю і які стварыў чалавека з любові, паклікаў яго да любові. Ствараючы мужчыну і жанчыну, Ён паклікаў іх да глыбокай еднасці жыцця ў сужэнстве і да ўзаемнай любові, «таму яны ўжо не двое, але адно цела» (Мц 19, 6). Благаслаўляючы іх, Бог кажа: «Пладзіцеся і размнажайцеся» (Быц 1, 28).

**338. Навошта Бог устанавіў сужэнства?**

1659-1660 Сужэнскі саюз мужчыны і жанчыны, заснаваны і арганізаваны па законах самога Стварыцеля, па сваёй натуры ўстаноўлены дзеля супольнасці і дабра сужэнцаў, а таксама дзеля нараджэння і выхавання дзяцей. Сужэнскі саюз, паводле першапачатковага Божага намеру, непарыўны, як сцвярджае Езус Хрыстус: «Тое, што Бог злучыў, няхай чалавек не разлучае» (Мц 10, 9).

**339. Якім чынам грэх пагражае сужэнству?**

1606-1608 З прычыны першага граху, які таксама парушыў дадзеную Стварыцелем супольнасць мужчыны і жанчыны, сужэнскі саюз вельмі часта знаходзіцца пад пагрозай нязгоды і няевернасці. Але Бог у сваёй бязмежнай міласэрнасці дорыць мужчыну і жанчыне сваю ласку, дзеля ажыццяўлення адзінства іх жыцця паводле першапачатковага Божага намеру.

**340. Чаму навучае Стары Запавет адносна сужэнства?**

1609-1611 Бог, галоўным чынам праз педагогіку Закону і прарокаў, дапамагае свайму народу ўзрастаць ва ўсведамленні адзінства і непарыўнасці сужэнства. Абранніцкі запавет Бога з Ізраэлем рыхтуе і прадвызначае новы, здзейснены Сынам Бога, Езусам Хрыстом, запавет з Касцёлам — Яго абранніцай.

**341. Чым новым адарыў Хрыстус сужэнства?**

1612-1617 Езус Хрыстус не толькі захоўвае першапачатковы парадак,
1661 прадвызначаны Богам, але адорвае сужэнства ласкай існавання ў новай сакрамэнтальнай якасці, што з’яўляецца знакам Яго

абранніцкай любові да Касцёла: «Мужы, любіце сваіх жонак, як і Хрыстус палюбіў Касцёл» (Эф 5, 25).

**342. Ці сужэнства абавязковае для ўсіх?**

Сужэнства не абавязковае для ўсіх. Асаблівым чынам Бог 1618-1620
кліча некаторых мужчын і жанчын наследаваць Пана Езуса на шляху дзявоцтва ці цэлібату дзеля Нябеснага Валадарства, адмаўляючыся ад вялікага дабра сужэнства дзеля таго, каб клапаціцца аб справах Пана і імкнуцца падабацца Яму, становячыся знакам абсалютнай першаснасці любові Хрыста і адданага чакання Яго хвалебнага прыйсця.

**343. Як цэлебруецца сакрамэнт сужэнства?**

Паколькі сужэнства ўстанаўлівае публічны стан жыцця су- 1621-1624
жэнцаў у Касцёле, яго літургічная цэлебрацыя публічная і адбываецца ў прысутнасці святара (ці ўпаўнаважанага Касцёлам сведкі) і іншых сведкаў.

**344. Што такое сужэнская згода?**

Сужэнская згода — гэта воля, выражаная мужчынам і жан- 1625-1632
чынай, прысвяціць сябе ўзаемна і канчаткова жыццю ў запаве- 1662-1663
це вернай і плоднай любові. Паколькі згода стварае сужэнства, яна неабходная і незаменная. Для сапраўднасці сужэнства згода павінна мець за мэту стварэнне сапраўднага сужэнства, яна павінна быць свядомым і дабравольным чынам нарачоных, павінна быць выказаная без гвалту ці прымусу.

**345. Што неабходна, калі адзін з сужэнцаў не з'яўляецца католікам?**

Для заключэння *змешанага* сужэнства (паміж католікам і 1633-1637
ахрышчаным некатолікам) неабходны дазвол касцёльнай улады. У выпадку *розных рэлігій* (паміж католікам і неахрышчаным) для сапраўднасці сужэнства неабходна дыспенса. У кожным выпадку істотным з'яўляецца тое, каб сужэнцы ведалі і прымалі мэты і істотныя якасці сужэнства, і каб сужэнец-католік пацвердзіў свае абавязкі, вядомыя таксама другому су-

жэнцу, захаваць веру, а таксама запэўніць хрост і каталіцкае выхаванне дзяцей.

**346. Які плён сакрамэнту сужэнства?**

1638-1642 Сакрамэнт сужэнства стварае паміж сужэнцамі вечныя і выключныя повязі. Сам Бог замацоўвае сужэнскую згоду. Таму сужэнства, заключанае і здзейсненае паміж ахрышчанымі, ніколі не можа быць скасавана. Больш за тое, гэты сакрамэнт дае сужэнцам неабходную ласку для дасягнення святасці ў сужэнскім жыцці, для адказнага прыняцця дзяцей і іх выхавання.

**347. Якія самыя цяжкія грахі супраць сакрамэнту сужэнства?**

1645-1648 Гэта: чужаложства; палігамія, паколькі супярэчыць роўнай годнасці мужчыны і жанчыны, унікальнасці і выключнасці сужэнскай любові; адмова ад плоднасці, што пазбаўляе сужэнскае жыццё дару дзяцей; развод, які парушае непарыўнасць.

**348. Калі Касцёл дапускае фізічную сепарацыю сужэнцаў?**

1629 Касцёл дапускае фізічную сепарацыю сужэнцаў, калі іх су-
1649 меснае жыццё з-за сур’ёзных прычын становіцца практычна немагчымым, аднак пажадана было б іх паяднаць. Пакуль жыве другі сужэнец, яны несвабодныя і не могуць заключыць новы саюз, акрамя выпадкаў, калі толькі іх сужэнства з’яўляецца несапраўдным і гэта прызнана касцёльнымі ўладамі.

**349. Як адносіцца Касцёл да разведзеных, якія жэняцца нанова?**

1650-1651 Касцёл, верны Пану, не можа прызнаць сужэнствам грама-
1665 дзянскі саюз разведзеных. «Хто разводзецца з жонкаю сваёю і ажэніцца з іншай, той чыніць распусту ў дачыненні да яе. І калі жонка развядзецца з мужам сваім і выйдзе замуж за іншага, чыніць распусту» (Мк 10, 11–12). У адносінах да іх Касцёл праяўляе старанны клопат і запрашае да жыцця ў веры, да малітвы, да спраў любові і хрысціянскага выхавання дзяцей. Аднак

яны не могуць атрымліваць сакрамэнтальнага адпушчэння грахоў, прымаць эўхарыстычную Камунію, выконваць некаторыя касцёльныя абавязкі да таго часу, пакуль доўжыцца такая сітуацыя, якая аб’ектыўна супярэчыць Божаму закону.

**350. Чаму хрысціянская сям’я называецца таксама *хатнім Касцёлам?***

Сям’я выяўляе і здзяйсняе супольнасны і сямейны характар Касцёла, як Божай сям’і, у якой кожны паводле ўласнай 1655-1658 1666
ролі рэалізуе святарства хросту, прычыняецца да таго, каб сям’я стала супольнасцю ласкі і малітвы, школай чалавечых і хрысціянскіх цнотаў, месцам першага абвяшчэння веры дзецям.

## ГЛАВА ЧАЦВЁРТАЯ

# ІНШЫЯ ЛІТУРГІЧНЫЯ ЦЭЛЕБРАЦЫІ

## Сакрамэнталіі

**351. Што такое сакрамэнталіі?**

Гэта святыя знакі, устаноўленыя Касцёлам, з дапамогай якіх 1667-1672
адбываецца асвячэнне некаторых абставін жыцця. Яны ўклю- 1677-1678
чаюць малітву, якая суправаджаецца знакам крыжа і іншымі знакамі. Сярод сакрамэнталій важнае месца займаюць благаслаўленні, якія з’яўляюцца праслаўленнем Бога і малітвай аб атрыманні Яго дароў; кансэкрацыя асобаў і благаслаўленне рэчаў для Божага культу.

**352. Што такое экзарцызм?**

Экзарцызм — гэта просьба Касцёла, якую ён узносіць на 1673
моцы сваёй улады ад імя Езуса, каб асоба ці прадмет былі абароненыя ад уздзеяння злога духа і вызваленыя з-пад яго ўлады. У простай форме экзарцызм здзяйсняецца падчас абраду хросту. Урачысты экзарцызм, які называецца яшчэ *вялікім экзарцызмам,* могуць здзяйсняць толькі ўпаўнаважаныя біскупам прэзбітэры.

### 353. Якія формы народнай пабожнасці суправаджаюць сакрамэнтальнае жыццё Касцёла?

1674-1676 1679 Рэлігійнае пачуццё хрысціянскага народу заўсёды знаходзіла адлюстраванне ў разнастайных формах пабожнасці, якія суправаджаюць сакрамэнтальнае жыццё Касцёла, а менавіта: ушанаванне рэліквій, наведванне санктуарыяў, пілігрымкі, працэсіі, Крыжовы шлях, Ружанец. Касцёл святлом веры асвячае і падтрымлівае аўтэнтычныя формы народнай пабожнасці.

## Хрысціянскае пахаванне

### 354. Якая сувязь існуе паміж сакрамэнтамі і смерцю хрысціяніна?

1680-1683 Хрысціянін, які памірае ў Хрысце, пасля заканчэння свайго зямнога існавання пераходзіць да спаўнення новага жыцця, распачатага падчас хросту, умацаванага канфірмацыяй і ўскормленага Эўхарыстыяй, якая з'яўляецца прадвяшчэннем нябеснай гасціны. Сэнс смерці хрысціяніна выяўляецца ў святле смерці і ўваскрасення Хрыста, нашай адзінай надзеі; хрысціянін, які памірае ў Езусе Хрысце, пакідае цела, каб «пасяліцца ў Пану» (2 Кар 5, 8).

### 355. Што выражае пахаванне?

1684-1685 Пахаванне, хоць цэлебруецца паводле розных абрадаў, што адпавядаюць сітуацыям і традыцыям асобных рэгіёнаў, выяўляе пасхальны характар хрысціянскай смерці ў надзеі на ўваскрашэнне і сэнс лучнасці з памерлым, асабліва праз малітву аб ачышчэнні яго душы.

### 356. Якія галоўныя моманты пахавання?

1686-1690 Звычайна пахаванне ўключае чатыры асноўныя моманты: вітанне астанкаў памерлага супольнасцю словамі суцяшэння і надзеі, літургію слова, эўхарыстычную Ахвяру і развітанне, падчас якога душа памерлага даручаецца Богу, які ёсць крыніцай вечнага жыцця, у той час як цела памерлага аддаецца зямлі ў чаканні ўваскрашэння.



На ілюстрацыі прадстаўлена сцэна ўстанаўлення Эўхарыстыі падчас Апошняй Вячэры, якая адбывалася ў вялікім верхнім пакоі, засланым дыванамі (пар. Мк 14, 15).

«І калі яны елі, Езус узяў хлеб, благаславіў, ламаў і даваў вучням, кажучы: "Бярыце і ешце, гэта Цела Маё". Потым узяў келіх, благаславіў, даў ім, кажучы: "Піце з яго ўсе, бо гэта Кроў Мая новага запавету, якая будзе праліта за многіх дзеля адпушчэння грахоў"» (Мц 26, 26–28).

На выяве Езус з Апосталамі сядзяць вакол стала, які мае форму келіха. На стале — эўхарыстычныя постаці: хлеб і віно. Пакой, які паказаны на добра распрацаваным архітэктурным фоне, з будынкамі і круглым табэрнакулюмам, размешчаным на сямі калонах, сімвалізуе Касцёл, жыллё эўхарыстычнага Хрыста. Вельмі важная дэталь — постаць апостала Яна, які схіляе сваю галаву на грудзі Езуса (пар. Ян 13, 25). Гэта ўказвае на супольнасць любові, якую Эўхарыстыя стварае ў верніку. Гэта адказ вучня на заклік Настаўніка:

«Я — вінаградная лаза, вы — галіны. Хто застаецца ўва Мне, а Я ў ім, той прыносіць багаты плён (...). Заставайцеся ў Маёй любові. Калі будзеце захоўваць Мае запаведзі, застанецеся ў любові Маёй» (Ян 15, 5.9–10).

Эўхарыстыя — гэта еднасць з Езусам і духоўны пажытак, які падтрымлівае верніка ў добрай штодзённай барацьбе дзеля захавання запаведзяў:

«Збаўца <...> заўсёды і ва ўсім прысутнічае з тымі, хто жыве ў Ім: клапоціцца аб кожнай іх патрэбе, з'яўляецца для іх усім і не дазваляе ім звярнуць свой позірк на штосьці іншае, каб яны не шукалі нікога па-за Ім. Сапраўды, святым нічога не патрэбна, акрамя Яго: Ён іх нараджае, узрошчвае і жывіць, з'яўляецца іх святлом і подыхам, сам фарміруе іх погляд, асвячае іх сабою, нарэшце, адкрываецца ім. Ён адначасова і жывіць, і з'яўляецца для іх пасілкам; Ён дае ім хлеб жыцця, якім з'яўляецца Ён сам; жыццё для жывых, водар для тых, хто дыхае, адзенне для тых, хто жадае апрануцца. Ён таксама той, хто дапамагае ісці і хто з'яўляецца дарогай, а таксама месцам адпачынку і прызначэннем. Мы — Ягоныя члены, Ён — Галава. Неабходна змагацца? Ён змагаецца разам з намі і дае перамогу таму, хто яе заслугоўвае. Перамагаем? Гэта Ён з'яўляецца нашым вянцом. Так з кожнага месца Ён накіроўвае да сябе наш розум і не дазваляе, каб мы звярнуліся да чаго-небудзь іншага, каб нас ахапіла любоў да чагосьці іншага (...). З усяго сказанага становіцца відавочным, што жыццё ў Хрысце датычыць не толькі будучыні, але ўжо сёння існуе для святых, якія жывуць і дзейнічаюць у Ім» (N. Cabasilas, *La vita in Cristo*, 1, 13–15).

---

Якуб Капіст. *Ілюстрацыя да «Тэтраевангелля»* (XV ст.). Бібліятэка Айцоў Мхітарыстаў, Вена

## ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

# ЖЫЦЦЁ Ў ХРЫСЦЕ

РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

# ПАКЛІКАННЕ ЧАЛАВЕКА — ЖЫЦЦЁ Ў ДУХУ



Марыя, *Панагія* (гр. *Panaghia — Усесвятая*), — гэта шэдэўр Духа Святога. Яе жыццё, ад беззаганнага зачацця аж да хвалебнага ўнебаўзяцця, цалкам падтрымана Божай любоўю. Дух любові Айца і Сына робіць Марыю новым стварэннем, новай Евай, чыё сэрца і розум звернутыя да пакланення і паслухмянасці Нябеснаму Айцу, умілаванай дачкой якога Яна з'яўляецца; да прыняцця і служэння Сыну, чыёй Маці, вучаніцай і супрацоўніцай Яна з'яўляецца; да адпаведнага супрацоўніцтва з Духам Святым, каштоўнай святыняй якога Яна з'яўляецца.

На гэтай выяве Марыя акружана анёламі, якія іграюць і радуюцца; над Яе галавой — ззянне Божай любові, што паходзіць ад Духа Святога, якога сімвалізуе голуб. Марыя — Маці і ахоўніца Касцёла (пад Яе нагамі мы бачым святыню). Праз сваё дзейснае мацярынскае заступніцтва перад Езусам Яна пралівае на Касцёл безліч нябесных ласкаў (іх сімвалізуе куст квітнеючых руж).

Унізе злева — апостал Ян, які сузірае Беззаганную; ён сімвалізуе кожнага верніка, які бачыць у благаслаўлёнай Дзеве вобраз дасканаласці і, у той жа час, настаўніцу і правадырку да жыцця ў Духу Святым.

Абат цыстэрсаў Крыстыян (XII ст.) разважаў над саўдзелам Марыі ў духоўным досведзе Апосталаў. Параўноўваючы іх з дванаццацю зоркамі, якія вянчаюць Найсвяцейшую Дзеву, абат пісаў:

«Яны часта збіраліся вакол разважлівай Дзевы, як вучні вакол сваёй настаўніцы, каб найлепш спасцігнуць праўду Яе ўчынкаў, праўду, якую маглі б прапаведваць іншым у патрэбны момант. Асвячаная і навучаная Богам, Марыя ўяўляла сабой сапраўдную скарбніцу нябеснай мудрасці, бо на працягу доўгага часу Яна знаходзілася, як асаблівая спадарожніца, побач з самой Мудрасцю — сваім Сынам, — запамінаючы і верна захоўваючы тое, што ўбачыла і пачула» *(Sermone I sull'Assunzione della Beata Maria)*.

---

Эль Грэка. *Св. Ян евангеліст сузірае Дзеву Марыю, Беззаганна Зачатую* (каля 1585 г.). Таледа (Іспанія), Музей Санта-Круз

**357. Як маральнае жыццё хрысціяніна звязана з верай і сакрамэнтамі?**

Тое, што вызнаецца ў сімвале веры, удзяляецца ў сакрамэнтах. Сапраўды, праз іх вернікі атрымліваюць ласку Хрыста і дары Духа Святога, якія робяць іх здольнымі жыць новым жыццём дзяцей Божых у Хрысце, якога яны з верай прынялі. 1691-1698

*«Хрысціянін, прызнай сваю годнасць!»* (св. Леў Вялікі).

## ГЛАВА ПЕРШАЯ

# ГОДНАСЦЬ ЧАЛАВЕЧАЙ АСОБЫ

### Чалавек — вобраз Бога

**358. Што з'яўляецца падставай чалавечай годнасці?**

Годнасць чалавечай асобы мае падставы ў тым, што чалавек створаны паводле Божага вобраза і падабенства. Адораная духоўнай і несмяротнай душой, розумам і вольнай воляй, чалавечая асоба скіраваная да Бога і пакліканая, з душой і целам, да вечнага шчасця. 1699-1715

### Нашае пакліканне да шчасця

**359. Як чалавек дасягае шчасця?**

Чалавек дасягае шчасця, дзякуючы ласцы Хрыста, якая дае яму ўдзел у Божым жыцці. Хрыстус у Евангеллі ўказвае шлях, які вядзе да вечнага шчасця: благаслаўленні. Ласка Хрыста дзейнічае ў кожным чалавеку, які, кіруючыся правільным сумленнем, шукае і любіць дабро і праўду, і пазбягае зла. 1716

**360. Чаму благаслаўленні з’яўляюцца для нас важнымі?**

1716-1717 1725-1726 Благаслаўленні знаходзяцца ў цэнтры прапаведвання Езуса, яны аднаўляюць і спаўняюць абяцанні Бога, дадзеныя ў часы Абрагама, адлюстроўваюць аблічча самога Езуса, характарызуюць сапраўднае хрысціянскае жыццё і раскрываюць чалавеку канчатковую мэту яго дзеянняў: вечнае шчасце.

**361. Як суадносяцца благаслаўленні з імкненнем чалавека да шчасця?**

1718-1719 Благаслаўленні адпавядаюць прыроджанаму прагненню шчасця, якое Бог уліў у сэрца чалавека, каб прыцягнуць яго да сябе, бо толькі Ён можа заспакоіць гэтае прагненне.

**362. Што такое вечнае шчасце?**

1720-1724 1727-1729 Гэта сузіранне Бога ў вечным жыцці, у якім мы ў поўнай меры будзем «саўдзельнікамі Божай натуры» (2 П 1, 4), хвалы Хрыста і асалоды трынітарнага жыцця. Шчасце пераўзыходзіць чалавечыя здольнасці: гэта звышпрыродны і бескарыслівы дар Бога, як і ласка, якая да яго вядзе. Абяцанае шчасце ставіць нас перад вырашальнымі маральнымі выбарамі, якія датычаць зямных дабротаў, пабуджаючы нас любіць Бога па-над усё.

## Свабода чалавека

**363. Што такое свабода?**

1730-1733 1743-1744 Гэта магчымасць, дадзеная чалавеку Богам, дзейнічаць або не дзейнічаць, рабіць тое ці іншае, выконваць самастойна прадуманыя дзеянні. Свабода характарызуе менавіта чалавечыя чыны. Чым больш чалавек чыніць добрага, тым больш свабодным ён становіцца. Свабода дасягае сваёй дасканаласці, калі яна скіраваная да Бога — найвышэйшага Дабра і нашага Шчасця. Свабода ўключае магчымасць выбіраць паміж дабром і злом. Выбар зла — гэта злоўжыванне свабодай, якое вядзе да зняволення грахом.

**364. Якая існуе сувязь паміж свабодай і адказнасцю?**

Свабода робіць чалавека адказным за свае дзеянні ў такой 1734-1737
ступені, у якой яны з'яўляюцца дабравольнымі. Абвінавачван- 1745-1746
не і адказнасць за нейкае дзеянне могуць быць зменшаныя, а нават скасаваныя з прычыны няведання, няўважлівасці, гвалтоўнага прымусу, боязі, неапанаваных пачуццяў, звычак.

**365. Чаму кожны чалавек мае права на свабоду?**

Права на свабоду — гэта асабістае права кожнага чалавека, 1738
паколькі яно неад'емнае ад яго чалавечай годнасці. Таму гэтае 1747
права павінна заўсёды захоўвацца, асабліва ў рэлігійнай і маральнай сферы; яно павінна быць прызнана грамадствам і абараняцца ў межах агульнага дабра і справядлівага грамадскага ладу.

**366. Якое месца займае свабода чалавека ў плане збаўлення?**

Наша свабода аслабленая з прычыны першага граху. Гэтае 1739-1742
аслабленне яшчэ больш узрастае з прычыны наступных грахоў. 1748
Але Хрыстус «вызваліў нас, каб мы заставаліся свабоднымі» (Гал 5, 1). Дух Святы вядзе нас да духоўнай свабоды, каб зрабіць нас сваімі свабоднымі супрацоўнікамі ў Касцёле і свеце.

**367. Якія крыніцы маральнасці чалавечых учынкаў?**

Маральнасць чалавечых учынкаў залежыць ад трох крыніц: 1749-1754
ад *выбранага прадмета*, гэта значыць дабра, сапраўднага ці ўяў- 1757-1758
нага; ад *намеру* таго, хто дзейнічае, гэта значыць мэты, дзеля якой ён здзяйсняе дзеянне; ад *акалічнасцяў* дзеяння, якія ўключаюць у сябе яго наступствы.

**368. Калі ўчынак з'яўляецца маральна добрым?**

Учынак маральна добры, калі добрымі адначасова з'яўля- 1755-1756
юцца яго прадмет, мэта і акалічнасці. Выбраны прадмет можа 1759-1760
адзін сапсаваць усё дзеянне, нават калі намер добры. Недапушчальна здзяйсняць зло, каб з яго выйшла дабро. Дрэнная мэта можа сапсаваць дзеянне, нават калі яго прадмет сам па сабе добры. Наадварот, добрая мэта не робіць добрым дзеянне, прадмет

якога дрэнны, паколькі мэта не апраўдвае сродкі. Акалічнасці могуць зменшыць ці павялічыць адказнасць таго, хто дзейнічае, але не могуць змяніць маральную якасць саміх дзеянняў, яны ніколі не могуць зрабіць добрай справу, якая сама па сабе ёсць злом.

**369. Ці існуюць дзеянні, якія заўсёды недапушчальныя?**

1756 1761 Існуюць дзеянні, выбар якіх заўсёды недапушчальны з прычыны іх прадмету (напр., блюзнерства, забойства, чужаложства). Выбар гэтых дзеянняў вядзе да неўпарадкаванасці волі, гэта значыць да маральнага зла, якое не можа быць апраўдана дабром, якое магло б быць іх вынікам.

## Маральнасць пачуццяў

**370. Што такое пачуцці?**

1762-1766 1771-1772 Пачуцці, эмоцыі ці парывы пачуццёвасці — усё гэта натуральныя элементы чалавечай псіхікі, якія пабуджаюць да дзеяння ці бяздзеяння ў залежнасці ад таго, успрымаецца гэта як дабро ці як зло. Асноўнымі сярод іх з'яўляюцца любоў і нянавісць, жаданне і боязь, радасць, смутак, гнеў. Самым галоўным пачуццём з'яўляецца любоў, выкліканая прывабнасцю дабра. Толькі дабро — рэальнае ці ўяўнае — можа быць умілаваным.

**371. Ці пачуцці з'яўляюцца маральна дрэннымі ці добрымі?**

1767-1770 1773-1775 Паколькі пачуцці — гэта праявы ўражлівасці, яны не з'яўляюцца добрымі ці дрэннымі самі па сабе: яны добрыя, калі садзейнічаюць добрай справе; у адваротным выпадку — дрэнныя. Яны могуць стаць цнотамі ці перамяніцца ў заганы.

## Сумленне

**372. Што такое сумленне?**

1776-1780 1795-1797 Сумленне, якое ёсць у глыбіні асобы, гэта суд розуму, які ў належны момант наказвае чалавеку рабіць дабро і пазбягаць зла. Дзякуючы гэтаму чалавечая асоба распазнае маральныя якасці

дзеяння, якое павінна быць ўчынена ці ўжо ўчынена, беручы на сябе адказнасць за яго. Слухаючы сумленне, разважлівы чалавек можа пачуць голас Бога, які прамаўляе да яго.

**373. У чым выяўляецца годнасць асобы адносна сумлення?**

Годнасць чалавечай асобы выяўляецца ў правільным сум- 1780-1782
ленні (сумленні, якое знаходзіцца ў згодзе з тым, што справяд- 1798
лівае і добрае паводле розуму і Божага закону). З прычыны той жа асабістай годнасці нельга змушаць чалавека дзейнічаць супраць сумлення або перашкаджаць яму, калі ён дзейнічае — у межах агульнага дабра — згодна са сваім сумленнем, асабліва ў рэлігійнай сферы.

**374. Як фарміраваць сумленне, каб яно было правільным і праўдзівым?**

Правільнае і праўдзівае сумленне фарміруецца праз выхаван- 1783-1788
не, засваенне Божага слова і навучанне Касцёла. Сумленне пад- 1799-1800
трымліваецца дарамі Духа Святога і атрымлівае дапамогу праз парады мудрых людзей. Акрамя таго, вялікую карысць у маральным фарміраванні прыносіць малітва і рахунак сумлення.

**375. Якімі нормамі павінна заўсёды кіравацца сумленне?**

Вось тры найбольш агульныя: 1) ніколі нельга рабіць зло, 1789
каб з яго вынікла дабро; 2) гэтак званае *залатое правіла*: «Усё, што хочаце, каб рабілі вам людзі, і вы ім рабіце» (Мц 7, 12); 3) любоў заўсёды зыходзіць з павагі да бліжняга і яго сумлення, аднак гэта не азначае, што трэба прымаць за дабро тое, што аб’ектыўна з’яўляецца злом.

**376. Ці можа сумленне мець памылковыя суджэнні?**

Асоба заўсёды павінна падпарадкоўвацца ўпэўненаму су- 1790-1794
джэнню свайго сумлення, але яна можа мець памылковыя су- 1801-1802
джэнні, пры гэтым не заўсёды не па ўласнай віне. Аднак, асобе не ставіцца ў віну зло, здзейсненае з-за ненаўмыснага няведання, нават калі яно аб’ектыўна застаецца злом. Таму неабходна прыкладаць намаганні, каб выпраўляць сумленне ад памылак.

## Цноты

### 377. Што такое цнота?

1803 Цнота — гэта звычайная і трывалая гатоўнасць чыніць даб-
1833 ро. «Мэта цнатлівага жыцця заключаецца ў прыпадабненні да Бога» (св. Грыгорый Назіянзскі). Ёсць цноты чалавечыя і цноты тэалагальныя.

### 378. Што такое чалавечыя цноты?

1804 Чалавечыя цноты — гэта звычайная і пастаянная дасканa-
1810-1811 ласць розуму і волі; яны рэгулююць нашыя дзеянні, упарадкоў-
1834 ваюць нашыя пачуцці і кіруюць нашымі паводзінамі ў адпавед-
1839 насці з розумам і верай. Набытыя і ўмацаваныя шматразовымі і добрымі з пункту гледжання маралі дзеяннямі, яны ачышчаюцца і ўзвышаюцца Божай ласкай.

### 379. Якія галоўныя чалавечыя цноты?

1805 Гэта цноты, якія называюцца таксама *кардынальнымі*, вакол
1834 якіх групуюцца ўсе іншыя і якія ствараюць падставы для цнатлівага жыцця. Гэта разважлівасць, справядлівасць, мужнасць, устрыманасць.

### 380. Што такое разважлівасць?

1806 Разважлівасць накіроўвае розум да распазнавання нашага
1835 сапраўднага дабра ў кожных акалічнасцях і да выбару адпаведных сродкаў яго ажыццяўлення. Яна кіруе іншымі цнотамі, указваючы ім прынцыпы і межы.

### 381. Што такое справядлівасць?

1807 Справядлівасць заключаецца ў нязменнай і трывалай волі
1836 даваць іншым тое, што ім належыць. Справядлівасць адносна Бога называецца «рэлігійнай цнотай».

**382. Што такое мужнасць?**

Мужнасць дае вытрымку ў цяжкасцях і пастаянства ў по- 1808
шуках дабра, робіць здольным да ахвяры з уласнага жыцця дзе- 1837
ля справядлівай справы.

**383. Што такое ўстрыманасць?**

Устрыманасць дазваляе апанаваць імкненне да прыемнас- 1809
цяў, забяспечвае перавагу волі над інстынктамі і робіць здоль- 1838
ным захоўваць раўнавагу ў карыстанні створанымі дабротамі.

**384. Што такое тэалагальныя цноты?**

Гэта цноты, якія маюць за пачатак, прычыну і непасрэдны 1812-1813
аб'ект самога Бога. Улітыя ў чалавека разам з асвячальнай лас- 1840-1841
кай, яны робяць яго здольным жыць у еднасці з Найсвяцейшай Тройцай, фарміруюць і натхняюць маральныя дзеянні хрысціяніна, ажыўляючы чалавечыя цноты. Тэалагальныя цноты — задатак прысутнасці і дзеяння Духа Святога ў здольнасцях чалавека.

**385. Якія ёсць тэалагальныя цноты?**

Тэалагальныя цноты — гэта вера, надзея і любоў. 1813

**386. Што такое вера?**

Вера — гэта тэалагальная цнота, дзякуючы якой мы верым 1814-1816
у Бога, ва ўсё, што Ён нам аб'явіў, і ў што прапануе нам верыць 1842
Касцёл, паколькі Бог ёсць самой Праўдай. Таму той, хто верыць, імкнецца пазнаць і выканаць Божую волю, бо «вера дзейнічае праз любоў» (Гал 5, 6).

**387. Што такое надзея?**

Надзея — гэта тэалагальная цнота, праз якую мы прагнем і 1817-1821
чакаем ад Бога вечнага жыцця як нашага шчасця, падмацоўва- 1843
ючы наш давер абяцаннямі Хрыста і атрымліваючы дапамогу праз ласку Духа Святога дзеля таго, каб заслужыць яго і вытрываць да канца зямнога жыцця.

**388. Што такое любоў?**

1822-1829 1844 Любоў — гэта тэалагальная цнота, дзякуючы якой мы любім Бога па-над усё, а свайго бліжняга — як самога сябе, дзеля любові да Бога. Езус учыніў яе новай запаведдзю, паўнатой Закону. Любоў з'яўляецца «повяззю дасканаласці» (Клс 3, 14) і падмуркам іншых цнотаў, якія яна ажыўляе, натхняе і ўпарадкоўвае: без яе «я — нішто» і, «калі любові не маю, няма мне з гэтага ніякай карысці» (1 Кар 13, 1–3).

**389. Што такое дары Духа Святога?**

1830-1831 1845 *Дары* Духа Святога — гэта пастаянная гатоўнасць, якая робіць чалавека здольным пайсці за Божым натхненнем. Гэтых дароў сем: мудрасць, розум, рада, мужнасць, умеласць, пабожнасць, боязь Божая.

**390. Што такое плады Духа Святога?**

1832 *Плады* Духа Святога — гэта дасканаласці, якія Ён фарміруе ў нас як першыя плады вечнай хвалы. Традыцыя Касцёла налічвае іх дванаццаць: «любоў, радасць, спакой, доўгацярплівасць, спагадлівасць, дабрыня, велікадушнасць, вернасць, лагоднасць, сціпласць, умеркаванасць, чыстасць» (Гал 5, 22–23, пераклад з Вульгаты).

## Грэх

**391. Чаго патрабуе ад нас прыняцце Божай міласэрнасці?**

1846-1848 1870 Яно патрабуе, каб мы прызналі свае правіны і пакаяліся ў сваіх грахах. Сам Бог праз сваё Слова і свайго Духа адкрывае нашыя грахі, адорвае нас праўдай сумлення і надзеяй на прабачэнне.

**392. Што такое грэх?**

1849-1851 1871-1872 Грэх — гэта «слова, учынак ці жаданне, якое супярэчыць вечнаму Закону» (св. Аўгустын). Гэта знявага Бога праз непаслух-

мянасць Яго любові. Грэх раніць чалавечую натуру і наносіць шкоду чалавечай салідарнасці. Хрыстус сваёй мукай раскрывае ўвесь цяжар граху і перамагае яго сваёй міласэрнасцю.

**393. Ці існуе адрозненне грахоў?**

Ёсць розныя грахі. Яны могуць адрозніваццa паводле іх прадмету ці паводле цнотаў або запаведзяў, якім яны супярэчаць. Грахі могуць датычыць непасрэдна Бога, бліжняга ці нас саміх. Акрамя таго, іх можна падзяліць на грахі, здзейсненыя думкаю, словам, учынкам і занядбаннем. 1852-1853 1873

**394. Як адрозніваюць грахі паводле іх цяжкасці?**

Адрозніваюць грахі смяротныя і лёгкія. 1854

**395. Калі мае месца смяротны грэх?**

Смяротны грэх мае месца тады, калі ён адначасова датычыць значнай матэрыі і здзяйсняецца ў поўнай свядомасці і добраахвотна. Гэты грэх знішчае ў нас любоў, пазбаўляе нас асвячальнай ласкі, вядзе нас да вечнай смерці ў пекле, калі мы не пакаемся. Прабачаецца звычайным спосабам праз сакрамэнт хросту і сакрамэнт пакаяння, або паяднання. 1855-1861 1874

**396. Калі мае месца лёгкі грэх?**

Лёгкі грэх, які істотна адрозніваецца ад смяротнага граху, мае месца тады, калі датычыць нязначнай матэрыі або нават значнай, але здзяйсняецца без поўнай свядомасці ці без цалкавітай згоды. Ён не знішчае запавету з Богам, але аслабляе любоў; выяўляе неўпарадкаваную прывязанасць да створаных даброт; перашкаджае духоўнаму развіццю і набыванню цнотаў, а таксама практыкаванню маральнага дабра; заслугоўвае часовыя ачышчальныя кары. 1862-1864 1875

**397. Як у нас памнажаецца грэх?**

Грэх цягне за сабой грэх, а яго паўтарэнне нараджае загану. 1865 1876

**398. Што такое заганы?**

1866-1867 Заганы, у адрозненне ад цнотаў, — гэта дрэнныя звычкі, якія зацямняюць сумленне і схіляюць да зла. Заганы могуць быць звязаныя з сямю так званымі *галоўнымі* грахамі: пыхай, хцівасцю, зайздрасцю, гневам, распустай, неўмеркаванасцю ў ежы і піцці, лянотай ці нудой.

**399. Ці нясем мы адказнасць за грахі, учыненыя іншымі?**

1868 Мы нясем адказнасць за грахі, учыненыя іншымі, калі садзейнічаем ім.

**400. Што такое *структуры* граху?**

1869 Гэта грамадскія сітуацыі або інстытуцыі, якія супярэчаць Божаму закону; яны з'яўляюцца праявай і вынікам асабістых грахоў.

## ГЛАВА ДРУГАЯ
# ЧАЛАВЕЧАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ

### Асоба і грамадства

**401. У чым заключаецца грамадскае вымярэнне чалавека?**

1877-1880
1890-1891 Разам з асабістым пакліканнем да шчасця, чалавеку ўласціва грамадскае вымярэнне, якое з'яўляецца істотным кампанентам яго натуры і яго паклікання. Сапраўды, усе людзі пакліканыя да адной і той жа мэты, якой ёсць сам Бог; існуе пэўнае падабенства паміж супольнасцю Божых Асобаў і братэрствам, якое людзі павінны ўстанаўліваць паміж сабою ў праўдзе і любові; любоў да бліжняга неадрыўная ад любові да Бога.

**402. Якая сувязь існуе паміж асобай і грамадствам?**

1881-1882
1892-1893 Прынцыпам, суб'ектам і мэтай усіх грамадскіх інстытуцый з'яўляецца і павінна быць *асоба*. Некаторыя супольнасці, такія, як сям'я і дзяржава, неабходныя для чалавечай асобы. Карысныя таксама і іншыя аб'яднанні, як у межах палітычных

супольнасцяў, так і на міжнародным узроўні, якія кіруюцца прынцыпам *субсідыярнасці*.

**403. У чым заключаецца прынцып субсідыярнасці?**

Гэты прынцып заключаецца ў тым, што грамадства вышэй- 1883-1885
шага ўзроўню не павінна ўмешвацца ў справы грамадства 1894
ніжэйшага ўзроўню, пазбаўляючы яго паўнамоцтваў, але павінна падтрымліваць яго ў выпадку неабходнасці.

**404. Чаго яшчэ патрабуе сапраўднае чалавечае суіснаванне?**

Яно патрабуе паважаць справядлівасць і адпаведную іерар- 1886-1889
хію каштоўнасцяў, а таксама падпарадкоўваць матэрыяльныя і 1895-1896
інстынктыўныя вымярэнні ўнутраным і духоўным. Асабліва там, дзе грэх псуе грамадскі клімат, неабходна заклікаць да навяртання сэрцаў і да ласкі Божай, каб дасягнуць грамадскіх змен, якія б сапраўды служылі кожнай асобе і яе інтэгральнасці. Любоў, якая патрабуе справядлівасці і робіць здольнымі практыкаваць яе, з'яўляецца найвялікшай грамадскай запаведдзю.

## Удзел у грамадскім жыцці

**405. На чым грунтуецца ўлада ў грамадстве?**

Кожная чалавечая супольнасць патрабуе законна ўстаноў- 1897-1902
ленай улады, якая забяспечвае парадак і садзейнічае ажыццяў- 1918-1920
ленню агульнага дабра. Такая ўлада грунтуецца на чалавечай натуры, таму што адпавядае парадку, устаноўленаму Богам.

**406. Калі ўлада здзяйсняецца законна?**

Улада здзяйсняецца законна, калі дзейнічае дзеля агульна- 1901
га дабра і выкарыстоўвае для яго дасягнення дапушчальныя з 1903-1904
пункту гледжання маралі сродкі. Таму палітычныя рэжымы 1921-1922
павінны быць вызначаныя свабодным рашэннем грамадзян і павінны адпавядаць прынцыпу «прававой дзяржавы», у якой вярхоўную ўладу мае закон, а не самаволя людзей. Несправядлівыя законы і рашэнні, якія супярэчаць маральнаму парадку, не абавязковыя для сумлення.

**407. Што такое агульнае дабро?**

1905-1906 1924 Агульнае дабро — гэта сукупнасць тых умоў грамадскага жыцця, якія дазваляюць групам і адзінкам дасягаць асабістай дасканаласці.

**408. Што ўваходзіць у агульнае дабро?**

1907-1909 1925 У агульнае дабро ўваходзіць: шанаванне і падтрымка асноўных правоў асобы; узрастанне духоўных і зямных дабротаў асобы і грамадства; спакой і бяспека ўсіх.

**409. Дзе найбольш поўна здзяйсняецца агульнае дабро?**

1910-1912 1927 Найбольш поўна агульнае дабро здзяйсняецца ў тых палітычных супольнасцях, якія абараняюць і развіваюць дабро грамадзян і сацыяльных груп, не забываючы пра ўсеагульнае дабро чалавечай сям'і.

**410. Як чалавек удзельнічае ў ажыццяўленні агульнага дабра?**

1913-1917 1926 Кожны чалавек згодна са сваёй пасадай і роляй, якую ён выконвае, удзельнічае ў развіцці агульнага дабра, калі паважае справядлівыя законы і клапоціцца аб сферах, за якія нясе асабістую адказнасць, такіх як уласная сям'я і ўласная праца. Больш за тое, грамадзяне, наколькі гэта магчыма, павінны прымаць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.

## Грамадская справядлівасць

**411. Як грамадства забяспечвае грамадскую справядлівасць?**

1928-1933 1943-1944 Грамадства забяспечвае грамадскую справядлівасць, калі паважае свабоду і правы асобы, што з'яўляецца мэтай самога грамадства. Больш за тое, грамадства імкнецца да грамадскай справядлівасці, звязанай з агульным дабром і ажыццяўленнем улады, калі стварае ўмовы, якія дазваляюць аб'яднанням і асобам дасягнуць таго, на што яны маюць права.

## 412. На чым грунтуецца роўнасць паміж людзьмі?

Усе людзі маюць аднолькавую годнасць і асноўныя правы, паколькі створаны паводле вобраза адзінага Бога і адораны адной і той жа разумнай душой; маюць адну і тую ж натуру і паходжанне і пакліканыя ў Хрысце, адзіным Збаўцы, да аднаго і таго ж боскага шчасця. 1934-1935 1945

## 413. Як ацэньваць няроўнасць паміж людзьмі?

Існуе несправядлівая эканамічная і грамадская няроўнасць, якая закранае мільёны людзей; яна, безумоўна, спрэчная з Евангеллем, супярэчыць справядлівасці, годнасці асобы, спакою. Але існуюць таксама адрозненні паміж людзьмі, выкліканыя рознымі фактарамі, якія ўваходзяць у Божы план. Сапраўды, Бог хоча, каб кожны атрымліваў ад іншых тое, што яму патрэбна, і каб тыя, у каго ёсць асаблівыя «таленты», дзяліліся імі з іншымі. Гэтыя адрозненні натхняюць, а часта і абавязваюць асобы быць велікадушнымі, добразычлівымі, шчодрымі, яны таксама заахвочваюць культуры да ўзаемнага ўзбагачэння. 1936-1938 1946-1947

## 414. У чым выяўляецца чалавечая салідарнасць?

Салідарнасць, якая вынікае з чалавечага і хрысціянскага братэрства, выяўляецца найперш у справядлівым размеркаванні дабротаў, у справядлівым узнагароджванні за працу і ў абавязку будаваць больш справядлівы грамадскі лад. *Цнота* салідарнасці рэалізуецца таксама ў сумесным карыстанні духоўнымі дабротамі веры, яшчэ больш важнымі, чым матэрыяльныя. 1939-1942 1948

## ГЛАВА ТРЭЦЯЯ

# БОЖАЕ ЗБАЎЛЕННЕ: ЗАКОН І ЛАСКА

## Маральны закон

### 415. Што такое маральны закон?

1950-1953 Маральны закон — гэта справа Божай мудрасці. Ён указвае
1975-1978 чалавеку шляхі і нормы паводзінаў, якія вядуць да абяцанага шчасця, і забараняе дарогі, якія аддаляюць ад Бога.

### 416. У чым заключаецца натуральны маральны закон?

1954-1960 Натуральны закон, упісаны Стварыцелем у сэрца кожнага
1978-1979 чалавека, заключаецца ва ўдзеле ў мудрасці і дабрыні Бога і выяўляе першапачатковы маральны сэнс, які дазваляе чалавеку з дапамогай розуму распазнаваць дабро і зло. Натуральны маральны закон усеагульны і нязменны, ён стварае падмурак асноўных абавязкаў і правоў асобы, а таксама чалавечай супольнасці і самога грамадзянскага закону.

### 417. Ці ўсе ўспрымаюць гэты закон?

1960 З прычыны граху натуральны закон не заўсёды і не ўсімі ўспрымаецца з аднолькавым разуменнем і непасрэднасцю.

> *«Бог напісаў на таблiцах Закону тое, чаго людзі не здолелі прачытаць у сваіх сэрцах»* (св. Аўгустын).

### 418. Якая сувязь паміж натуральным законам і Старым Законам?

1961-1962 Стары Закон з’яўляецца першай стадыяй аб’яўленага Зако-
1980 ну. Ён падае мноства праўдаў, якія натуральным чынам даступныя розуму і якія былі змешчаныя і сапраўды пацверджаныя ў запавеце збаўлення. Маральныя патрабаванні, падсумаваныя ў дзесяці запаведзях Дэкалогу, ствараюць падмурак чалавечага паклікання, яны забараняюць тое, што супярэчыць любові да Бога і бліжняга, і прадпісваюць тое, што істотнае для яе.

### 419. Якое месца займае Стары Закон у плане збаўлення?

Стары Закон дазваляе зразумець шмат праўдаў, даступных розуму, указвае тое, што павінна быць зроблена, а што — не, і перадусім, як мудры настаўнік, рыхтуе і схіляе да навяртання і прыняцця Евангелля. Хоць Стары Закон святы, духоўны і добры, аднак ён усё ж недасканалы, бо сам па сабе не адорвае моцай і ласкай Духа для яго выканання. 1963-1964 1982

### 420. Што такое Новы, або евангельскі Закон?

Новы, або евангельскі Закон, абвешчаны і здзейснены Хрыстом, з'яўляецца паўнатой і спаўненнем Божага закону, натуральнага і аб'яўленага. Ён падсумаваны ў запаведзі любіць Бога і бліжняга, любіць адзін аднаго так, як Хрыстус палюбіў нас; ён з'яўляецца таксама рэчаіснасцю, якая існуе ў чалавеку: ласка Духа Святога робіць нас здольнымі да такой любові. Гэта «закон свабоды» (Як 1, 25), бо вядзе да спантаннага дзеяння пад уплывам любові. 1965-1972 1983-1985

*«Новы Закон з'яўляецца, галоўным чынам, самой ласкай Духа Святога, якая дадзена тым, хто верыць у Хрыста»* (св. Тамаш Аквінскі).

### 421. Дзе знаходзіцца Новы Закон?

Новы Закон знаходзіцца ва ўсім жыцці і прапаведванні Хрыста і ў маральных катэхезах Апосталаў; галоўным чынам — у Казанні на гары. 1971-1974 1986

## Ласка і апраўданне

### 422. Што такое апраўданне?

Апраўданне — гэта самая дасканалая справа Божай любові. Гэта міласэрнае і бескарыслівае дзеянне Бога, якое знішчае нашыя грахі і робіць нас справядлівымі і святымі ва ўсім нашым існаванні. Гэта адбываецца праз ласку Духа Святога, якая была заслужана мукай Хрыста і дадзена нам падчас хросту. Апраўданне дае пачатак свабоднаму адказу чалавека, гэта значыць веры ў Хрыста і супрацоўніцтву з ласкай Духа Святога. 1987-1995 2017-2020

**423. Што такое ласка, якая апраўдвае?**

1996-1998 2005 2021 Ласка — гэта бескарыслівы дар, які Бог дае нам, каб зрабіць нас удзельнікамі свайго трынітарнага жыцця і здольнымі дзейнічаць дзякуючы Яго любові. Яна называецца *ласкай габітуальнай*, або *асвячальнай*, або *абагаўляльнай*, бо нас асвячае і абагаўляе. Яна *звышпрыродная*, бо цалкам залежыць ад бескарыслівай ініцыятывы Бога і пераўзыходзіць здольнасць разумення і сілы чалавека. Таму яна недасяжная для нашага досведу.

**424. Якія існуюць іншыя віды ласкі?**

1999-2000 2003-2004 2023-2024 Акрамя габітуальнай ласкі, існуюць: дзейсныя (актуальныя) ласкі (акалічнасныя дары); сакрамэнтальныя ласкі (уласныя дары кожнага сакрамэнту); спецыяльныя ласкі ці харызмы (маюць на мэце агульнае дабро Касцёла), сярод якіх трэба вылучыць ласкі стану, якія суправаджаюць выкананне касцёльнага служэння і адказных жыццёвых заданняў.

**425. Якая існуе сувязь паміж ласкай і свабодай чалавека?**

2001-2002 Ласка апярэджвае, рыхтуе і выклікае свабодны адказ чалавека. Яна адпавядае глыбокім імкненням чалавечай свабоды, запрашае яе да супрацоўніцтва і вядзе да дасканаласці.

**426. Што такое заслуга?**

2006-2010 2025-2026 Заслуга — гэта тое, што дае права на ўзнагароду за добры ўчынак. У адрозненне ад Бога, чалавек сам па сабе нічога не можа заслужыць, бо ўсё атрымаў ад Яго ў дар. Тым не менш, Бог дае чалавеку магчымасць набыць заслугі праз з’яднанне з любоўю Хрыста, крыніцай нашых заслуг перад Богам. Таму заслугі добрых учынкаў перш за ўсё павінны быць прыпісаны Божай ласцы, а затым — вольнай волі чалавека.

**427. Якія даброты мы можам заслужыць?**

2010-2011 2027 Пад уздзеяннем Духа Святога мы можам заслужыць для саміх сябе ці для іншых ласкі, неабходныя для нашага асвячэння і дасягнення вечнага жыцця, а таксама часовыя даброты, належ-

ныя нам паводле Божага намеру. Ніхто не можа заслужыць *першай ласкі*, якая ёсць крыніцай навяртання і апраўдання.

### 428. Ці ўсе мы пакліканыя да хрысціянскай святасці?

Усе вернікі пакліканыя да хрысціянскай святасці. Яна з'яўляецца паўнатой хрысціянскага жыцця і дасканаласцю любові; здзяйсняецца ў глыбокай еднасці з Хрыстом, а ў Ім — з Найсвяцейшай Тройцай. Шлях да асвячэння хрысціяніна вядзе праз крыж і мае сваё завяршэнне ў канчатковым уваскрашэнні справядлівых, у якім Бог будзе ўсё ва ўсім. 2012-2016 2028-2029

## Касцёл — Маці і Настаўнік

### 429. Якім чынам Касцёл жывіць маральнае жыццё хрысціяніна?

Касцёл — гэта супольнасць, дзе хрысціянін прымае Божае слова і настаўленні «Хрыстовага Закону» (Гал 6, 2); атрымлівае ласку сакрамэнтаў; яднаецца з эўхарыстычнай Ахвярай Хрыста такім чынам, што яго маральнае жыццё становіцца духоўным пакланеннем; вучыцца на прыкладзе святасці Дзевы Марыі і святых. 2030-2031 2047

### 430. Чаму Настаўніцкі Інстытут Касцёла навучае аб справах маральнасці?

Таму што абавязкам Настаўніцкага Інстытута Касцёла з'яўляецца прапаведванне веры і заахвочванне да яе практыкавання ў жыцці. Гэты абавязак распасціраецца таксама на канкрэтныя прадпісанні натуральнага закону, бо іх выкананне неабходна для збаўлення. 2032-2040 2049-2051

### 431. Якая мэта касцёльных наказаў?

Пяць касцёльных наказаў маюць на мэце гарантаваць вернікам неабходны мінімум духа малітвы, сакрамэнтальнага жыцця, маральнага намагання і ўзрастання ў любові да Бога і бліжняга. 2041 2048

### 432. Якія ёсць касцёльныя наказы?*

2042-2043 Гэта: 1) удзельнічаць у Імшы ў нядзелі і ў іншыя прадпісаныя святы і ўстрымліваца ад працы і дзейнасці, якая б магла перашкодзіць святкаванню гэтых дзён; 2) вызнаваць уласныя грахі, прымаючы сакрамэнт паяднання, прынамсі раз у год; 3) прыступаць да сакрамэнту Эўхарыстыі прынамсі ў Велікодны перыяд; 4) устрымліваца ад спажывання мяса і захоўваць пост ва ўстаноўленыя Касцёлам дні; 5) дапамагаць у матэрыяльных патрэбах Касцёла паводле ўласных магчымасцяў.

### 433. Чаму маральнае жыццё хрысціяніна неабходна для абвяшчэння Евангелля?

2044-2046 Таму што сваім жыццём, згодным з вучэннем Пана Езуса, хрысціяне прыцягваюць людзей да веры ў сапраўднага Бога, будуюць Касцёл, фарміруюць свет у духу Евангелля і прыспешваюць прыйсце Божага Валадарства.

* Касцёльныя наказы, прынятыя Канферэнцыяй Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, пададзеныя ў Дадатку.

РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

# ДЗЕСЯЦЬ ЗАПАВЕДЗЯЎ



Малады чалавек задаў Езусу такое пытанне: «Настаўнік, што добрага зрабіць мне, каб мець жыццё вечнае?» (Мц 19, 16). Езус яму адказаў: «Калі хочаш увайсці ў жыццё вечнае, захоўвай запаведзі», і пасля дадаў: «Прыходзь і ідзі за Мною» (Мц 19, 17.21).

Наследаванне Езуса заключаецца ў выкананні запаведзяў. Стары Закон не адменены, але чалавек запрошаны адкрыць яго нанова ў асобе боскага Настаўніка, які сам дасканала спаўняе яго, аб'яўляе яго поўны сэнс і пацвярджае яго даўгавечнасць.

Абраз на пачатку гэтага раздзела паказвае Езуса, які настаўляе вучняў падчас так званага *Казання на гары* (пар. Мц 5–7). Найбольш важнымі элементамі гэтага навучання з'яўляюцца: благаслаўленні, удасканаленне Старога Закону, малітва *Ойча наш*, прадпісанні наконт посту, заклік вучняў быць соллю зямлі і святлом свету.

Гара, якая ўзвышаецца над зямлёй і дасягае неба, указвае на прывілеяванае месца для сустрэчы з Богам. Езус Настаўнік, седзячы на скале, як на прывілеяванай катэдры, указальным пальцам правай рукі, скіраванай да неба, указвае на боскае паходжанне сваіх слоў пра жыццё і шчасце. Скрутак, які Езус сціскае ў левай руцэ, указвае на завершанасць Яго вучэння, якое Ён з верай даручае Апосталам, заклікаючы іх абвяшчаць Евангелле ўсім народам, хрысцячы іх у імя Айца і Сына, і Духа Святога.

Дванаццаць Апосталаў, якія акружаюць Настаўніка і сядзяць каля Ягоных ног, маюць арэолы, што ўказвае на іх вернасць Езусу і на іх сведчанне святасці ў Касцёле. Толькі адзін з Апосталаў, з правага боку, напалову схаваны, мае чорны арэол, што сведчыць пра яго бязвер'е ў Добрую Навіну. Абвяшчэнне Божага Валадарства, якое прапаведваў Езус, было не пустымі, беспадстаўнымі словамі, але дзейснай і годнай справай. Пацвярджае гэта эпізод пра паралізаванага з Кафарнаума, перададзены трыма Сіноптыкамі:

«Езус увайшоў у човен і пераправіўся ў свой горад. І вось прынеслі да Яго паралізаванага, пакладзенага на ложа. Убачыўшы іхнюю веру, Езус сказаў паралізаванаму: "Будзь адважным, сыне, адпускаюцца табе грахі". І вось некаторыя кніжнікі сказалі самі сабе: "Ён блюзнерыць". А Езус, убачыўшы думкі іхнія, сказаў: "Навошта задумваеце зло ў сэрцах вашых? Бо што лягчэй сказаць "адпускаюцца табе грахі", або сказаць "устань і хадзі"? Але каб вы ведалі, што Сын Чалавечы мае ўладу на зямлі дараваць грахі". Пасля сказаў паралізаванаму: "Устань, вазьмі ложа сваё і ідзі дадому". Той устаў і пайшоў дадому» (Мц 9, 1–7).

У гэтым выпадку фізічнае аздараўленне ёсць ні чым іншым, як бачным аспектам духоўнага цуду вызвалення ад граху. Аздараўленне і прабачэнне застаюцца тыповымі знакамі педагогікі Езуса, боскага Настаўніка.

---

Бэата Анджэліка. *Казанне на гары*. Фларэнцыя, Музей Сан-Марка

| Кніга Зыходу 20, 2-17 | Кніга Другазаконня 5, 6-21 | Катэхетычная формула |
|---|---|---|
| Я — Пан Бог твой, які вывеў цябе з зямлі егіпецкай, з дому няволі. | Я — Пан Бог твой, які вывеў цябе з зямлі егіпецкай з дому няволі. | Я — Пан Бог твой, які вывеў цябе з зямлі егіпецкай, з дому няволі. |
| Не май іншых багоў, апроч Мяне.<br>Не рабі сабе ніякай выявы ідала і падабенства таго, што ўверсе на небе, што ўнізе на зямлі і што ў водах пад зямлёю.<br>Не пакланяйся ім і не ўшаноўвай іх.<br>Бо Я — Пан Бог твой, Бог зайздросны, які карае дзяцей за беззаконне бацькоў да трэцяга і чацвёртага пакалення тых, хто ненавідзіць Мяне. Але Я выяўляю міласэрнасць да тысяч пакаленняў тых, хто любіць Мяне і захоўвае запаведзі Мае. | Не будзе ў цябе іншых багоў, апроч Мяне ... | 1. Не май іншых багоў, апроч Мяне. |
| Не ўжывай імя Пана Бога твайго дарэмна, бо Пан не пакіне без пакарання таго, хто ўжывае імя Ягонае дарэмна. | Не ўжывай імя Пана Бога твайго дарэмна ... | 2. Не ўжывай імя Пана Бога дарэмна. |

| | | |
|---|---|---|
| Памятай пра дзень шабату, каб асвячаць яго. Шэсць дзён будзеш працаваць і рабіць усе працы свае, а сёмы дзень, шабат, — для Пана Бога твайго; не рабі ніякай працы ні ты, ні сын твой, ні дачка твая, ні твой нявольнік, ні твая нявольніца, ні жывёла твая, ні чужынец, які знаходзіцца ў брамах тваіх. Бо за шэсць дзён учыніў Пан неба і зямлю, і мора, і ўсё, што ў іх, і на сёмы дзень адпачыў. Таму благаславіў Пан дзень шабату і асвяціў яго. | Захоўвай дзень шабату, каб ён быў святым ... | 3. Памятай дзень святы святкаваць. |
| Шануй бацьку свайго і маці сваю, каб доўга жыць на зямлі, якую Пан Бог твой дасць табе. | Шануй бацьку свайго і маці сваю ... | 4. Шануй бацьку свайго і маці сваю. |
| Не забівай. | Не забівай. | 5. Не забівай. |
| Не чужалож. | Не чужалож. | 6. Не чужалож. |
| Не крадзі. | Не крадзі. | 7. Не крадзі. |
| Не сведчы фальшыва супраць бліжняга свайго. | Не гавары супраць бліжняга твайго фальшывага сведчання. | 8. Не сведчы фальшыва супраць бліжняга твайго. |
| Не пажадай дому бліжняга свайго; не пажадай ні жонкі яго, ні ягонага нявольніка, ні ягонай нявольніцы, ні вала ягонага, ні асла ягонага — нічога, што належыць яму. | Не жадай жонкі бліжняга Твайго ... і ўсяго, што належыць бліжняму твайму. | 9. Не пажадай жонкі бліжняга твайго.<br>10. Не пажадай нічога, што належыць бліжняму твайму. |

### 434. «Настаўнік, што добрага зрабіць мне, каб мець жыццё вечнае?» (Мц 19, 16)

Юнаку, які задаў гэтае пытанне, Езус адказвае: «Калі хочаш увайсці ў жыццё вечнае, выконвай запаведзі», і пасля дадае: «Прыходзь і ідзі за Мною» (Мц 19, 16.21). Наследаванне Езуса заключаецца ў захаванні запаведзяў. Закон не адменены, але чалавек запрошаны адкрыць яго нанова ў асобе боскага Настаўніка, які сам дасканала спаўняе яго, аб’яўляе яго поўнае значэнне і пацвярджае яго даўгавечнасць. 2052-2054 2075-2076

### 435. Як Езус інтэрпрэтуе Закон?

Езус інтэрпрэтуе яго ў святле падвойнай і адзінай запаведзі любові, якая ёсць выкананнем Закону: «Любі Пана Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёй душой тваёй, і ўсім розумам тваім. Гэта найбольшая і першая запаведзь. Другая ж — падобная да яе: любі бліжняга твайго, як самога сябе. На гэтых дзвюх запаведзях грунтуецца ўвесь Закон і Прарокі» (Мц 22, 37–40). 2055

### 436. Што азначае выраз «Дэкалог»?

Выраз «Дэкалог» азначае «дзесяць слоў» (Зых 34, 28). Гэтыя словы падсумоўваюць Закон, дадзены Богам ізраэльскаму народу праз Майсея ў кантэксце Запавету. Дэкалог, прадстаўляючы запаведзі любові да Бога (першыя тры) і да бліжняга (наступныя сем), указваюць выбранаму народу і кожнаму чалавеку асабіста шлях жыцця, вызваленага з няволі граху. 2056-2057

### 437. Якая сувязь Дэкалогу з Запаветам?

Дэкалог разумеецца ў святле Запавету, у якім Бог аб’яўляецца, даючы пазнаць сваю волю. У захаванні Запавету народ выяўляе сваю прыналежнасць да Бога і з удзячнасцю адказвае на Яго ініцыятыву любові. 2058-2063 2077

### 438. Якое значэнне надае Касцёл Дэкалогу?

Верны Пісанню і прыкладу Езуса, Касцёл прызнае важнасць і першараднае значэнне Дэкалогу. Хрысціяне абавязаны выконваць яго. 2064-2068

### 439. Чаму Дэкалог складае непадзельнае адзінства?

2069 Дзесяць запаведзяў складаюць арганічную і непадзельную
2079 цэласнасць, бо кожная з запаведзяў адсылае да іншых і да ўсяго Дэкалогу. Таму парушэнне адной запаведзі азначае парушэнне ўсяго Закону.

### 440. Чаму Дэкалог мае абавязковы характар?

2072-2073 Таму што выражае асноўныя абавязкі чалавека адносна Бога
2081 і адносна бліжняга.

### 441. Ці магчыма захоўваць Дэкалог?

2074 Так, бо Хрыстус, без якога мы нічога не можам зрабіць,
2082 чыніць нас здольнымі захоўваць яго дзякуючы дару свайго Духа і сваёй ласкі.

## ГЛАВА ПЕРШАЯ

## «ЛЮБІ ПАНА БОГА ТВАЙГО ЎСІМ СЭРЦАМ ТВАІМ, І ЎСЁЙ ДУШОЙ ТВАЁЙ, І ЎСІМ РОЗУМАМ ТВАІМ»

### Першая запаведзь: Я — Пан Бог твой. Не май іншых багоў, апроч мяне

### 442. Да чаго абавязвае сцвярджэнне Бога: «Я — Пан Бог твой» (Зых 20, 2)?

2083-2094 Яно абавязвае верніка захоўваць і здзяйсняць тры тэала-
2133-2134 гальныя цноты і пазбягаць грахоў, якія ім супрацьстаяць. *Вера* верыць у Бога і адкідае тое, што ёй супярэчыць, напр., добраахвотныя сумненні, бязвер'е, ерась, адступніцтва, схізму. *Надзея* з даверам чакае шчаслівага сузірання Бога і Яго дапамогі, пазбягаючы роспачы і саманадзейнасці. *Любоў* любіць Бога панад усё, адкідаючы абыякавасць, няўдзячнасць, халоднасць, духоўную нуду або ляноту і нянавісць да Бога, якая нараджаецца з пыхі.

### 443. Да чаго абавязваюць словы Пана: «Пану Богу твайму пакланяйся і Яму аднаму служы» (Мц 4, 10)?

Яны абавязваюць пакланяцца Богу як Пану ўсяго, што існуе; аддаваць Яму, індывідуальна і супольна, належную пашану; маліцца да Яго, выказваючы праслаўленне, падзяку і просьбы; прыносіць Яму ахвяры з уласнага жыцця, асабліва духоўныя, злучаючы іх з дасканалай ахвярай Хрыста; стрымліваць дадзеныя Яму абяцанні. 2095-2105 2135-2136

### 444. Якім чынам асоба ажыццяўляе сваё права аддаваць пашану Богу ў праўдзе і свабодзе?

Кожны чалавек мае права і абавязак шукаць праўду, асабліва тую, якая датычыць Бога і Яго Касцёла, каб, пазнаўшы яе аднойчы, прыняць яе і верна захоўваць, аддаючы Богу сапраўдную пашану. У той жа час, годнасць чалавечай асобы патрабуе, каб у рэлігійных справах ніхто не быў прымушаны дзейнічаць супраць уласнага сумлення; каб не меў перашкоды, у справядлівых межах грамадскага парадку, дзейнічаць згодна з сумленнем, прыватна ці публічна, індывідуальна ці разам з іншымі. 2104-2109 2137

### 445. Што забараняе Бог, калі наказвае: «Не май іншых Багоў, апроч Мяне» (Зых 20, 2)?

Гэтая запаведзь забараняе: 2110-2128 2138-2140

*політэізм* і *ідалапаклонства*, якое абагаўляе стварэнне, моц, багацце і нават д'ябла;

*забабоны*, якія з'яўляюцца адыходам ад належнага пакланення Богу і якія выяўляюцца таксама ў розных формах прадказанняў, магіі, чараўніцтва і спірытызму;

*бязбожнасць*, якая выяўляецца ў выпрабаванні Бога словамі ці ўчынкамі; у святатацтве, якое апаганьвае святыя асобы ці рэчы, перадусім Эўхарыстыю; у сімоніі, гэта значыць, у жаданні або імкненні набываць або прадаваць духоўныя даброты;

*атэізм*, які адмаўляе існаванне Бога, грунтуючыся часта на памылковай канцэпцыі чалавечай аўтаноміі;

*агнастыцызм*, паводле якога немагчыма штосьці ведаць пра Бога, і які ўключае абыякавасць і практычны атэізм.

### 446. Ці наказ Бога: «Не рабі сабе ніякай выявы ідала...» (Зых 20, 3) забараняе культ абразоў?

2129-2132 2141 У Старым Запавеце гэты наказ забараняў прадстаўляць Бога, абсалютна трансцэндэнтнага. Пачынаючы ад уцелаўлення Божага Сына, хрысціянскі культ святых абразоў апраўданы тым (гэта пацвярджае ІІ Нікейскі Сабор 787 г.), што грунтуецца на таямніцы Божага Сына, які стаўся чалавекам, у якім трансцэндэнтны Бог стаў бачным. Гаворка ідзе не пра пакланенне абразам, але пра ўшанаванне тых, каго яны прадстаўляюць: Хрыста, Дзеву Марыю, анёлаў і святых.

## Другая запаведзь: Не ўжывай імя Пана Бога твайго дарэмна

### 447. Як ушаноўваецца святасць Божага імя?

2142-2149 2160-2162 Святое імя Бога ўшаноўваецца, калі мы яго заклікаем, блаславяем, усхваляем, праслаўляем. Таму трэба пазбягаць злоўжывання зваротам да імя Бога дзеля апраўдання злачынства і кожнага неадпаведнага ўжывання Ягонага імя: *блюзнерства*, якое па сваёй сутнасці з'яўляецца цяжкім грахом; *праклляцьцяў* і *нявернасці* абяцанням, дадзеным у імя Бога.

### 448. Чаму забараняецца фальшывая клятва?

2150-2151 2163-2164 Таму што ў ёй Бог, які ёсць самой Праўдай, заклікаецца як сведка хлусні.

> *«Не прысягай ні Стварыцелем, ні стварэннем, калі толькі не дзеля праўды, па-неабходнасці і з пашанаю»* (св. Ігнацый Лаёла).

### 449. Што такое фальшывая клятва?

2152-2155 Фальшывая клятва — гэта абяцанне, дадзенае пад прысягай з намерам не стрымаць яго, або парушэнне абяцання, дадзенага пад прысягай. Гэта цяжкі грэх супраць Бога, які заўсёды верны сваім абяцанням.

## Трэцяя запаведзь: Памятай дзень святы святкаваць

**450. Чаму Бог «благаславіў дзень шабату і асвяціў яго» (Зых 20, 11)?** 2168-2172 2189

Таму што ў дзень шабату ўспамінаецца *адпачынак Бога* ў сёмы дзень стварэння, а таксама вызваленне Ізраэля з егіпецкай няволі і запавет, які Бог заключыў са сваім народам.

**451. Як ставіцца Езус да шабату?** 2173

Езус прызнае святасць шабату і з боскім аўтарытэтам дае праўдзівае яго тлумачэнне: «Шабат устаноўлены для чалавека, а не чалавек для шабату» (Мк 2, 27).

**452. Чаму ў хрысціянаў нядзеля замяніла шабат?** 2174-2176 2190-2191

Таму што нядзеля — гэта дзень уваскрасення Хрыста. Як «першы дзень тыдня» (Мк 16, 2) ён нагадвае аб першым стварэнні; як «восьмы дзень», які ідзе за шабатам, ён азначае новае стварэнне, якому дало пачатак уваскрасенне Хрыста. Такім чынам, нядзеля стала для хрысціянаў першым з усіх дзён і з усіх святаў: *днём Пана*, у якім Ён праз сваю Пасху ажыццяўляе духоўную праўду габрэйскага шабату і абвяшчае вечны адпачынак чалавека ў Богу.

**453. Як святкуецца нядзеля?** 2177-2185 2192-2193

Хрысціяне святкуюць нядзелю і іншыя прадпісаныя святы, прымаючы ўдзел у Эўхарыстыі Пана і ўстрымліваючыся таксама ад тых дзеянняў, якія перашкаджаюць належнаму пакланенню Богу і парушаюць радасць, уласцівую дню Пана, або неабходны фізічны і духоўны адпачынак. У гэты дзень дапускаюцца дзеянні, звязаныя з сямейнымі абавязкамі або з паслугаю дзеля значнай грамадскай карысці, калі толькі гэта не вядзе да шкодных звычак адносна святкавання нядзелі, сямейнага жыцця і здароўя.

**454. Чаму неабходна прызнаваць нядзелю святочным днём на дзяржаўным узроўні?**

2186-2188 Таму што тады ўсе маюць рэальную магчымасць атрымлі-
2194-2195 ваць задавальненне ад дастатковага адпачынку і вольнага часу, які дазваляе ім паклапаціцца аб рэлігійным, сямейным, культурным і грамадскім жыцці; маюць магчымасць прызначаць адпаведны час для медытацыі, разважання, цішыні і чытання; маюць магчымасць прысвячаць сябе справам дабра, асабліва, на карысць хворых і старых.

## ГЛАВА ДРУГАЯ

# «ЛЮБІ БЛІЖНЯГА ТВАЙГО, ЯК САМОГА СЯБЕ»

## Чацвёртая запаведзь: Шануй бацьку свайго і маці сваю

**455. Што загадвае чацвёртая запаведзь?**

2196-2200 Яна загадвае шанаваць і паважаць нашых бацькоў і тых, каго
2247-2248 Бог дзеля нашага дабра надзяліў сваёй уладай.

**456. Якая сутнасць сям'і ў Божым плане?**

2201-2205 Мужчына і жанчына, з'яднаныя ў сужэнстве, ствараюць ра-
2249 зам са сваімі дзецьмі сям'ю. Бог устанавіў сям'ю і надаў ёй асаблівую структуру. Сужэнства і сям'я скіраваныя на дабро сужэнцаў і на нараджэнне і выхаванне дзяцей. Паміж членамі адной сям'і ўстанаўліваюцца асабістыя адносіны і першачарговая адказнасць. У Хрысце сям'я становіцца *хатнім Касцёлам*, бо з'яўляецца супольнасцю веры, надзеі і любові.

**457. Якое месца займае сям'я ў грамадстве?**

2207-2208 Сям'я — гэта першасная ячэйка чалавечага грамадства. Яна папярэднічае кожнаму прызнанню з боку публічнай улады. Сямейныя прынцыпы і каштоўнасці ствараюць падмурак грамадскага жыцця. Жыццё ў сям'і рыхтуе да жыцця ў грамадстве.

**458. Якія абавязкі мае грамадства адносна сям'і?**

Грамадства мае абавязак падтрымліваць і ўмацоўваць сужэнства і сям'ю згодна з прынцыпам субсідыярнасці. Грамадзянскія ўлады павінны шанаваць і абараняць сапраўдную сутнасць сужэнства і сям'і, грамадскую мараль, правы бацькоў і хатні дабрабыт, а таксама садзейнічаць ім. 2209-2213 2250

**459. Якія абавязкі дзяцей адносна бацькоў?**

Адносна бацькоў дзеці абавязаны выказваць пашану (сыноўнюю любоў), удзячнасць, пакору і паслухмянасць, садзейнічаючы такім чынам, а таксама праз добрыя адносіны паміж братамі і сёстрамі, узрастанню гармоніі і святасці ўсяго сямейнага жыцця. У выпадку, калі бацькі апынуліся ў беднасці, хваробе, адзіноце, старасці, дарослыя дзеці павінны дапамагаць ім маральна і матэрыяльна. 2214-2220 2251

**460. Якія абавязкі бацькоў адносна дзяцей?**

Бацькі, як удзельнікі боскага айцоўства, з'яўляюцца для дзяцей першымі настаўнікамі веры і першыя адказваюць за іх выхаванне. Яны маюць абавязак любіць і шанаваць дзяцей як *асобаў* і як *Божых дзяцей,* а таксама забяспечваць, наколькі магчыма, іх матэрыяльныя і духоўныя патрэбы, выбіраючы для іх адпаведную школу і дапамагаючы разважлівымі парадамі ў выбары прафесіі і жыццёвага стану. Іх асаблівая місія — выхоўваць дзяцей у хрысціянскай веры. 2221-2231

**461. Як бацькі выхоўваюць дзяцей у хрысціянскай веры?**

Найперш — прыкладам, малітвай, сямейнай катэхезай і ўдзелам у касцёльным жыцці. 2252-2253

**462. Ці сямейныя адносіны з'яўляюцца абсалютным дабром?**

Сямейныя адносіны, хоць і важныя, не абсалютныя, бо першаснае пакліканне хрысціяніна — наследаванне Хрыста і любоў да Яго: «Хто любіць бацьку і маці больш за Мяне, не варты Мяне. І хто любіць сына ці дачку больш за Мяне, не варты 2232-2233

Мяне» (Мц 10, 37). Бацькі павінны з радасцю дапамагаць сваім дзецям наследаваць Езуса, у кожным жыццёвым стане, таксама ў кансэкраваным жыцці або ў святарскім служэнні.

### 463. Як павінна ажыццяўляцца ўлада ў розных сферах грамадскага жыцця?

2234-2237
2254
Яна заўсёды ажыццяўляецца як служэнне, паважаючы асноўныя правы чалавека, справядлівую іерархію каштоўнасцяў, законы, справядлівае размеркаванне і прынцып субсідыярнасці. Кожны, хто ажыццяўляе ўладу, павінен кіравацца інтарэсамі супольнасці, а не ўласнымі, а таксама павінен кіравацца ў сваіх рашэннях праўдай пра Бога, чалавека і свет.

### 464. Якія абавязкі грамадзян адносна грамадзянскіх улад?

2238-2241
2255
Тыя, хто падпарадкаваны ўладам, павінны лічыць сваіх кіраўнікоў прадстаўнікамі Бога, павінны шчыра супрацоўнічаць з імі дзеля добрага функцыянавання публічнага і грамадскага жыцця. Гэта ўключае любоў да Радзімы і служэнне ёй, права і абавязак удзельнічаць у выбарах, выплату падаткаў, абарону краіны і права на канструктыўную крытыку.

### 465. Калі грамадзянін не павінен падпарадкоўвацца грамадзянскім уладам?

2242-2243
2256
Грамадзянін, паводле сумлення, не павінен падпарадкоўвацца, калі законы грамадзянскіх улад супярэчаць патрабаванням маральнага парадку: «Трэба слухацца Бога больш, чым людзей» (Дз 5, 29).

## Пятая запаведзь: Не забівай

### 466. Чаму трэба шанаваць жыццё чалавека?

2258-2262
2318-2320
Таму што яно *святое*. Ад самага свайго пачатку яно мае патрэбу ў стваральнай дзейнасці Бога і назаўсёды застаецца ў асаблівых адносінах са Стварыцелем, сваёй адзінай мэтай. Нікому не дазволена непасрэдна знішчаць нявінную чалавечую істоту, бо гэта сур'ёзна супярэчыць годнасці асобы і святасці Стварыцеля. «Не забівай нявіннага і справядлівага» (Зых 23, 7).

### 467. Чаму дазволеная абарона асобаў і грамадства не супярэчыць гэтай норме?

Таму што, выбіраючы дазволеную абарону, асоба рэалізуе права абараняць уласнае жыццё і жыццё іншых, а не жаданне забіваць. Дазволеная абарона для таго, хто адказвае за жыццё іншых, можа быць таксама сур’ёзным абавязкам. Аднак яна не павінна весці да ўжывання большай сілы, чым неабходна. 2263-2265

### 468. Якая мэта пакарання?

Пакаранне, устаноўленае правамоцнай грамадскай уладай, мае на мэце выправіць непарадак, выкліканы злачынствам, абараніць грамадскі парадак і бяспеку людзей, садзейнічаць выпраўленню вінаватага. 2266

### 469. Якое пакаранне можа быць устаноўлена?

Устаноўленае пакаранне павінна быць прапарцыянальным цяжкасці злачынства. Сёння, з увагі на магчымасці, якімі валодае дзяржава для прадухілення цяжкага злачынства і абясшкоджвання злачынцы, выпадкі абсалютнай неабходнасці выкарыстання кары смерці «ўжо вельмі рэдкія, а нават практычна ўжо не існуюць» (*Evangelium vitae*). Калі ёсць дастаткова некрывавых сродкаў, улада павінна абмяжоўвацца імі, бо яны лепш адпавядаюць канкрэтным умовам агульнага дабра, годнасці асобы і не пазбаўляюць канчаткова вінаватага магчымасці выправіцца. 2267

### 470. Што забараняе пятая запаведзь?

Пятая запаведзь забараняе наступныя дзеянні, якія глыбока супярэчаць маральнаму закону: 2268-2283 2321-2326

*непасрэднае і наўмыснае забойства* і саўдзел у ім;

*непасрэднае перарыванне цяжарнасці*, запланаванае як мэта ці сродак, а таксама саўдзел у ім; гэта караецца экскамунікай, бо чалавечай істоце ад самага яе зачацця належыць пашана, і цалкам павінна быць абаронена яе інтэгральнасць;

*непасрэдная эўтаназія*, якая заключаецца ў спыненні жыцця непаўнавартаснай асобы — хворага ці паміраючага — праз канкрэтнае дзеянне або праз занядбанне неабходнага дзеяння;

*самагубства* і дабравольны саўдзел у ім, паколькі яно з'яўляецца вялікай знявагай справядлівай любові да Бога, да сябе і бліжняга; што датычыць адказнасці, то яна павялічваецца з прычыны дрэннага прыкладу або можа быць зменшана з-за пэўных псіхічных парушэнняў ці з-за сур'ёзнай боязі.

**471. Якія медыцынскія дзеянні дапушчальныя, калі смерць лічыцца непазбежнай?**

2278-2279 Лячэнне, якое звычайна належыць хворай асобе, не можа быць законна спынена. Дазваляецца ўжыванне абязбольвальных сродкаў, якія не вядуць да смерці, і адмова ад «настойлівай тэрапіі», гэта значыць ад выкарыстання надзвычайных медыцынскіх дзеянняў з безразважлівай надзеяй на іх пазітыўны вынік.

**472. Чаму грамадства павінна абараняць кожны эмбрыён?**

2273-2274 Неад'емнае права на жыццё кожнай чалавечай асобы ад самага зачацця з'яўляецца асноўным элементам грамадства і яго заканадаўства. Калі дзяржава не выкарыстоўвае сваю моц для абароны правоў усіх, асабліва найбольш слабых, сярод якіх знаходзяцца зачатыя і яшчэ не народжаныя, пад пагрозу ставяцца асновы самой прававой дзяржавы.

**473. Як пазбегнуць дрэннага прыкладу?**

2284-2287 Дрэннага прыкладу, або згаршэння, што схіляе іншых да зла, можна пазбегнуць, кіруючыся павагай да душы і цела асобы. Той, хто наўмысна даводзіць іншых да здзяйснення цяжкага граху, сам чыніць сур'ёзнае злачынства.

**474. Які наш абавязак адносна цела?**

2288-2291 Мы павінны разважліва клапаціцца *аб фізічным здароўі*, сваім і іншых, пазбягаючы, аднак, *культу цела* і ўсялякага роду скрайнасцяў. Больш за тое, забаронена ўжываць наркотыкі, якія наносяць вялікую шкоду здароўю і жыццю, а таксама злоўжываць ежай, алкаголем, тытунём і лекамі.

**475. Калі маральна дапушчальныя навуковыя, медыцынскія ці псіхалагічныя эксперыменты над чалавекам ці групамі людзей?**

Яны маральна дапушчальныя, калі служаць інтэгральнаму дабру асобы і грамадства і не пагражаюць жыццю, фізічнай і псіхічнай інтэгральнасці асобаў, якія належным чынам паінфармаваныя і далі згоду на іх выкарыстанне. 2292-2295

**476. Ці дазволена перасадка і дарэнне органаў да смерці і пасля яе?**

Перасадка органаў маральна дапушчальная з дазволу донара і без празмернай рызыкі для яго. Для высакароднага ўчынку дарэння органаў пасля смерці павінен канчаткова быць пацверджаны факт смерці донара. 2296

**477. Якія практыкі супярэчаць павазе цялеснай інтэгральнасці асобы?**

Узяцце ў заложнікі і гвалтоўнае выкраданне асобы, тэрарызм, катаванне, насілле, непасрэдная стэрылізацыя. Ампутацыя і прычыненне калецтва асобе маральна дапушчальныя толькі як непазбежныя для дасягнення тэрапеўтычных мэтаў адносна гэтай асобы. 2297-2298

**478. Як належыць клапаціцца аб паміраючых?**

Паміраючыя маюць права годна пражыць апошнія хвіліны свайго зямнога жыцця, асабліва ім патрэбныя малітва і сакрамэнты, якія рыхтуюць да сустрэчы з жывым Богам. 2299

**479. Як належыць абыходзіцца з целамі памерлых?**

З целамі памерлых належыць абыходзіцца з пашанай і любоўю. Іх крэмацыя дазваляецца, калі яна не ставіць пад сумненне веру ва ўваскрашэнне цела. 2300-2301

### 480. Чаго чакае Пан ад кожнай асобы ў справе захавання спакою?

2302-2303 Пан, які абвяшчае: «*Шчаслівыя* міратворцы» (Мц 5, 9), просіць аб спакоі ў сэрцы і выкрывае амаральнасць гневу, які вядзе да жадання помсціць за спазнанае зло і да нянавісці, якая выклікае жаданне зла бліжняму. Гэтыя паставы, калі яны дабравольныя і датычаць сур'ёзнай матэрыі, з'яўляюцца цяжкімі грахамі супраць любові.

### 481. Што такое спакой у свеце?

2304-2305 Спакой у свеце, неабходны для пашаны і развіцця чалавечага жыцця, — гэта не проста адсутнасць вайны або раўнавага супрацьлеглых сіл, але «спакой парадку» (св. Аўгустын), «плён справядлівасці» (Іс 32, 17) і вынік любові. Зямны спакой з'яўляецца вобразам і плёнам Хрыстовага спакою.

### 482. Што патрэбна для спакою ў свеце?

2304 Для спакою ў свеце патрэбны справядлівае размеркаванне
2307-2308 і абарона асабістых дабротаў, свабодная камунікацыя паміж людзьмі, шанаванне годнасці асобаў і народаў, руплівае практыкаванне справядлівасці і братэрства.

### 483. Калі маральна дазволена выкарыстанне ваеннай сілы?

2307-2310 Выкарыстанне ваеннай сілы маральна апраўданае пры адначасовай наяўнасці наступных умоў: упэўненасць, што страты будуць доўгачасовыя і сур'ёзныя; безвыніковасць усялякай мірнай альтэрнатывы; верагодная магчымасць поспеху; адсутнасць большага зла, улічваючы моц сучасных сродкаў знішчэння.

### 484. Каму пры пагрозе вайны належыць дакладна ацаніць наяўнасць гэтых умоў?

2309 Гэта павінны разважліва ацаніць кіраўнікі, якія маюць таксама права абавязваць грамадзян да нацыянальнай абароны; пры гэтым павінна захоўвацца асабістае права грамадзян адмовіцца ад узброенай барацьбы і выбраць іншую форму служэння чалавечай супольнасці.

**485. Чаго патрабуе маральны закон у выпадку вайны?**

Маральны закон дзейнічае заўсёды, нават у выпадку вайны. Ён патрабуе гуманнага абыходжання з мірным насельніцтвам, з параненымі жаўнерамі і палоннымі. Наўмысныя дзеянні, якія супярэчаць правам людзей, а таксама загады, якія змушаюць да іх, з'яўляюцца злачынствамі. Іх не апраўдвае сляпая паслухмянасць. Трэба асуджаць як найцяжэйшы грэх масавыя знішчэнні, а таксама вынішчэнне народу ці этнічнай меншасці: існуе маральны абавязак аказваць супраціўленне такім загадам. 2312-2314 2328

**486. Што неабходна рабіць, каб пазбегнуць вайны?**

Неабходна рабіць усё, што разумнае і магчымае, каб любым чынам пазбегнуць вайны, улічваючы зло і несправядлівасць, якія яна прыносіць. Асабліва неабходна пазбягаць гонкі ўзбраення і гандлю зброяй, якi не рэгламентаваны належным чынам правамоцнымі ўладамі; несправядлівасці, асабліва эканамічнай і грамадскай; этнічнай і рэлігійнай дыскрымінацыі; зайздрасці, падазронасці, пыхі і духу помсты. Усё, што робіцца для таго, каб выключыць гэтыя і іншыя непарадкі, дапамагае будаваць спакой і пазбягаць вайны. 2315-2317 2327-2330

## Шостая запаведзь: Не чужалож

**487. Якi абавязак мае асоба адносна сваёй сэксуальнай тоеснасці?**

Бог стварыў чалавека мужчынам і жанчынай з аднолькавай асабістай годнасцю, у якую ўпісаў пакліканне да любові і супольнасці. Кожны павінен успрымаць сваю сэксуальную тоеснасць, усведамляючы яе важнасць для ўсёй асобы, яе адметнасць і камплементарнасць. 2331-2336 2392-2393

**488. Што такое чыстасць?**

Чыстасць — гэта пазітыўная інтэграцыя сэксуальнасці ў асобе. Сэксуальнасць становіцца сапраўды чалавечай, калі яна належным чынам уключана ў міжасабовыя адносіны. Чыстасць — гэта маральная цнота, Божы дар, ласка, плён Духа Святога. 2337-2338

**489. Чаго патрабуе цнота чыстасці?**

2339-2341 Яна патрабуе панавання над сабой, што з’яўляецца выражэннем чалавечай свабоды, накіраванай на дар самога сябе. Для гэтага неабходна інтэгральнае і пастаяннае выхаванне, якое здзяйсняецца на этапах паступовага развіцця.

**490. Якія сродкі дапамагаюць жыць у чыстасці?**

2340-2347 Існуюць шматлікія сродкі: Божая ласка, сакрамэнтальная дапамога, малітва, пазнанне сябе, практыка аскезы адпаведна розным сітуацыям, практыкаванне маральных цнотаў, асабліва цноты ўстрымання, якая кіруе пачуццямі праз розум.

**491. Якім чынам усе пакліканы жыць у чыстасці?**

2348-2350 Усе, наследуючы Хрыста, узор чыстасці, пакліканы жыць у
2394 чыстасці адпаведна ўласнаму жыццёваму стану: адны — жывучы ў дзявоцтве ці ў кансэкраваным цэлібаце, якія даюць магчымасць найбольш лёгкага прысвячэння сябе Богу непадзельным сэрцам; іншыя, жывучы ў сужэнстве, ажыццяўляюць сужэнскую чыстасць; нежанатыя і незамужнія практыкуюць чыстасць ва ўстрыманні.

**492. Якія галоўныя грахі супраць чыстасці?**

2351-2359 Існуюць грахі, якія сур’ёзна супярэчаць чыстасці, кожны па-
2396 водле натуры ўласнага прадмету: чужаложства, мастурбацыя, блуд, парнаграфія, прастытуцыя, гвалт, гомасэксуальныя ўчынкі. Гэтыя грахі з’яўляюцца праяўленнем заганы пажадлівасці. Такія дзеянні, учыненыя з малалетнімі, з’яўляюцца яшчэ больш сур’ёзным замахам супраць іх фізічнай і маральнай інтэгральнасці.

**493. Чаму шостая запаведзь, хоць кажа толькі: «не чужалож», забараняе ўсе грахі супраць чыстасці?**

2336 Хоць у біблійным тэксце Дэкалогу напісана «не чужалож» (Зых 20, 14), Традыцыя Касцёла цалкам трымаецца маральных навучанняў Старога і Новага Запавету і лічыць, што шостая запаведзь ахоплівае ўсе грахі супраць чыстасці.

## 494. Які абавязак грамадзянскіх улад адносна чыстасці?

Грамадзянскія ўлады, паколькі яны абавязаны падтрымліваць шанаванне годнасці асобы, павінны садзейнічаць стварэнню асяроддзя, якое б спрыяла захаванню чыстасці, нават забараняючы адпаведнымі законамі развіццё вышэйназваных пагрозаў для яе, каб абараніць перш за ўсё малалетніх і больш слабых. 2354

## 495. Якія даброты сужэнскай любові, якой падпарадкавана сэксуальнасць?

Даброты сужэнскай любові, якая для ахрышчаных асвячана сакрамэнтам сужэнства, наступныя: адзінства, вернасць, непарыўнасць і адкрытасць на пладнасць. 2360-2361 2397-2398

## 496. Якое значэнне мае сужэнскі акт?

Сужэнскі акт мае падвойнае значэнне: яднанне (узаемнае дарэнне сужэнцаў адно аднаму) і пракрэацыя (адкрытасць на перадаванне жыцця). Ніхто не павінен парушаць пажаданую Богам непарыўную сувязь паміж двума значэннямі сужэнскага акту, выключаючы адно або другое. 2362-2367

## 497. Калі маральна дазволена рэгуляванне пладнасці?

Рэгуляванне пладнасці, што з'яўляецца адным з аспектаў адказнага бацькоўства і мацярынства, аб'ектыўна адпавядае маральнасці, калі здзейснена сужэнцамі без знешняга ўмяшальніцтва і не з-за эгаізму, а па сур'ёзных прычынах і метадамі, якія адпавядаюць аб'ектыўным крытэрыям маралі, гэта значыць з дапамогай перыядычнага ўстрымання і выкарыстання перыядаў няпладнасці. 2368-2369 2399

## 498. Якія сродкі для рэгулявання пладнасці амаральныя?

Па сутнасці, амаральнае кожнае дзеянне (напр., непасрэдная стэрылізацыя або кантрацэпцыя), якое ці ў прадбачанні сужэнскага акту, ці падчас яго здзяйснення, ці падчас развіцця яго натуральных наступстваў было скіравана ці служыла сродкам супраць зачацця. 2370-2372

### 499. Чаму штучная інсемінацыя і штучнае апладненне амаральныя?

2373-2377 Яны амаральныя, бо аддзяляюць нараджэнне ад акту, у якім сужэнцы ўзаемна аддаюць сябе адно аднаму, і ўстанаўліваюць такім чынам перавагу тэхнікі над паходжаннем і над лёсам чалавечай асобы. Больш за тое, гетэралагічная інсемінацыя і апладненне з выкарыстаннем тэхналогій, якія далучаюць іншую асобу да сужэнскай пары, парушаюць права дзіцяці на нараджэнне ад бацькі і маці, вядомых яму, якія звязаныя між сабой у сужэнстве і маюць выключнае права стаць бацькамі толькі адно праз аднаго.

### 500. Як належыць успрымаць дзіця?

2378 Дзіця — гэта *дар Божы*, найвялікшы дар сужэнства. Дзіця не можа быць уласнасцю («мець дзіця любым коштам»). Існуе права дзіцяці быць плодам сужэнскага акту сваіх бацькоў, а таксама права быць шанаваным як асоба ад моманту свайго зачацця.

### 501. Што могуць рабіць сужэнцы, калі не маюць дзяцей?

2379 У выпадку, калі дар дзіцяці не быў дадзены, сужэнцы, вычарпаўшы ўсе дазволеныя медыцынскія сродкі, могуць праявіць сваю велікадушнасць праз апякунства або ўсынаўленне, або здзяйсняючы значныя паслугі на карысць бліжняга. Такім чынам яны рэалізуюць каштоўную духоўную пладавітасць.

### 502. Што парушае годнасць сужэнства?

2380-2391 Чужаложства, развод, палігамія, інцэст, свабодны саюз (су-
2400 жыццё, канкубінат), сэксуальны акт да сужэнства або па-за сужэнствам.

## Сёмая запаведзь: Не крадзі

### 503. Пра што кажа сёмая запаведзь?

2401-2402 Яна кажа пра ўсеагульнае прызначэнне і размеркаванне даброт, пра прыватную ўласнасць і пашану асобаў і іх даброт,

пра інтэгральнасць стварэння. Касцёл будуе на гэтай запаведзі таксама сваё сацыяльнае вучэнне, якое датычыць справядлівых паводзінаў у эканамічнай дзейнасці, у грамадскім і палітычным жыцці; права і абавязку чалавека працаваць; справядлівасці і салідарнасці паміж народамі; любові да бедных.

**504. Пры якіх умовах існуе права на прыватную ўласнасць?**

Права на прыватную ўласнасць існуе пры ўмове, што яна 2403
была набыта ці атрымана справядлівым чынам, і што захоўваецца першаснае ўсеагульнае прызначэнне дабротаў для задавальнення асноўных патрэбаў усіх людзей.

**505. Якая мэта прыватнай уласнасці?**

Мэта прыватнай уласнасці — забеспячэнне свабоды і год- 2404-2406
насці асобы; яна дапамагае асобе задаволіць свае асноўныя патрэбы і патрэбы тых, за каго мы адказваем, а таксама тых, хто знаходзіцца ў патрэбе.

**506. Што загадвае сёмая запаведзь?**

Сёмая запаведзь загадвае шанаваць даброты іншых, прак- 2407
тыкуючы справядлівасць і любоў, устрыманасць і салідарнасць. 2450-2451
Асабліва яна патрабуе *выканання дадзеных абяцанняў і заключаных дамоў*; *выпраўлення* ўчыненай *несправядлівасці* і вяртання скрадзенага; шанавання *інтэгральнасці стварэння* праз разважлівае і стрыманае карыстанне мінеральнымі, раслiннымі і жывёльнымі рэсурсамі свету, асабліва тымі, якім пагражае знікненне.

**507. Як чалавек павінен ставіцца да жывёлаў?**

Чалавек павінен прыхільна ставіцца да жывёлаў, Божых 2416-2418
стварэнняў, пазбягаючы як празмернай любові да іх, так і не- 2457
ўмеркаванага карыстання імі, асабліва дзеля навуковых эксперыментаў, якія выходзяць па-за межы разважлівасці і прычыняюць жывёлам непатрэбныя пакуты.

### 508. Што забараняе сёмая запаведзь?

2408-2413 Сёмая запаведзь забараняе перш за ўсё крадзеж, гэта зна-
2453-2455 чыць набыццё дабротаў іншых насуперак разважлівай волі ўладальніка. Крадзяжом з'яўляецца таксама: выплата несправядлівых заробкаў; спекуляцыя дабротамі дзеля сваёй карысці і на шкоду іншым; падробка квіткоў ці рахункаў. Сёмая запаведзь забараняе, акрамя гэтага, здзяйсняць падатковыя ці гандлёвыя падманы, добраахвотна прычыняць шкоду грамадскай ці прыватнай уласнасці. Забараняе таксама ліхвярства, карупцыю і злоўжыванне грамадскай уласнасцю, дрэннае выкананне працы, марнатраўства.

### 509. Які змест сацыяльнага вучэння Касцёла?

2419-2423 Сацыяльнае вучэнне Касцёла з'яўляецца арганічным развіццём праўды Евангелля аб годнасці чалавечай асобы і аб яе сацыяльным вымярэнні. Яна прапануе прынцыпы разважлівасці, фарміруе крытэрыі ацэнкі, падае нормы і напрамкі дзеянняў.

### 510. Калі Касцёл удзельнічае ў вырашэнні грамадскіх пытанняў?

2420 Касцёл удзельнічае, даючы маральную ацэнку, у вырашэнні
2458 эканамічных і грамадскіх пытанняў, калі гэта неабходна з увагі на асноўныя правы асобы, агульнае дабро ці збаўленне душ.

### 511. Як павінна здзяйсняцца грамадскае і эканамічнае жыццё?

2459 Яно павінна здзяйсняцца паводле яго ўласных метадаў у межах маральнага парадку і служыць чалавеку ва ўсёй яго інтэгральнасці і ўсёй чалавечай супольнасці з захаваннем грамадскай справядлівасці. Чалавек павінен быць яго творцам, цэнтрам і мэтай.

### 512. Што супрацьстаіць сацыяльнаму вучэнню Касцёла?

2424-2425 Сацыяльнаму вучэнню Касцёла супрацьстаяць эканамічныя і грамадскія сістэмы, якія парушаюць асноўныя правы асобы або робяць з нажывы выключную норму ці канчатковую мэту.

Таму Касцёл адкідае ідэалогіі, звязаныя ў наш час з «камунізмам» ці з атэістычнымі і таталітарнымі формамі «сацыялізму». Больш за тое, у практыцы «капіталізму» Касцёл адкідае індывідуалізм і абсалютную першаснасць права рынку над чалавечай працай.

**513. Якое значэнне мае для чалавека праца?**

Праца для чалавека з'яўляецца абавязкам і правам, дзякуючы ёй чалавек супрацоўнічае з Богам Стварыцелем. Сапраўды, працуючы старанна і паводле сваёй кампетэнцыі, чалавек актуалізуе здольнасці, закладзеныя ў яго натуру, усхваляе дары Стварыцеля і атрыманыя таленты, утрымлівае сябе самога і сваіх блізкіх, служыць чалавечай супольнасці. Акрамя таго, з ласкі Божай праца можа быць сродкам асвячэння і супрацоўніцтва з Хрыстом дзеля збаўлення іншых. 2426-2428 2460-2461

**514. На якую працу мае права кожная асоба?**

Доступ да бяспечнай і сумленнай працы павінен быць адкрыты для ўсіх, без ніякай дыскрымінацыі, з захаваннем свабоднай эканамічнай ініцыятывы і справядлівага заробку. 2429 2433-2434

**515. Якая адказнасць дзяржавы ў сферы працы?**

Дзяржава павінна забяспечваць надзейныя гарантыі індывідуальнай свабоды і ўласнасці і, акрамя таго, грашовую стабільнасць і існаванне дзейсных сацыяльных службаў; яна павінна сачыць за захаваннем правоў чалавека ў эканамічнай сферы і кіраваць імі. У залежнасці ад абставінаў, дзяржава павінна дапамагаць грамадзянам знаходзіць працу. 2431

**516. Які абавязак маюць кіраўнікі прадпрыемстваў?**

Кіраўнікі прадпрыемстваў нясуць экалагічную і эканамічную адказнасць за сваю дзейнасць. Яны павінны мець на ўвазе дабро людзей, а не толькі павелічэнне прыбыткаў, нават калі гэта неабходна для забеспячэння інвестыцый, будучыні прадпрыемства, занятасці і добрага развіцця эканамічнага жыцця. 2432

### 517. Якія абавязкі маюць працаўнікі?

2435 Яны павінны выконваць сваю працу сумленна, кампетэнтна і аддана, стараючыся вырашыць магчымыя супярэчнасці праз дыялог. Прымяненне мірнай забастоўкі маральна дазволена, калі яна неабходна як сродак, з улікам прапарцыянальнай карысці, а таксама агульнага дабра.

### 518. Як ажыццяўляецца справядлівасць і салідарнасць паміж нацыямі?

2437-2441 На міжнародным узроўні ўсе народы і інстытуцыі павінны дзейнічаць паводле прынцыпу салідарнасці і субсідыярнасці, каб выключыць ці прынамсі зменшыць беднасць, няроўнасць рэсурсаў і эканамічных сродкаў, эканамічную і грамадскую несправядлівасць, эксплуатацыю людзей, назапашванне даўгоў беднымі краінамі, заганныя механізмы, якія перашкаджаюць развіццю слабаразвітых краін.

### 519. Якім чынам хрысціяне ўдзельнічаюць у палітычным і грамадскім жыцці?

2442 Свецкія вернікі прымаюць непасрэдны ўдзел у палітычным і грамадскім жыцці, напаўняючы хрысціянскім духам зямную рэчаіснасць і супрацоўнічаючы з іншымі як сапраўдныя сведкі Евангелля, міратворцы і абаронцы справядлівасці.

### 520. Чым натхняецца любоў да бедных?

2443-2449
2462-2463 Любоў да бедных чэрпае натхненне з Евангелля благаслаўленняў і з прыкладу Езуса, Яго пастаяннай увагі да бедных. Езус сказаў: «Тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі» (Мц 25, 40). Любоў да бедных ажыццяўляецца праз змаганне з матэрыяльнай беднасцю, а таксама са шматлікімі формамі культурнага, маральнага і рэлігійнага ўбоства. Учынкі міласэрнасці, якія датычаць душы і цела бліжняга, а таксама шматлікія дабрачынныя інстытуцыі, што ўзніклі на працягу стагоддзяў, з'яўляюцца канкрэтным сведчаннем прыярытэтнай любові да бедных, якая характарызуе вучняў Езуса.

## Восьмая запаведзь: Не сведчы фальшыва

**521. Якія абавязкі мае чалавек адносна праўды?**

Кожны чалавек пакліканы быць шчырым і праўдзівым у дзеяннях і словах. Кожны мае абавязак шукаць праўду і трымацца яе, упарадкоўваючы ўсё сваё жыццё згодна з патрабаваннямі праўды. У Езусе Хрысце Божая праўда выяўляецца цалкам, бо Ён *ёсць Праўдай*. Хто наследуе Езуса, той жыве ў Духу праўды і пазбягае фальшу, прытворства і крывадушнасці. 2464-2470 2504

**522. Як даецца сведчанне аб праўдзе?**

Хрысціянін павінен сведчыць аб евангельскай праўдзе ва ўсіх сферах сваёй публічнай і прыватнай дзейнасці, нават, калі неабходна, ахвяраваць сваё жыццё. Мучаніцтва — гэта найвышэйшае сведчанне аб праўдзе веры. 2471-2474 2505-2506

**523. Што забараняе восьмая запаведзь?**

Восьмая запаведзь забараняе: 2475-2487 2507-2509

*фальшывае сведчанне, непраўдзівую клятву, хлусню,* цяжкасць якой вызначаецца праўдай, якую яна скажае, абставінамі, намерамі таго, хто хлусіць, і шкодай, якая прычынена ахвярам;

*паспешнае суджэнне, абгаворы, знеслаўленне, паклёп,* якія змяншаюць або знішчаюць добрую рэпутацыю і годнасць, на якія кожная асоба мае права;

*ліслівасць, угодніцтва* або *паслужлівасць,* асабліва скіраваныя на здзяйсненне цяжкіх грахоў ці на здабыванне незаконнай карысці.

Правіна, учыненая супраць праўды, патрабуе выпраўлення нанесенай іншым людзям шкоды.

**524. Чаго патрабуе восьмая запаведзь?**

Восьмая запаведзь патрабуе павагі да праўды, што суправаджаецца разважлівай любоўю: у *камунікацыі* і *перадачы інфармацыі,* якія павінны браць пад увагу асабістае і агульнае дабро, абарону прыватнага жыцця, нябеспеку згаршэння; у за- 2488-2492 2510-2511

хаванні *прафесійных таямніц*, што павінна заўсёды выконвацца, акрамя выключных выпадкаў з-за сур'ёзных і адпаведных прычын. Восьмая запаведзь патрабуе таксама захавання таямніц, давераных пад сакрэтам.

**525. Як трэба выкарыстоўваць сродкі масавай камунікацыі?**

2493-2499 2512 Перадаваемая інфармацыя павінна служыць агульнаму дабру, а па сваім змесце заўсёды павінна быць праўдзівай і — пры захаванні справядлівасці і любові — таксама поўнай. Больш за тое, яна павінна быць годнай і прыстойнай, павінна дакладна захоўваць маральны закон, легітымныя правы і годнасць асобы.

**526. Якая сувязь існуе паміж праўдай, прыгажосцю і сакральным мастацтвам?**

2500-2503 2513 Праўда прыгожая сама па сабе. Яна мае бляск духоўнай прыгажосці. Акрамя слоў існуюць шматлікія формы выказвання праўды, галоўным чынам у мастацкіх творах. Яны з'яўляюцца плёнам дадзенага Богам таленту і намаганняў чалавека. *Сакральнае мастацтва*, каб быць праўдзівым і прыгожым, павінна нагадваць і праслаўляць таямніцу Бога, аб'яўленага ў Хрысце, і весці да адарацыі і любові да Бога Стварыцеля і Збаўцы, найвышэйшай прыгажосці Праўды і Любові.

## Дзевятая запаведзь:
## Не пажадай жонкі бліжняга твайго

**527. Чаго патрабуе дзевятая запаведзь?**

2514-2516 2528-2530 Дзевятая запаведзь патрабуе перамагаць цялесную пажадлівасць у думках і жаданнях. У барацьбе супраць гэтай пажадлівасці патрэбна ачышчэнне сэрца і практыкаванне цноты ўстрыманасці.

**528. Што забараняе дзевятая запаведзь?**

2517-2519 2531-2532 Дзевятая запаведзь забараняе патураць думкам і жаданням, якія звязаныя з дзеяннямі, забароненымі шостай запаведдзю.

**529. Як дасягнуць чыстасці сэрца?**

Пры дапамозе Божай ласкі і праз змаганне з неўпарадкава- 2520
нымі жаданнямі ахрышчаны дасягае чыстасці сэрца праз цноту і дар чыстасці, яснасць намераў, знешнюю і ўнутраную чысціню позірку, панаванне над пачуццямі і ўяўленнямі, а таксама праз малітву.

**530. Чаго яшчэ патрабуе чыстасць?**

Чыстасць патрабуе *сарамлівасці*, якая, захоўваючы інтым- 2521-2527
насць асобы, выяўляе далікатнасць цнатлівасці, кіруе позіркамі 2533
і жэстамі, каб яны адпавядалі годнасці асобаў і іх адносінаў. Чыстасць вызваляе ад распаўсюджанага эратызму і дапамагае трымацца здалёк ад усяго, што спрыяе нездаровай цікаўнасці. Яна патрабуе таксама *ачышчэння грамадскага асяроддзя* праз пастаянную барацьбу з уседазволенасцю звычаяў, якая грунтуецца на памылковай канцэпцыі свабоды чалавека.

## Дзесятая запаведзь: Не пажадай нічога, што належыць бліжняму твайму

**531. Чаго патрабуе і што забараняе дзесятая запаведзь?**

Гэтая запаведзь, якая дапаўняе папярэднюю, патрабуе пас- 2534-2540
тавы шанавання чужой уласнасці і забараняе *хцівасць*, *неўпа-* 2551-2554
*радкаваную прагнасць* адносна дабротаў іншых асобаў і *зайздрасць*, якая выяўляецца ў смутку з-за дабротаў іншых і ў вялікім жаданні завалодаць імі.

**532. Чаго патрабуе Езус, кажучы пра ўбоства сэрца?**

Ад сваіх вучняў Езус патрабуе, каб яны аддавалі перавагу 2544-2547
Яму перад усім і ўсімі. Адмаўленне ад багацця — у духу еван- 2556
гельскага ўбоства — і даручэнне сябе Божаму Провіду, які вызваляе нас ад неспакою перад заўтрашнім днём, падрыхтоўвае да шчасця «ўбогіх духам, бо ім належыць Валадарства Нябеснае» (Мц 5, 3).

**533. Якое найбольшае жаданне чалавека?**

2548-2550 2557 Найбольшае жаданне чалавека — бачыць Бога. Гэта крык усёй яго сутнасці: «Я хачу бачыць Бога!» Чалавек ажыццяўляе сваё сапраўднае і поўнае шчасце ў бачанні і ў шчасці таго, хто стварыў яго з любові і прыцягвае да сябе сваёй бясконцай любоўю.

*«Той, хто бачыць Бога, дасягнуў усіх дабротаў, якія можна ўявіць»* (св. Грыгорый Назіянзскі).



Абраз нагадвае пра біблійнае апісанне спаслання Духа Святога:

«Калі настаў дзень Пяцідзесятніцы, усе былі разам у адным месцы. І раптам узняўся шум з неба, нібы павеў моцнага ветру, і напоўніў увесь дом, дзе сядзелі яны. І з’явіліся ім языкі падзеленыя, быццам ад агня, і затрымаліся на кожным з іх. І напоўніліся ўсе Духам Святым, і пачалі гаварыць на іншых мовах, як Дух даваў ім прамаўляць» (Дз 2, 1-4).

На абразе ад голуба, які сімвалізуе Духа Святога, зыходзіць інтэнсіўнае святло, якое азарае Марыю і Апосталаў. Гэтае святло асвячае розум Апосталаў, перадаючы ім дары розуму, мудрасці і ўмеласці ў дачыненні да боскай рэчаіснасці, а таксама дары пабожнасці, мужнасці, рады і боязі Божай.

На іх галовах — языкі полымя, якія сведчаць аб паўнаце Божай любові, якая натхняе іх быць вестунамі Евангелля для ўсіх народаў. Сапраўды, паўната ласкі чыніць так, што Апосталаў могуць зразумець усе, дзякуючы ўсеагульнай і даступнай для ўсіх мове любові.

Падзелу моваў між народамі Пяцідзесятніца проціпастаўляе аб’яднанне народаў.

У цэнтры абраза дамінуе постаць Марыі — Маці Касцёла, Каралевы Апосталаў, якая з’яўляецца прыкладам малітвы. У любові Духа Святога вернікі могуць узносіць да Бога сваю сыноўнюю малітву, паводле слоў Апостала:

«А паколькі вы сыны, Бог паслаў у вашыя сэрцы Духа Сына свайго, які ўсклікае: “Абба, Ойча”» (Гал 4, 6).

---

*Копцкі абраз Пяцідзесятніцы*

ЧАСТКА ЧАЦВЁРТАЯ

# ХРЫСЦІЯНСКАЯ МАЛІТВА

## РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

# МАЛІТВА
# Ў ХРЫСЦІЯНСКІМ ЖЫЦЦІ



Кожны момант прыдатны для малітвы. Аднак Касцёл прапануе вернікам вызначаны рытм, каб падтрымліваць пастаянную малітву: ранішняя і вячэрняя малітвы, малітва перад ежай і пасля яе, Літургія гадзінаў, нядзельная Эўхарыстыя, Святы Ружанец, святы літургічнага года.

Абраз прадстаўляе некаторыя з асноўных святаў літургічнага года, якія выяўляюць малітву Касцёла. У цэнтры дамінуе сцэна Пасхальнай таямніцы: уваскрасенне Езуса і Яго ўнебаўшэсце. Менавіта з гэтай урачыстасці — вяршыні літургічнай малітвы — чэрпаюць значэнне і збаўчы сэнс усе іншыя святы, прысвечаныя Езусу і Марыі.

---

*Абраз асноўных літургічных святаў*

**534. Што такое малітва?**

Малітва — гэта ўзнясенне душы да Бога ці просьба, скіраваная да Бога, аб дабротах, якія адпавядаюць Яго волі. Яна заўсёды з'яўляецца дарам Бога, які прыходзіць, каб сустрэцца з чалавекам. Хрысціянская малітва — гэта асабістая і жывая сувязь дзяцей Божых з іх бясконца добрым Айцом, з Яго Сынам Езусам Хрыстом і з Духам Святым, які жыве ў іх сэрцах. 2558-2565 2590

## ГЛАВА ПЕРШАЯ

## АБ'ЯЎЛЕННЕ МАЛІТВЫ

**535. Чаму існуе паўсюднае пакліканне да малітвы?**

Таму што праз стварэнне Бог першы кліча кожную істоту з небыцця, і чалавек, нават пасля ўпадку, можа распазнаваць свайго Стварыцеля, надалей прагнучы таго, хто паклікаў яго да існавання. Усе рэлігіі, і асабліва ўся гісторыя збаўлення, сведчаць аб гэтым чалавечым прагненні Бога, аднак гэта Бог ёсць першым, хто няспынна кліча кожную асобу да таямнічага спаткання з Ім у малітве. 2566-2567

### Аб'яўленне малітвы ў Старым Запавеце

**536. Чаму Абрагам з'яўляецца прыкладам малітвы?**

Абрагам з'яўляецца прыкладам малітвы, бо ён вандруе ў прысутнасці Бога, слухае Яго і паслухмяны Яму. Малітва Абрагама — гэта змаганне веры, бо ён працягвае верыць у праўдзівасць Бога нават у час выпрабаванняў. Сапраўды, пасля таго, як прыняў Пана, які наведаў яго ў шатры і даверыў яму свой намер, Абрагам з адважным даверам асмельваецца заступацца за грэшнікаў. 2570-2573 2592

**537. Як маліўся Майсей?**

2574-2577 Малітва Майсея — гэта тыпова кантэмпляцыйная малітва: Бог кліча Майсея з палаючага куста, размаўляе з ім часта і доўга «тварам ў твар, як чалавек звычайна размаўляе з сябрам сваім» (Зых 33, 11). З гэтай блізкасці з Богам Майсей чэрпае моц, каб вытрывала заступацца за людзей: яго малітва прадказвае, такім чынам, заступніцтва адзінага Пасрэдніка, Езуса Хрыста.
2593

**538. Як кароль і святыня ў Старым Запавеце звязаны з малітвай?**

2578-2580 У цені скініі Бога — Каўчэга Запавету, потым святыні — развіваецца малітва Божага народу пад кіраўніцтвам яго пастыраў. Сярод іх Давід — кароль «паводле сэрца Бога», пастыр, які моліцца за свой народ. Яго малітва — гэта прыклад для народу, таму што яна злучана з верным Божым абяцаннем і перапоўненая любоўю да таго, хто ёсць адзіным Каралём і Панам.
2594

**539. Якая роля малітвы ў місіі прарокаў?**

2581-2584 Пракі чэрпаюць з малітвы святло і моц, каб абуджаць народ да веры і навяртання сэрца. Яны ўваходзяць у глыбокую лучнасць з Богам і заступаюцца за братоў, якім абвяшчаюць усё, што ўбачылі і пачулі ад Пана. Ілля — айцец прарокаў, усіх тых, хто шукае аблічча Бога. На гары Кармэль ён дабіваецца вяртання народу да веры дзякуючы дзеянню Бога, якога ён моліць: «Пачуй мяне, Пане, пачуй мяне!» (1 Вал 18, 37).

**540. Якое значэнне псальмаў у малітве?**

2579 Псальмы — гэта вяршыня малітвы ў Старым Запавеце: сло-
2585-2589 ва Бога становіцца малітвай чалавека. Гэтая непадзельна аса-
2596-2597 бістая і супольная малітва, натхнёная Духам Святым, усхваляе цуды Бога ў стварэнні і ў гісторыі збаўлення. Псальмы, якімі маліўся Хрыстус і якія споўніліся ў Ім, застаюцца істотным і пастаянным элементам малітвы Касцёла і прыдатныя для людзей усіх станаў і ўсіх часоў.

## У Езусе малітва цалкам аб'яўлена і споўнена

**541. У каго Езус вучыўся маліцца?**

Езус, паводле свайго чалавечага сэрца, вучыўся маліцца ў сваёй Маці і ў габрэйскай традыцыі. Але Яго малітва выцякае з найбольш таямнічай крыніцы, бо Ён адвечны Сын Бога, які ў сваёй святой чалавечнасці скіроўвае да свайго Айца дасканалую сыноўнюю малітву. 2599 2620

**542. Калі маліўся Езус?**

Евангелле часта паказвае Езуса падчас малітвы. Мы бачым, як Ён аддаляецца таксама і ноччу, каб маліцца ў самоце. Ён моліцца перад вырашальнымі момантамі сваёй місіі або місіі Апосталаў. Сапраўды, усё Ягонае жыццё — гэта малітва, таму што Ён знаходзіцца ў пастаяннай супольнасці любові з Айцом. 2600-2604 2620

**543. Як маліўся Езус падчас сваёй мукі?**

Малітва Езуса падчас агоніі ў Гетсіманскім садзе і Яго апошнія словы на крыжы адкрываюць глыбіню Яго сыноўняй малітвы: Езус спаўняе намер любові Айца і бярэ на сябе ўсе трывогі чалавецтва, усе просьбы і заступніцтвы гісторыі збаўлення. Ён прадстаўляе іх Айцу, які прымае і задавальняе іх, і, па-над усе спадзяванні, уваскрашае Езуса з памерлых. 2605-2606 2620

**544. Як Езус вучыць нас маліцца?**

Езус вучыць нас маліцца не толькі словамі малітвы *Ойча наш*, але таксама, калі моліцца сам. Такім чынам, акрамя зместу, Ён паказвае нам унутраную паставу, неабходную для сапраўднай малітвы: чыстасць сэрца, якое шукае Валадарства і прабачае ворагам; адважны сыноўні давер, які пераўзыходзіць усё, што мы адчуваем і разумеем; чуванне, якое захоўвае вучня ад спакусы. 2608-2614 2621

**545. Чаму наша малітва дзейсная?**

Наша малітва дзейсная, бо яднаецца ў веры з малітвай Езуса. У Ім хрысціянская малітва становіцца супольнасцю любові 2615-2616

з Айцом. Такім чынам мы можам прадстаўляць нашыя просьбы Богу і быць пачутымі: «Прасіце і атрымаеце, каб радасць вашая была поўнай» (Ян 16, 24).

**546. Як малілася Дзева Марыя?**

2617; 2618 2622; 2674 2679 Малітву Марыі характарызуе вера і цалкавітае прысвячэнне сябе Богу. Маці Езуса з'яўляецца таксама новай Евай, «Маці жывых»: Яна просіць Езуса, свайго Сына, аб патрэбах людзей.

**547. Ці ёсць у Евангеллі малітва Марыі?**

2619 Акрамя заступніцтва Марыі ў Кане Галілейскай, Евангелле перадае нам *Magnificat* (Лк 1, 46–55), песню Маці Божай і Касцёла, радасную падзяку, якая ўзносіцца з сэрцаў убогіх людзей, бо іх надзея ажыццяўляецца ў здзяйсненні Божых абяцанняў.

## Малітва ў часе Касцёла

**548. Як малілася першая хрысціянская супольнасць у Ерузалеме?**

2623-2624 Напачатку Дзеяў Апосталаў напісана, што ў першай ерузалемскай супольнасці, выхаванай Духам Святым да малітоўнага жыцця, вернікі «трывалі ў вучэнні Апосталаў і ў супольнасці, у ламанні хлеба і ў малітвах» (Дз 2, 42).

**549. Як Дух Святы ўдзельнічае ў малітве Касцёла?**

2623 2625 Дух Святы, Настаўнік хрысціянскай малітвы, скіроўвае Касцёл да жывой малітвы і дапамагае яму ўсё глыбей уваходзіць у кантэмпляцыю і з'яднанне з неспасцігальнай таямніцай Хрыста. Формы малітвы, якія знаходзяцца ў кананічных апостальскіх Пасланнях, застаюцца нарматыўнымі для хрысціянскай малітвы.

**550. Якія галоўныя формы хрысціянскай малітвы?**

Гэта благаслаўленне і адарацыя, малітва-просьба і заступніцтва, падзяка і праслаўленне. Эўхарыстыя змяшчае і выражае ўсе формы малітвы. 2643-2644

**551. Што такое благаслаўленне?**

Благаслаўленне — гэта адказ чалавека на дары Бога: мы благаслаўляем Усемагутнага, які першы нас благаславіў і напоўніў нас сваімі дарамі. 2626-2627 2645

**552. Што такое адарацыя?**

Адарацыя — гэта пакланенне чалавека, які прызнае сябе стварэннем перад тройчы святым Стварыцелем. 2628

**553. Якія існуюць формы малітвы-просьбы?**

Гэта можа быць просьба аб прабачэнні ці таксама пакорная і поўная даверу просьба аб усялякіх нашых патрэбах, як духоўных так і матэрыяльных. Але першае, чаго трэба прагнуць, гэта прыйсця Валадарства. 2629-2633 2646

**554. Што такое заступніцтва?**

Заступніцтва — гэта просьба на карысць іншага. Яна нас фарміруе і яднае з малітвай Езуса, які заступаецца перад Айцом за ўсіх людзей, асабліва за грэшнікаў. Заступніцтва павінна распасціраецца таксама і на ворагаў. 2634-2636 2647

**555. Калі ўзносіцца падзяка Богу?**

Касцёл няспынна ўзносіць падзяку Богу, асабліва цэлебруючы Эўхарыстыю, у якой Хрыстус робіць яго ўдзельнікам сваёй падзякі Айцу. Для хрысціяніна кожная падзея становіцца прычынай для падзякі. 2637-2638 2648

**556. Што такое малітва праслаўлення?**

2639-2643 2649 Праслаўленне — гэта форма малітвы, якая найбольш непасрэдна прызнае, што Бог ёсць Богам. Малітва праслаўлення цалкам бескарыслівая: яна ўсхваляе Бога дзеля Яго самога і праслаўляе Яго за тое, што Ён ёсць.

## ГЛАВА ДРУГАЯ

# ТРАДЫЦЫЯ МАЛІТВЫ

**557. Якое значэнне мае Традыцыя аносна малітвы?**

2650-2651 У Касцёле праз жывую Традыцыю Дух Святы вучыць дзяцей Божых маліцца. На самой справе, малітва не абмяжоўваецца спантанным выяўленнем унутранага жадання, але заключае ў сабе кантэмпляцыю, навучанне і спасціжэнне духоўных рэчаіснасцяў, якія пазнаюцца.

### Крыніцы малітвы

**558. Якія крыніцы хрысціянскай малітвы?**

2652-2662 Гэта *Божае слова,* якое дае нам найвышэйшае «пазнанне Хрыста» (Флп 3, 8); *літургія Касцёла,* якая аб'яўляе, актуалізуе і перадае таямніцу збаўлення; *тэалагальныя цноты; штодзённыя сітуацыі,* у якіх мы можам сустракаць Бога.

> *«Люблю Цябе, Пане, і аб адзінай ласцы прашу ў Цябе: любіць Цябе вечна. Мой Божа, калі мой язык не можа паўтараць кожнае імгненне, што я люблю Цябе, то хачу, каб сэрца маё паўтарала гэта Табе з кожным уздыхам»* (св. Ян Марыя Віянэй).

## Шлях малітвы

### 559. Ці існуюць у Касцёле розныя шляхі малітвы?

У Касцёле існуюць розныя шляхі малітвы, звязаныя з розным гістарычным, грамадскім і культурным кантэкстам. Настаўніцкі Інстытут Касцёла павінен распазнаваць іх вернасць Традыцыі апостальскай веры, а пастыры і катэхеты павінны тлумачыць іх сэнс, які заўсёды адносіцца да Езуса Хрыста. 2663

### 560. Які шлях нашай малітвы?

Шляхам нашай малітвы ёсць Хрыстус, бо яна скіравана да Бога, нашага Айца, але мае доступ да Яго толькі тады, калі мы — прынамсі ў думках — молімся ў імя Езуса. Сапраўды, Яго чалавечая натура — гэта адзіны шлях, праз які Дух Святы вучыць нас маліцца да нашага Айца. Таму літургічныя малітвы заканчваюцца формулай: «Праз Пана нашага Езуса Хрыста». 2664 2680-2681

### 561. Якая роля Духа Святога ў малітве?

Паколькі Дух Святы з'яўляецца Настаўнікам хрысціянскай малітвы, а «мы не ведаем, аб чым трэба маліцца» (Рым 8, 26), Касцёл заахвочвае нас заклікаць і прасіць Яго ў кожным выпадку: «Прыйдзі, Дух Святы!» 2670-2672 2680-2681

### 562. Якім чынам хрысціянская малітва становіцца марыйнай?

З прычыны асаблівага ўдзелу Дзевы Марыі ў справе Духа Святога, Касцёл любіць маліцца да Марыі і з Марыяй, дасканалай Арантай, каб разам з Ёй узвялічваць і заклікаць Пана. Марыя, сапраўды, «паказвае шлях», якім ёсць Яе Сын, адзіны Пасрэднік. 2673-2679 2682

### 563. Як Касцёл моліцца да Марыі?

Перш за ўсё малітвай *Вітай, Марыя*, у якой Касцёл просіць заступніцтва ў Дзевы Марыі. Іншыя малітвы — гэта *Ружанец*, гімн *Акатыст, Параклісіс*, гімны і спевы розных хрысціянскіх традыцый. 2676-2678 2682

## Настаўнікі малітвы

**564. Якім чынам святыя з'яўляюцца настаўнікамі малітвы?**

2683-2684 2692-2693 Святыя з'яўляюцца для нас прыкладам малітвы. Мы просім іх таксама аб заступніцтве перад Найсвяцейшай Тройцай за нас і ўвесь свет. Іх заступніцтва — найбольш высокая паслуга, якую яны аказваюць Божаму намеру. У супольнасці святых на працягу гісторыі Касцёла ўзнікалі розныя тыпы *духоўнасці*, якія вучаць нас жыць малітвай і практыкаваць яе.

**565. Хто можа выхоўваць у малітве?**

2685-2690 2694-2695 Хрысціянская сям'я стварае першы асяродак выхавання ў малітве. Асабліва рэкамендуецца штодзённая сямейная малітва, бо гэта першае сведчанне малітоўнага жыцця Касцёла. Катэхезы, малітоўныя групы, «духоўнае кіраўніцтва» з'яўляюцца школай малітвы і дапамагаюць ёй.

**566. Якія месцы спрыяюць малітве?**

2691 2696 Маліцца можна ўсюды, але выбар адпаведнага месца не абыякавы для малітвы. Касцёл — гэта адпаведнае месца для літургічнай малітвы і эўхарыстычнай адарацыі. Таксама іншыя месцы дапамагаюць маліцца, напр., «малітоўны куток» у доме, кляштар, санктуарый.

### ГЛАВА ТРЭЦЯЯ

# МАЛІТОЎНАЕ ЖЫЦЦЁ

**567. Якія моманты найбольш прыдатныя для малітвы?**

2697-2698 2720 Усе моманты прыдатныя для малітвы, але Касцёл прапануе вернікам вызначаныя рытмы, каб падтрымліваць пастаянную малітву: ранішняя і вячэрняя малітва, малітва перад ежай і пасля яе, Літургія гадзінаў, нядзельная Эўхарыстыя, Святы Ружанец, святы літургічнага года.

*«Неабходна ўспамінаць пра Бога часцей, чым дыхаем»* (св. Грыгорый Назіянзскі).

**568. Якія існуюць спосабы малітвы?**

Хрысціянская традыцыя захавала тры спосабы малітвы: 2697-2699
вусная малітва, медытацыя і кантэмпляцыйная малітва. Іх агульная рыса — засяроджанасць сэрца.

## Спосабы малітвы

**569. Што характарызуе вусную малітву?**

Вусная малітва злучае цела з унутранай малітвай сэрца. 2700-2704
Нават самая глыбокая ўнутраная малітва не можа абысціся без 2722
вуснай малітвы. У кожным выпадку, яна заўсёды павінна быць вынікам асабістай веры. У малітве *Ойча наш* Езус дае нам дасканалую формулу вуснай малітвы.

**570. Што такое медытацыя?**

Медытацыя — гэта малітоўная рэфлексія, якая абапіраец- 2705-2708
ца галоўным чынам на Божыя словы з Бібліі. Яна актывізуе 2723
розум, уяўленне, эмоцыі, прагненні, паглыбляе нашу веру, перамяняе нашыя сэрцы і ўзмацняе нашу волю ў наследаванні Хрыста. Гэта першы этап будавання еднасці з Панам у любові да Яго.

**571. Што такое кантэмпляцыйная малітва?**

Кантэмпляцыйная малітва — гэта сузіранне Бога ў цішыні 2709-2719
і любові. Такая малітва — дар Бога, момант чыстай веры, у які 2724
той, хто моліцца, шукае Хрыста, даяраецца любячай волі 2739-2741
Айца і падпарадкоўвае сваё існаванне дзеянню Духа Святога. Св. Тэрэза Авільская называе кантэмпляцыйную малітву глыбокай сувяззю сяброўства, «у якім мы часта размаўляем сам на сам з Богам, пра якога ведаем, што Ён нас любіць».

## Малітоўная барацьба

### 572. Чаму малітва — гэта барацьба?

2725 Малітва — гэта дар ласкі, аднак яна заўсёды прадугледжвае рашучы адказ з нашага боку, бо той, хто моліцца, змагаецца супраць сябе самога, супраць асяроддзя і асабліва супраць спакусіцеля, які робіць усё магчымае, каб адвесці нас ад малітвы. Малітоўная барацьба неад'емная ад узрастання ў духоўным жыцці. Мы молімся так, як жывём, бо жывём так, як молімся.

### 573. Ці існуюць перашкоды для малітвы?

2726-2728 2752-2753 Акрамя існавання памылковых канцэпцый малітвы, многія лічаць, што не маюць часу для малітвы, або, што маліцца бессэнсоўна. Тыя, хто моліцца, могуць падаць духам перад цяжкасцямі і знешнімі няўдачамі. Каб перамагчы гэтыя перашкоды неабходныя пакора, давер і вытрываласць.

### 574. Якія існуюць цяжкасці ў малітве?

2729-2733 2754-2755 *Няўважлівасць* — гэта звычайная цяжкасць у нашай малітве. Яна адцягвае ўвагу ад Бога і можа таксама выявіць тое, да чаго мы прывязаныя. Тады мы павінны ў пакоры скіроўваць сваё сэрца да Пана. Малітве часта пагражае *чэрствасць,* пераадоленне якой дазваляе наблізіцца ў веры да Пана без адчувальнага суцяшэння. *Стомленасць* — гэта форма духоўнай ляноты, выкліканая аслабленнем пільнасці і занядбаннем аховы сэрца.

### 575. Як узмоцніць наш сыноўні давер?

2734-2741 2756 Сыноўні давер выпрабоўваецца, калі мы думаем, што не былі выслуханыя. Тады мы павінны запытаць сябе, ці сапраўды Бог з'яўляецца для нас Айцом, волю якога мы хочам выконваць, ці Ён для нас толькі сродак дасягнення таго, чаго мы прагнем. Калі нашая малітва яднаецца з малітвай Езуса, то мы ведаем, што Ён адорвае нас нашмат больш за той ці іншы дар: мы атрымліваем Духа Святога, які перамяняе нашыя сэрцы.

### 576. Ці магчыма маліцца ў кожны момант?

Маліцца можна заўсёды, бо час хрысціяніна — гэта час уваскрослага Хрыста, які «застаецца з намі ва ўсе дні» (Мц 28, 20). Таму малітва і хрысціянскае жыццё непадзельныя. 2742-2745 2757

> *«Часта і шчыра маліцца можна нават на кірмашы ці падчас самотнай вандроўкі. Таксама ў вашых крамах, купляючы ці прадаючы, або нават падчас прыгатавання ежы»* (св. Ян Хрызастом).

### 577. Што такое малітва *гадзіны* Езуса?

Так называецца святарская малітва Езуса падчас Апошняй Вячэры. Езус — Найвышэйшы Святар Новага Запавету — скіроўвае гэтую малітву да Айца, калі надышла Яго *гадзіна* «пераходу» да Айца, *гадзіна* Яго ахвяры. 2604 2746-2751 2758

РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

# МАЛІТВА ПАНСКАЯ

## *ОЙЧА НАШ*



### Ойча наш

Ойча наш, каторы ёсць у небе,
свяціся імя Тваё,
прыйдзі Валадарства Тваё,
будзь воля Твая як у небе,
так і на зямлі.
Хлеба нашага штодзённага
дай нам сёння
і адпусці нам правіны нашы,
як і мы адпускаем
вінаватым нашым,
і не ўводзь нас у спакусу,
але збаў нас ад злога.

### Pater Noster

Pater noster, qui es in cælis:
sanctificétur Nomen Tuum;
advéniat Regnum Tuum;
fiat volúntas Tua,
sicut in cælo, et in terra.
Panem nostrum
cotidiánum da nobis hódie;
et dimítte nobis débita nostra,
sicut et nos dimíttimus
debitóribus nostris;
et ne nos indúcas in tentatiónem;
sed líbera nos a Malo.

«Калі Езус быў у пэўным месцы і маліўся, і калі перастаў, адзін з вучняў Ягоных сказаў Яму: “Пане, навучы нас маліцца”» (Лк 11, 1). У адказ Езус навучыў іх малітве *Ойча наш*.

Вучні, якія добра ведалі габрэйскую малітву таго часу, былі моцна ўражаныя незвычайнасцю малітвы іх Настаўніка. Езус, сапраўды, пастаянна маліўся (пар. Лк 5, 16). Найбольш важныя моманты Яго жыцця суправаджаюцца малітвай: Езус моліцца падчас хросту ў Ярдане (Лк 3, 21); перад пакліканнем Апосталаў (Лк 6, 12); перад перамяненнем (Лк 9, 28). Ён моліцца аб веры Пятра (Лк 22, 31–32) і аб спасланні Духа Святога (Ян 14, 15–17). Моліцца перад уваскрашэннем Лазара (Ян 11, 41) і перад сваім трыумфальным уваходам у Ерузалем (Ян 12, 27). Ён моліцца да Айца падчас Апошняй Вячэры аб сваім услаўленні (Ян 17, 1–5), моліцца за вучняў (Ян 17, 6–19) і за ўсіх вернікаў (Ян 17, 20–26). Моліцца перад сваёй мукай (Лк 22, 39–46) і, у момант смерці, моліцца за сваіх ворагаў (Лк 23, 34).

Малітва Езуса скіраваная да Айца ў дыялогу паслухмянасці, якая жывіць Яго місію: «Ежа Мая ў тым, каб выконваць волю таго, хто паслаў Мяне, і завяршыць Яго справу» (Ян 4, 34). Гэтая глыбокая еднасць з Айцом ёсць крыніцай радасці і хвалы: «Праслаўляю Цябе, Ойча, Пан неба і зямлі (...). Усё перададзена Мне Айцом Маім; і ніхто не ведае Сына, апроч Айца; і Айца ніхто не ведае, апроч Сына і таго, каму Сын захоча адкрыць» (Мц 11, 25.27).

Малітва да Айца была дыханнем Яго зямнога існавання. Прыйшоўшы жыць сярод нас, Езус ніколі не аддаляецца ад дому Айца, гэта значыць ад еднасці з Ім у малітве. А з другога боку, гэтая сыноўняя блізкасць становіцца збаўчай і міласэрнай блізкасцю з братамі, аж да найвышэйшай ахвяры на крыжы.

Малітва Езуса працягваецца і сёння (пар. Гбр 7, 25). Падчас эўхарыстычнай літургіі Хрыстус, Найвышэйшы Святар, прыносіць Айцу сваю збаўчую ахвяру. Ён прыносіць яе ў еднасці са сваім целам, якім ёсць Касцёл. Кожная наша малітва ўзносіцца да Айца «праз Хрыста, Пана нашага». Менавіта гэта малітва Хрыста падтрымлівае ўсе нашыя малітвы, малітвы сэрцаў і малітвы вуснаў. Калі Касцёл моліцца, тады Сын абдымае калені Айца. Малітва дзяцей дасягае Айца праз голас Першароднага. Мільёны рук уздымаюцца ў заклiку, хвале і просьбе, але голас адзін — Сына.

Абраз паказвае Езуса ў Гетсіманскім садзе. Ён прымае горкі келіх мукі ў найвялікшай паслухмянасці Айцу дзеля збаўлення чалавецтва.

---

Эль Грэка. *Малітва Езуса ў садзе* (каля 1588 г.). Музей мастацтва, Таледа (Агаё, ЗША)

**578. Як узнікла малітва *Ойча наш*?**

Езус навучыў гэтай неад'емнай хрысціянскай малітве — *Ойча наш,* — калі адзін з вучняў, які бачыў як Езус моліцца, папрасіў яго: «Навучы нас маліцца» (Лк 11, 1). Літургічная традыцыя Касцёла заўсёды ўжывала тэкст св. Мацвея (6, 9-13). 2759-2760 2773

«Пераказ усяго Евангелля»

**579. Якое месца займае *Ойча наш* у Святым Пісанні?**

*Ойча наш* — «гэта пераказ усяго Евангелля» (Тэртуліян), «самая дасканалая малітва» (св. Тамаш Аквінскі). Змешчаная ў цэнтры Казання на гары (Мц 5–7), яна прадстаўляе ў форме малітвы істотны змест Евангелля. 2761-2764 2774

**580. Чаму яна называецца «малітвай Панскай»?**

*Ойча наш* называецца «малітвай Панскай» (*Oratio dominica*), бо гэтай малітве навучыў нас сам Пан Езус. 2765-2766 2775

**581. Якое месца займае *Ойча наш* у малітве Касцёла?**

*Ойча наш* — гэта малітва Касцёла ў найвышэйшай ступені. Яна «перадаецца» падчас хросту, каб паказаць новае нараджэнне дзяцей Божых для Божага жыцця. У Эўхарыстыі аб'яўляецца яе поўны сэнс, паколькі яе просьбы, складзеныя на падставе ўжо здзейсненай таямніцы збаўлення, напоўненыя чаканнем прыйсця Пана. *Ойча наш* з'яўляецца неад'емнай часткай Літургіі гадзінаў. 2767-2772 2776

## «Ойча наш, каторы ёсць у небе»

**582. Чаму мы «асмельваемся наблізіцца з поўным даверам» да Айца?**

2777-2778 2797 Езус, наш Адкупіцель, ставіць нас перад абліччам Айца, а Ягоны Дух чыніць нас Ягонымі дзецьмі. Таму мы можам прасіць у малітве нашага Айца з простым сыноўнім даверам, з радаснай надзеяй і пакорнай адвагай, з упэўненасцю, што Ён нас любіць і выслухае нас.

**583. Чаму да Бога можна ўсклікаць: «Ойча»?**

2779-2785 2789 2798-2800 Мы можам усклікаць «Ойча», бо Сын Божы аб'явіў нам Яго, стаўшыся чалавекам, а Ягоны Дух дае нам пазнаць Яго. Усклікацне да Айца дазваляе нам увайсці ў Яго таямніцу з пастаянна новым здзіўленнем і абуджае ў нас прагненне паводзіць сябе як Яго дзеці. Праз малітву Панскую мы ўсведамляем, што з'яўляемся дзецьмі Айца ў Сыне.

**584. Чаму мы кажам: «Ойча наш»?**

2786-2790 2801 Слова «наш» цалкам выяўляе новую сувязь з Богам. Калі мы молімся да Айца, то пакланяемся Яму і праслаўляем Яго разам з Сынам і Духам Святым. У Хрысце мы з'яўляемся «Яго» народам, а Ён — «нашым» Богам цяпер і навекі. Сапраўды, мы гаворым Ойча «наш», бо Касцёл Хрыста — гэта супольнасць мноства братоў, якія «адзіныя сэрцам і душою» (Дз 4, 32).

**585. У духу якой супольнасці і місіі мы молімся да Бога Айца «нашага»?**

2791-2793 2801 Паколькі малітва да «нашага» Айца — гэта агульнае дабро ахрысціаных, то яны адчуваюць няспынны заклік удзельнічаць у малітве Езуса за адзінства Яго вучняў. Маліцца словамі «Ойча наш» — значыць маліцца з усімі людзьмі і за ўсё чалавецтва, каб усе пазналі адзінага і сапраўднага Бога і былі сабраныя ў адно.

**586. Што азначаюць словы «каторы ёсць у небе»?**

Гэты біблійны выраз указвае не на месца, а на спосаб існавання: Бог ёсць па-над усім. Гэты выраз азначае веліч і святасць Бога, а таксама Яго прысутнасць у сэрцах справядлівых. Неба, або дом Айца, — гэта сапраўдная айчына, да якой мы імкнемся ў надзеі, хоць знаходзімся яшчэ на зямлі. Мы ўжо жывём там, схаваныя «з Хрыстом у Богу» (Клс 3, 3). 2794-2796 2802

## Сем просьбаў

**587. З чаго складаецца малітва Панская?**

Яна складаецца з сямі просьбаў да Бога Айца. Першыя тры, больш тэалагальныя, кіруюць нас да Бога дзеля Яго хвалы: гэта ўласцівасць любові — думаць перш за ўсё аб тым, каго любіш. Яны падказваюць, што мы павінны прасіць у Яго асабліва: аб асвячэнні Яго імя, прыйсці Яго Валадарства, здзяйсненні Яго волі. Апошнія чатыры просьбы прадстаўляюць міласэрнаму Айцу нашыя патрэбы і чаканні. Мы просім Яго карміць нас, прабачаць нам, захоўваць нас ад спакусаў і збавіць нас ад злога. 2803-2806 2857

**588. Што азначаюць словы «свяціся імя Тваё»?**

Свяціць імя Бога — гэта перш за ўсё праслаўляць Бога ў Яго святасці. Сапраўды, Бог адкрыў сваё святое імя Майсею і захацеў, каб *Яго* народ быў святым народам, у якім Ён жыве. 2807-2812 2858

**589. Як асвячаецца імя Бога ў нас і ў свеце?**

Асвячаць імя Бога, які нас кліча «да святасці» (1 Тэс 4, 7), значыць жадаць, каб хросная кансэкрацыя ажыўляла ўсё нашае жыццё. Больш за тое, гэта просьба аб тым, каб праз нашае жыццё і нашую малітву кожны чалавек ведаў і благаслаўляў імя Бога. 2813-2815

### 590. Аб чым просіць Касцёл, молячыся: «Прыйдзі Валадарства Тваё»?

2816-2821 Касцёл просіць аб канчатковым прыйсці Божага Валадар-
2859 ства ў момант вяртання Хрыста ў хвале. Але Касцёл моліцца таксама, каб Валадарства Божае ўзрастала ўжо сягоння праз асвячэнне людзей у Духу і дзякуючы іх стараннасці ў служэнні справядлівасці і спакою, згодна з благаслаўленнямі. Гэтая просьба з’яўляецца воклічам Духа і абранніцы: «Прыйдзі, Пане Езу!» (Ап 22, 20).

### 591. Навошта мы просім: «Будзь воля Твая, як у небе, так і на зямлі»?

2822-2827 Воля Айца ў тым, «каб усе людзі былі збаўлены» (1 Цім 2, 3).
2860 Таму Езус прыйшоў, каб дасканала здзейсніць збаўчую волю Айца. Мы молімся да Бога Айца аб з’яднанні нашай волі з воляй Сына па прыкладзе Найсвяцейшай Марыі і святых. Просім, каб Яго зычлівы намер цалкам здзейсніўся як на зямлі, так і на небе. Менавіта праз малітву мы можам распазнаць, «якая воля Божая» (Рым 12, 2), і набыць цярплівасць, каб здзейсніць яе (пар. Гбр 10, 36).

### 592. Які сэнс просьбы: «Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння»?

2828-2834 Просячы ў Бога з дзіцячым даверам штодзённай ежы, якая
2861 неабходная ўсім для існавання, мы прызнаём, які добры, больш за ўсялякае дабро, ёсць Бог, наш Айцец. Мы просім таксама ласкі ўмець дзяліцца, каб справядлівасць і падтрымка дазвалялі багаццю адных забяспечыць патрэбы іншых.

### 593. Які асаблівы, хрысціянскі сэнс гэтай просьбы?

2835-2837 Паколькі «не хлебам адным будзе жыць чалавек, але кож-
2861 ным словам, што выходзіць з вуснаў Божых» (Мц 4, 4), то гэтая просьба датычыць у аднолькавай ступені голаду *Божага слова* і голаду *Цела Хрыста*, якое мы прымаем у Эўхарыстыі, а таксама голаду *Духа Святога*. Мы з абсалютным даверам просім

аб гэтым на *сёння* — на *сёння* Бога, — і гэта нам даецца перадусім у Эўхарыстыі, якая прадвяшчае гасціну Валадарства, якое прыйдзе.

**594. Чаму мы кажам: «Адпусці нам правіны нашыя, як і мы адпускаем вінаватым нашым»?**

Просячы Бога Айца прабачыць нам, мы прызнаём сябе грэшнікамі перад Ім. Але вызнаём у той жа час Яго міласэрнасць, бо ў Яго Сыне і праз сакрамэнты мы атрымліваем «адкупленне і адпушчэнне грахоў» (Клс 1, 14). Нашая просьба, аднак, будзе выканана пры ўмове, што спачатку мы прабачым нашым вінаватым. 2838-2839 2862

**595. Ці магчыма прабачэнне?**

Міласэрнасць пранікае ў нашае сэрца толькі тады, калі мы здольныя прабачыць нават нашым ворагам. Але, нават калі чалавеку гэтае патрабаванне здаецца немагчымым, сэрца, паслухмянае Духу Святому, можа, як Хрыстус, любіць ажно да канца, пераменяючы рану ў спачуванне, крыўду ў заступніцтва. Прабачэнне саўдзельнічае ў Божай міласэрнасці і з'яўляецца вяршыняй хрысціянскай малітвы. 2840-2845 2862

**596. Што азначаюць словы: «Не ўводзь нас у спакусу»?**

Мы просім Бога Айца не пакідаць нас у адзіноце перад абліччам спакусы. Просім Духа аб уменні распазнаваць, з аднаго боку, *выпрабаванне*, якое дапамагае ўзрастаць у добрым, і *спакусу,* якая вядзе да граху і смерці, а з другога, адрозніваць *спакушэнне* ад *згоды* на спакусу. Гэтая просьба яднае нас з Езусам, які перамог спакусу сваёй малітвай. Яна выпрошвае ласку чуваць і трываць ажно да канца. 2846-2849 2863

**597. Чаму мы завяршаем малітву, просячы: «Але збаў нас ад злога»?**

Слова «злы» ўказвае на асобу сатаны, які супярэчыць Богу і «зводзіць увесь свет» (Ап 12, 9). Перамога над д'яблам ужо 2850-2854 2864

дасягнута Хрыстом. Але мы молімся, каб чалавечая сям’я была вызвалена ад сатаны і яго спраў. Просім таксама аб каштоўным дары спакою і ласкі трывалага чакання Хрыста, які канчаткова збавіць нас ад злога.

**598. Што азначае апошняе слова *«амэн»?***

2855-2856
2865
*«На заканчэнне малітвы ты кажаш: “Амэн”, згаджаючыся праз “амэн”, што азначае “няхай так будзе”, з усім тым, што змешчана ў малітве, якой навучыў нас Бог»* (св. Кірыл Ерузалемскі).



Анёлы — гэта Божыя стварэнні. Частка з іх заставалася і застаецца заўсёды вернымі Богу, трывае ў Яго прысутнасці, служыць Яму, служыць Касцёлу, злучаецца са збаўленымі ў хвале неба.

Як у візіі Якуба, які бачыў у сне драбіну і «анёлаў Божых, якія ўзыходзілі і сыходзілі па ёй» (Быц 28, 12), анёлы з'яўляюцца дынамічнымі і нястомнымі пасланцамі, якія злучаюць неба з зямлёю. Паміж Богам і чалавецтвам няма маўчання і раз'яднанасці, але ёсць няспынны дыялог, няспынная сувязь. Людзі, адрасаты гэтай сувязі, павінны рабіць чуйным сваё духоўнае вуха, каб пачуць і зразумець гэтую мову анёлаў, якая падказвае добрыя словы, святыя пачуцці, справы міласэрнасці, чалавекалюбныя паводзіны, павучальныя адносіны.

Вось як мы просім анёла-ахоўніка ў вядомай малітве, якая адлюстроўвае пабожнасць народу:

«Анёле Божы, дружа мой,
Ты заўсёды будзь са мной.
Рана, увечар і ўначы
Будзь ласкаў мне памагчы
Змагаць духа злога,
Верна служыць Богу.
Душу, цела сцеражы,
Да жыцця вечнага давядзі.
Амэн».

Прадстаўлены абраз паказвае групу анёлаў (г. зв. «apteri» — бяскрылых), якія моляцца, спяваючы. Яны апранутыя ў раскошныя сакральныя шаты, якія сведчаць аб тым, што яны цэлебруюць урачыстае літургічнае дзеянне. Сапраўды, анёлы, акрамя таго, што з'яўляюцца пасланцамі Бога, прызначаныя абвяшчаць людзям Яго вышэйшую волю, маюць таксама заданне праслаўляць Пана ў вечнай нябеснай літургіі (пар. Ап 8, 2).

---

Ян ван Эйк. *Спяваючыя анёлы* (1425–1432 гг.). Фрагмент паліпціха катэдры ў Генце

# ДАДАТАК

## А) АГУЛЬНЫЯ МАЛІТВЫ

## Б) ПРАЎДЫ КАТАЛІЦКАГА ВЕРАВУЧЭННЯ

# A) АГУЛЬНЫЯ МАЛІТВЫ

## Знак крыжа

У імя Айца
і Сына,
і Духа Святога. Амэн.

## Signum Crucis

In nómine Patris
et Fílii
et Spíritus Sancti. Amen.

## Хвала Айцу

Хвала Айцу
і Сыну,
і Духу Святому.
Як была спрадвеку,
цяпер і заўсёды,
і на векі вечныя. Амэн.

## Gloria Patri

Glória Patri
et Fílio
et Spirítui Sancto.
Sicut erat in princípio,
et nunc et semper
et in sǽcula sæculórum. Amen.

## Вітай, Марыя

Вітай, Марыя, поўная ласкі,
Пан з Табою,
благаслаўлёная Ты між жанчынамі
і благаслаўлёны плод
улоння Твайго, Езус.
Святая Марыя, Маці Божая,
маліся за нас, грэшных,
цяпер і ў хвіліну смерці нашай.
Амэн.

## Ave, Maria

Ave, María, grátia plena,
Dóminus tecum.
Benedícta tu in muliéribus,
et benedíctus fructus
ventris tui, Iesus.
Sancta María, Mater Dei,
ora pro nobis peccatóribus,
nunc et in hora mortis nostræ.
Amen.

## Анёле Божы

*(паэтычная форма)*

Анёле Божы, дружа мой,
Ты заўсёды будзь са мной.
Рана, увечар і ўначы
Будзь ласкаў мне памагчы
Змагаць духа злога,
Верна служыць Богу.
Душу, цела сцеражы,
Да жыцця вечнага давядзі. Амэн.

## Angele Dei

Ángele Dei,
qui custos es mei,
me, tibi commíssum pietáte supérna,
illúmina, custódi,
rege et gubérna.
Amen.

## Вечны адпачынак

Вечны адпачынак дай ім, Пане,
а святло вечнае няхай ім свеціць.
Няхай адпачываюць у супакоі.
Амэн.

## Requiem aeternam

Réquiem ætérnam dona eis, Dómine,
et lux perpétua lúceat eis.
Requiéscant in pace.
Amen.

## Анёл Панскі

*Анёл Панскі*
*звеставаў Панне Марыі.*
І зачала ад Духа Святога.
Вітай, Марыя...

*Вось я, слуга Панская.*
Няхай мне станецца паводле
Твайго слова.
Вітай, Марыя...

*А Слова сталася целам.*
І пасялілася між намі.
Вітай, Марыя...

*Маліся за нас,*
*Святая Багародзіца.*
Каб сталіся мы годнымі
абяцанняў Хрыстовых.

*Молімся.*
Божа, просім Цябе,
улі ў нашыя сэрцы Тваю ласку,
каб мы, пазнаўшы
праз анёльскае звеставанне
ўцелаўленне Хрыста, Твайго Сына,
праз муку Яго і крыж
былі даведзеныя
да хвалы ўваскрашэння.
Праз Хрыста,
Пана нашага. Амэн.
*Хвала Айцу...*

## Angelus Domini

*Ángelus Dómini*
*nuntiávit Maríæ.*
Et concépit de Spíritu Sancto.
Ave, María...

*Ecce ancílla Dómini.*
Fiat mihi secúndum
verbum tuum.
Ave, María...

*Et Verbum caro factum est.*
Et habitávit in nobis.
Ave, María...

*Ora pro nobis,*
*sancta Dei génetrix.*
Ut digni efficiámur
promissiónibus Christi.

*Orémus.*
Grátiam tuam, quǽsumus, Dómine,
méntibus nostris infúnde;
ut qui, Ángelo nuntiánte,
Christi Fílii tui
incarnatiónem cognóvimus,
per passiónem eius et crucem
ad resurrectiónis glóriam
perducámur.
Per eúndem Christum
Dóminum nostrum. Amen.
*Glória Patri...*

## Уладарка неба

*Уладарка неба, усцешся,*
*аллелюя.*
Бо той, каго пад сэрцам насіла,
аллелюя,

*Уваскрос Ён, як прадказваў,*
*аллелюя.*
Богу за нас маліся,
аллелюя.

*Весяліся і радуйся, Панна Марыя,*
*аллелюя.*
Бо ўваскрос Пан праўдзіва,
аллелюя.

*Молімся.*
Божа, Ты праз уваскрасенне
Твайго Сына,
Пана нашага Езуса Хрыста,
напоўніў свет радасцю,
учыні, просім,
каб праз заступніцтва Яго Маці,
Панны Марыі,
мы атрымалі радасць
вечнага жыцця.
Праз Хрыста, Пана нашага.
Амэн.

## Regina Cæli

*Regína cæli lætáre,*
*allelúia.*
Quia quem meruísti portáre,
allelúia.

*Resurréxit, sicut dixit,*
*allelúia.*
Ora pro nobis Deum,
allelúia.

*Gaude et lætáre, Virgo María,*
*allelúia.*
Quia surréxit Dóminus vere,
allelúia.

*Orémus.*
Deus, qui per resurrectiónem
Fílii tui
Dómini nostri Iesu Christi
mundum lætificáre dignátus es,
præsta, quǽsumus,
ut per eius Genetrícem
Vírginem Maríam
perpétuæ capiámus
gáudia vitæ.
Per Christum Dóminum nostrum.
Amen.

## Вітай, Каралева

Вітай, Каралева,
Маці міласэрнасці,
жыццё, асалода і надзея наша, вітай!
Да Цябе звяртаемся мы,
выгнаннікі, дзеці Евы.
Да Цябе ўздыхаем,
стогнучы і плачучы
ў гэтай слёз даліне.
Дык звярні на нас,
Заступніца наша,
Твае міласэрныя вочы.
І Езуса, благаслаўлёны
плод улоння Твайго,

## Salve, Regina

Salve, Regína,
Mater misericórdiæ,
vita, dulcédo et spes nostra, salve.
Ad te clamámus,
éxsules fílii Evæ.
Ad te suspirámus
geméntes et flentes
in hac lacrimárum valle.
Eia ergo, advocáta nostra,
illos tuos misericórdes óculos
ad nos convérte.
Et Iesum benedíctum
fructum ventris tui,

з’яві нам пасля выгнання гэтага.
О ласкавая, о літасцівая,
о салодкая Панна Марыя.

nobis, posi hoc exsílium, osténde.
O clemens, o pia,
o dulcis Virgo María!

## Велічае душа мая

Велічае душа мая Пана,
і ўзрадаваўся дух мой у Богу,
маім Збаўцу,
бо глянуў Бог на пакору
сваёй слугі.
І цяпер благаслаўляць мяне будуць
усе пакаленні.
Бо вялікае ўчыніў мне Усемагутны,
а імя Яго святое.
І міласэрнасць Яго
з пакалення ў пакаленне
над тымі, хто Яго баіцца.
Паказаў моц сваёй правіцы,
рассеяў тых, хто пыхлівы сэрцам.
Скінуў магутных з трона
і ўзвысіў пакорных.
Дабром галодных насыціў,
а багатых ні з чым адправіў.
Прыняў свайго слугу Ізраэля,
памятаючы пра сваю міласэрнасць,
як абяцаў бацькам нашым,
Абрагаму і яго патомству навекі.

Хвала Айцу і Сыну,
і Духу Святому.
Як была спрадвеку,
цяпер і заўсёды,
і на векі вечныя. Амэн.

## Magnificat

Magníficat ánima mea Dóminum,
et exsultávit spíritus meus in Deo
salvatóre meo,
quia respéxit humilitátem
ancíllæ suæ.
Ecce enim ex hoc beátam me dicent
omnes generatiónes,
quia fecit mihi magna,
qui potens est,
et sanctum nomen eius,
et misericórdia eius in progénies
et progénies timéntibus eum.
Fecit poténtiam in bráchio suo,
dispérsit supérbos mente cordis sui;
depósuit poténtes de sede
et exaltávit húmiles.
Esuriéntes implévit bonis
et dívites dimísit inánes.
Suscépit Ísrael púerum suum,
recordátus misericórdiæ,
sicut locútus est ad patres nostros,
Ábraham et sémini eius in sǽcula.

Glória Patri et Fílio
et Spirítui Sancto.
Sicut erat in princípio,
et nunc et semper,
et in sǽcula sæculórum. Amen.

## Тваёй абароне аддаёмся

Тваёй абароне аддаёмся,
Святая Багародзіца,
у нашых патрэбах
не пагарджай маленнем нашым.
І ад усялякай злой прыгоды
выбаўляй нас заўсёды.
Панна хвалебная і благаслаўлёная.

## Sub tuum præsidium

Sub tuum præsídium confúgimus,
sancta Dei Génetrix;
nostras deprecatiónes ne despícias
in necessitátibus;
sed a perículis cunctis
líbera nos semper,
Virgo gloriósa et benedícta.

## Благаслаўлёны Пан

Благаслаўлёны Пан, Бог Ізраэля,
бо наведаў
і адкупіў народ свой,
і ўзняў моц збаўлення для нас
у доме Давіда, слугі свайго.
Як абвясціў спрадвеку
вуснамі сваіх святых пракрокаў,
што збавіць нас ад ворагаў нашых
і ад рук усіх, хто нас ненавідзіць.
Каб праявіць міласэрнасць
да айцоў нашых
і нагадаць пра святы запавет свой.
Прысягу, якую даў Абрагаму,
айцу нашаму, дасць нам.
Каб, выбаўленыя з рук ворагаў,
мы без страху служылі Яму
ў святасці і справядлівасці перад Ім
ва ўсе дні нашыя.
А ты, дзіцятка,
прарокам Найвышэйшага
будзеш названа,
бо пойдзеш прад абліччам Пана
падрыхтаваць шляхі Яму,
каб даць народу Ягонаму
пазнаць збаўленне
праз адпушчэнне яго грахоў,
дзякуючы сардэчнай міласэрнасці
нашага Бога,
у якой наведаў нас Усход з вышыні,
каб асвятліць тых,
хто сядзіць у цемры
і ў цені смяротным,
каб накіраваць ногі нашыя
на шлях спакою.

Хвала Айцу і Сыну,
і Духу Святому.
Як была спрадвеку,
цяпер і заўсёды,
і на векі вечныя. Амэн.

## Benedictus

Benedíctus Dóminus, Deus Ísrael,
quia visitávit
et fecit redemptiónem plebi suæ,
et eréxit cornu salútis nobis
in domo David púeri sui,
sicut locutus est per os sanctórum,
qui a sǽculo sunt, prophetárum eius,
salútem ex inimícis nostris
et de manu ómnium, qui odérunt nos;
ad faciéndam misericórdiam
eum pátribus nostris
et memorári testaménti sui sancti,
iusiurándum, quod iurávit
ad Ábraham
patrem nostrum, datúrum se nobis,
ut sine timóre,
de manu inimicórum liberáti,
serviámus illi
in sanctitáte et iustítia coram ipso
ómnibus diébus nostris.
Et tu, puer,
prophéta Altíssimi vocáberis:
præíbis enim ante fáciem Dómini
paráre vias eius,
ad dandam sciéntiam salútis
plebi eius
in remissiónem peccatórum eórum,
per víscera misericórdiæ
Dei nostri,
in quibus visitábit nos óriens ex alto,
illumináre his, qui in ténebris
et in umbra mortis sedent,
ad dirigéndos pedes nostros
in viam pacis.

Glória Patri et Fílio
et Spirítui Sancto.
Sicut erat in princípio,
et nunc et semper,
et in sǽcula sæculórum. Amen.

## Цябе, Бога, праслаўляем
*(паэтычная форма)*

Цябе, Бога, праслаўляем,
Табе, Пане, хвала вечна,
Неба і зямля спявае
Табе, Ойча векавечны.
Табе, Божа, ўсе анёлы,
З імі Моцы і Нябёсы,
Херубімы, серафімы
Гімн хвалы адвечны ўзносяць.
Святы, Святы над святымі
Бог магутны і ласкавы,
Над зямлёй і небам слыне
Неабсяжнасць Тваёй славы.
І Апосталы, і вучні,
Хор прарокаў, поўны хвалы,
З імі мучанікаў лучнасць
Аддаюць Табе пашану.
У сугучным хоры льецца
Па усёй зямлі наўкола
Табе хвала з нашых сэрцаў,
Спеў святы Твайго Касцёла.
Сына з Духам суцяшэння,
Велічы Айца прамністай
Праслаўляе ўсё стварэнне, —
Валадар хвалы Ты, Хрыстэ.
Праз вякі гучыць няспынна
Спеў, што славіць Твае справы.
Пане, ад усіх правінаў
Захаваць нас будзь ласкавы.
Каб жа выбавіць свет цэлы
Праз свае святыя раны,
Сын Айца спрадвечны, цела
Ты прыняў ва ўлонні Панны.
Зруйнаваў Ты брамы смерці,
На крыжы ёй вырваў джала,
Каб для ўсіх, хто ў Цябе верыць,
Радасць вечная заззяла.
Праваруч Айца, у славе
Трон Твой, Збаўца наш адзіны,
Прыйдзеш зноў адтуль у яве,
Каб судзіць людскія чыны.

## Te Deum

Te Deum laudámus:
te Dóminum confitémur.
Te ætérnum Patrem,
omnis terra venerátur.
Tibi omnes ángeli,
tibi cæli et univérsæ potestátes:
tibi chérubim et séraphim
incessábili voce proclámant:
Sanctus, Sanctus, Sanctus,
Dóminus Deus Sábaoth.
Pleni sunt cæli et terra
maiestátis glóriæ tuæ.
Te gloriósus apostolórum chorus,
te prophetárum laudábilis númerus,
te mártyrum candidátus
laudat exércitus.
Te per orbem terrárum
sancta confitétur Ecclésia,
Patrem imménsæ maiestátis;
venerándum tuum verum
et únicum Fílium;
Sanctum quoque
Paráclitum Spíritum.
Tu rex glóriæ, Christe.
Tu Patris sempitérnus es Fílius.
Tu, ad liberándum susceptúrus
hóminem,
non horrúisti Vírginis úterum.
Tu, devícto mortis acúleo,
aperuísti credéntibus regna cælórum.
Tu ad déxteram Dei sedes,
in glória Patris.
Iudex créderis esse ventúrus.
Te ergo quǽsumus,
tuis fámulis súbveni,
quos pretióso sánguine redemísti.
Ætérna fac cum sanctis tuis
in glória numerári.
Salvum fac pópulum tuum, Dómine,
et bénedic hereditáti tuæ.

Грэшным Ты не дай загінуць, —
Будзь нам Збаўцам, не Суддзёю
І абмый нас ад правінаў
Дарагой сваёй крывёю.
Са святымі, ў бляску моцы
Захавай Тваіх абраных,
Пане, збаў народ Твой, просім,
Благаслаў Тваіх падданых.
Шляхам нас вядзі бяспечным
У нябесны Ерузалем.
Цябе, Валадар адвечны,
Мы штодзённа праслаўляем.
Не пакінь жа свайго люду,
Божа, без Тваёй апекі.
Пану веру, дык не буду
Асаромлены навекі.

Et rege eos, et extólle illos
usque in ætérnum.
Per síngulos dies benedícimus te;
et laudámus nomen tuum
in sǽculum, et in sǽculum sǽculi.
Dignáre, Dómine,
die isto sine peccáto nos custodíre.
Miserére nostri, Dómine,
miserére nostri.
Fiat misericórdia tua,
Dómine, super nos,
quemádmodum sperávimus in te.
In te, Dómine, sperávi:
non confúndar in ætérnum.

## Гімн Духу Святому
*(паэтычная форма)*

Прыйдзі, Стварыцель Дух Святы,
Наведай вернікаў сваіх,
Напоўні ласкай з вышыні
Сэрцы, што створаны Табой.

Названы Суцяшыцелем,
Ты — найвышэйшы Бога дар,
Жыцця крыніца і любоў,
І узмацненне нашых душ.

Ты спасылаеш сем дароў,
Бо маеш сілу ад Айца.
Праз Сына абяцаны нам,
Ты мноствам моваў прамаўляў.

Сваёю ласкай асвяці
Сэрцы і розум нашыя,
І сэрцы нам аздараві,
І нашы цноты узмацняй.

Ты злога духа адгані
І супакоем адары,
Заўсёды за сабой вядзі
І прабачэнне грэшным дай.

## Veni, Creator Spiritus

Veni, creátor Spíritus,
mentes tuórum vísita,
imple supérna grátia,
quæ tu creásti péctora.

Qui díceris Paráclitus,
altíssimi donum Dei,
fons vivus, ignis, cáritas,
et spiritális únctio.

Tu septifórmis múnere,
dígitus patérnæ déxteræ,
tu rite promíssum Patris,
sermóne ditans gúttura.

Accénde lumen sénsibus,
infúnde amórem córdibus,
infírma nostri córporis
virtúte firmans pérpeti.

Hostem repéllas lóngius
pacémque dones prótinus;
ductóre sic te prævio
vitémus omne nóxium.

Дай праз Цябе Айца пазнаць
І шлях да Сына пакажы.
Ты — Дух любові іх дваіх,
Верым Табе ва ўсе часы.

Богу Айцу хвала заўжды
І Сыну ўваскрэсламу.
Суцяшыцелю, Табе
Хвала на вечныя вякі. Амэн.

Per Te sciámus da Patrem
noscámus atque Fílium,
teque utriúsque Spíritum
credámus omni témpore.

Deo Patri sit glória,
et Fílio, qui a mórtuis
surréxit, ac Paráclito,
in sæculórum sǽcula. Amen.

## Божа, Дух Святы, прыйдзі
*(паэтычная форма)*

Божа, Дух Святы, прыйдзі
І з нябёсаў нам спашлі
Ты святла свайго струмень.

Добры Ойча ўбогіх,
Даўца дароў многіх
І святло ўсіх сэрцаў.

Суцяшыцель, паспяшы,
Наймілейшы госць душы,
Прахалода стомленых.

Адпачынак ў працы,
Цень у дзень гарачы,
Ў плачы суцяшэнне.

О, святло шчаслівае,
Ў сэрцаў глыб ўніклівае,
Ласкай верных напаўняй.

Без Тваёй апекі
Згуба чалавеку,
Поўна небяспекі.

Ўсё, што бруднае, абмый;
Што засохла, ажыві;
Што паранена, злячы.

Нахілі, што цвёрда;
Разагрэй, што горда;
Выпрастай крывое.

## Veni, Sancte Spiritus

Veni, Sancte Spíritus,
et emítte cǽlitus
lucis tuæ rádium.

Veni, pater páuperum,
veni, dator múnerum,
veni, lumen córdium.

Consolátor óptime,
dulcis hospes ánimæ,
dulce refrigérium.

In labóre réquies,
in æstu tempéries,
in fletu solácium.

O lux beatíssima,
reple cordis íntima
tuórum fidélium.

Sine tuo númine,
nihil est in hómine
nihil est innóxium.

Lava quod est sórdidum,
riga quod est áridum,
sana quod est sáucium.

Flecte quod est rígidum,
fove quod est frígidum,
rege quod est dévium.

Дай Тваім жа верным,
Божай ласкі пэўным,
Сем дароў Тваіх святых.

Дай жыццё цнатліва,
Дай зыход шчаслівы,
Вечную дай радасць. Амэн.

Da tuis fidélibus,
in te confidéntibus,
sacrum septenárium.

Da virtútis méritum,
da salútis éxitum,
da perénne gáudium. Amen.

## О Душа Хрыстова

О Душа Хрыстова, асвяці мяне.
Цела Хрыстова, захавай мяне.
Кроў Хрыстова, напаі мяне.
О вада з боку Хрыстова, абмый мяне.
Мука Хрыстова, умацуй мяне.
О добры Езу, пачуй мяне.
У сваіх ранах укрый мяне.
Не дазволь мне Цябе пакінуць.
Ад ворага злога барані мяне.
У гадзіну смерці пакліч мяне.
І дазволь да Цябе прыйсці,
Каб са святымі хваліць Цябе
На векі вечныя. Амэн.

## Anima Christi

Ánima Christi, sanctífica me.
Corpus Christi, salva me.
Sanguis Christi, inébria me,
Aqua láteris Christi, lava me.
Pássio Christi, confórta me,
O bone Iesu, exáudi me.
Intra tua vúlnera abscónde me.
Ne permíttas me separári a te.
Ab hoste malígno defénde me.
In hora mortis meæ voca me.
Et iube me veníre ad te,
ut cum Sanctis tuis laudem te
in sǽcula sæculórum. Amen.

## Малітва св. Бэрнарда

Памятай, о Найсвяцейшая
Панна Марыя, што ніколі
не здаралася, каб пакінула таго,
хто да Цябе ўцякае,
Цябе на дапамогу кліча,
Тваёй апекі просіць.
Гэтым даверам натхнёны, да Цябе,
о Панна над паннамі і Маці наша,
імкнуся, да Цябе прыходжу,
перад Табою грэшны, плачучы, стаю.
О Маці Слова,
не пагарджай словамі маімі,
але пачуй іх ласкава
і выслухай.
Амэн.

## Memorare

Memoráre, o piíssima
Virgo María, non esse auditum
a sǽculo, quemquam
ad tua curréntem præsídia,
tua implorántem auxília,
tua peténtem suffrágia,
esse derelíctum.
Ego tali animátus confidéntia, ad te,
Virgo Vírginum, Mater,
curro, ad te vénio,
coram te gemens peccátor assísto.
Noli, Mater Verbi,
verba mea despícere;
sed áudi propítia et exáudi.
Amen.

| **Ружанец** | **Rosarium** |
|---|---|
| Радасныя таямніцы<br>*(у панядзелак і суботу)* | Mystéria gaudiósa<br>*(in feria secunda et sabbato)* |
| Звеставанне<br>Найсвяцейшай Панне Марыі. | Annuntiátio. |
| Аведзіны Паннай Марыяй<br>св. Альжбеты. | Visitátio. |
| Нараджэнне Езуса Хрыста. | Natívitas. |
| Ахвяраванне Хрыста ў святыні. | Præsentátio. |
| Езуса знаходзяць<br>у Ерузалемскай святыні. | Invéntio in Templo. |
| Таямніцы святла<br>*(у чацвер)* | Mystéria luminósa<br>*(in feria quinta)* |
| Хрост Езуса ў Ярдане. | Baptísma apud Iordánem. |
| Езус аб’яўляе сябе на вяселлі<br>ў Кане. | Autorevelátio apud Cananénse<br>matrimónium. |
| Абвяшчэнне Божага Валадарства і<br>заклік да навяртання. | Regni Dei proclamátio coniúncta<br>cum invitaménto ad conversiónem. |
| Перамяненне Езуса на гары Табор. | Transfigurátio. |
| Устанаўленне Эўхарыстыі. | Eucharístiæ Institútio. |
| Балесныя таямніцы<br>*(у аўторак і пятніцу)* | Mystéria dolorósa<br>*(in feria tertia et feria sexta)* |
| Малітва Езуса ў садзе Аліўным. | Agonía in Hortu. |
| Бічаванне Езуса. | Flagellátio. |
| Укаранаванне Езуса цернем. | Coronátio Spinis. |
| Езус нясе крыж<br>на гару Кальварыйскую. | Baiulátio Crucis. |
| Укрыжаванне і смерць Езуса. | Crucifíxio et Mors. |
| Хвалебныя таямніцы<br>*(у сераду і нядзелю)* | Mystéria gloriósa<br>*(in feria quarta et Dominica)* |
| Уваскрасенне Хрыста. | Resurréctio. |
| Унебаўшэсце Хрыста. | Ascénsio. |
| Спасланне Духа Святога. | Descénsus Spíritus Sancti. |
| Унебаўзяцце<br>Найсвяцейшай Панны Марыі. | Assúmptio. |
| Укаранаванне<br>Найсвяцейшай Панны Марыі. | Coronátio in Cælo. |

*Малітва на заканчэнне Ружанца*

*Маліся за нас, Святая Багародзіца.*
Каб сталіся мы годнымі абяцанняў
Хрыстовых.

*Молімся.*
Божа, Твой Адзінародны Сын
праз сваё жыццё, смерць
і ўваскрасенне здабыў
нам узнагароду вечнага
збаўлення, учыні, просім,
каб разважаючы над гэтымі
таямніцамі Ружанца
Найсвяцейшай Панны Марыі,
мы паводле іх жылі
і атрымалі змешчаныя ў іх абяцанні.
Праз Хрыста, Пана нашага.
Амэн.

*Oratio ad finem Rosarii dicenda*

*Ora pro nobis, sancta Dei génetrix.*
Ut digni efficiámur
promissiónibus Christi.

*Orémus.*
Deus, cuius Unigénitus
per vitam, mortem
et resurrectiónem suam
nobis salútis ætérnæ prǽmia
comparávit, concéde, quǽsumus:
ut hæc mystéria sacratíssimo
beátæ Maríæ Virginis
Rosário recoléntes,
et imitémur quod cóntinent,
et quod promíttunt assequámur.
Per Christum Dóminum nostrum.
Amen.

## Малітва аб заступніцтве

*(Копцкая традыцыя)*

Валадар спакою,
адары нас сваім спакоем
і даруй нам нашыя грахі.
Аддалі непрыяцеляў ад Касцёла
і захавай яго, каб ён узрастаў.
Эммануэль, наш Божа,
Ты прысутнічаеш сярод нас
у хвале Айца і Духа Святога.
Благаславі і ачысці нашыя сэрцы,
вылечы хваробы душы і цела.
Праслаўляем Цябе, Хрыстэ,
разам з Тваім добрым Айцом
і Духам Святым,
бо Ты прыйшоў і збавіў нас.

## Малітва «развітання з алтаром» перад выйсцем з касцёла пасля літургіі

*(Сірыйска-Мараніцкая традыцыя)*

Трывай у спакоі, алтар Божы.
Няхай ахвяра,
якая на табе была здзейснена,
праз абмыццё віны
і адпушчэнне грахоў,
дазволіць мне стаць
перад Хрыстовым судом
і захавае мяне ад асуджэння
і сораму.
Я не ведаю, ці мне будзе дадзена
вярнуцца і прынесці табе
наступную ахвяру.
Апякуйся мною, Пане,
і захоўвай свой святы Касцёл
як дарогу праўды і збаўлення.
Амэн.

## Малітва за памерлых

*(Візантыйская традыцыя)*

Божа духаў і ўсялякага цела,
Ты знішчыў смерць
і перамог д’ябла,
і праз гэта даў жыццё свайму свету.
Дай, Пане, Твайму памерламу
слугу N. адпачынак у месцы святла,
жыцця і прахалоды,
дзе цярпенне, смутак і плач
не маюць моцы.
О добры і ласкавы Божа,
прабач яму ўсе правіны,
якія ён учыніў думкаю,
словам і ўчынкам,
бо няма чалавека,
які б жыў і не грашыў.
Толькі над Табою грэх
не мае ўлады,

Твая справядлівасць —
справядлівасць вечная,
а Тваё слова — праўда.
Хрыстэ, наш Божа,
Ты — уваскрашэнне,
і жыццё, і спакой
Твайго памерлага слугі N.,
мы праслаўляем Цябе
разам са спрадвечным
Айцом Тваім
і са Святым, добрым
і жыццядайным
Духам Тваім цяпер і заўсёды,
і на векі вечныя.
Няхай адпачывае ў супакоі.
Амэн.

## Акт веры

*(паэтычная форма)*

Веру ў Цябе, Божа вечны,
у Тройцы адзіны, спрадвечны.
Веру ў тое, што аб'явіў Ты, Божа,
Тваё слова памыляцца не можа.

## Actus fidei

Dómine Deus, firma fide credo
et confíteor ómnia et síngula
quæ sancta Ecclésia Cathólica
propónit, quia tu, Deus,
ea ómnia revelásti,
qui es ætérna véritas
et sapiéntia quæ nec fállere
nec falli potest.
In hac fíde vívere et mori státuo.
Amen.

## Акт надзеі

*(паэтычная форма)*

Давяраю, бо Ты верны,
Усемагутны і міласэрны.
Дай грахоў мне адпушчэнне,
Ласку й вечнае збаўленне.

## Actus spei

Dómine Deus, spero per grátiam
tuam remissiónem ómnium
peccatórum, et post hanc vitam
ætérnam felicitátem me esse
consecutúrum: quia tu promisísti,
qui es infiníte potens, fidélis,
benígnus, et miséricors.
In hac spe vívere et mori státuo.
Amen.

## Акт любові

*(паэтычная форма)*

Божа, хоць Цябе не разумею,
Ды найбольш любіць умею,
За ўсё, што створана Табою,
Тваёй бязмежнай дабрынёю.

## Actus caritatis

Dómine Deus, amo te super
ómnia et próximum meum propter
te, quia tu es summum,
infinítum, et perfectíssimum bonum,
omni dilectióne dignum.
In hac caritáte vívere et mori státuo.
Amen.

## Акт жалю

*(паэтычная форма)*

Шкадую за злосць маю,
Бо цаню любоў Тваю.
Май літасць да грэшнага мяне
Бліжнім прабачаю дзеля Цябе.

## Actus contritionis

Deus meus, ex toto corde pǽnitet
me ómnium meórum peccatórum,
éaque detéstor, quia peccándo,
non solum pœnas
a te iuste statútas proméritus sum,
sed præsértim
quia offéndi te,
summum bonum,
ac dignum qui super ómnia diligáris.
Ídeo fírmiter propóno,
adiuvánte grátia tua,
de cétero me non peccatúrum
peccandíque occasiónes próximas
fugitúrum.
Amen.

# Б) ПРАЎДЫ КАТАЛІЦКАГА ВЕРАВУЧЭННЯ

## Дзве запаведзі любові

1. Любі Пана Бога твайго
   ўсім сэрцам тваім,
   і ўсёю душою тваёю,
   і ўсім розумам тваім.
2. Любі бліжняга твайго,
   як самога сябе.

## Залатое правіла *(Мц* 7, 12)

Усё, што хочаце, каб вам рабілі людзі, і вы ім рабіце.

## Благаслаўленні *(Мц* 5, 3-12)

Шчаслівыя ўбогія духам,
бо іх ёсць Валадарства Нябеснае.

Шчаслівыя засмучаныя,
бо яны суцешаныя будуць.

Шчаслівыя лагодныя,
бо яны зямлю атрымаюць у спадчыну.

Шчаслівыя галодныя
і прагнучыя справядлівасці,
бо яны насычаныя будуць.

Шчаслівыя міласэрныя,
бо яны міласэрнасць спазнаюць.

Шчаслівыя чыстыя сэрцам,
бо яны Бога ўбачаць.

Шчаслівыя міратворцы,
бо яны сынамі Божымі
названыя будуць.

Шчаслівыя, каго пераследуюць
за справядлівасць,
бо іх ёсць Валадарства Нябеснае.

Шчаслівыя вы, калі будуць вас
зневажаць і пераследаваць,
і ўсяляк зласловіць
несправядліва з-за Мяне.
Радуйцеся і весяліцеся,
бо вялікая ўзнагарода вашая
ў нябёсах.

## Тэалагальныя цноты

1. Вера.
2. Надзея.
3. Любоў.

## Кардынальныя цноты

1. Разважлівасць.
2. Справядлівасць.
3. Мужнасць.
4. Устрыманасць.

## Плады Духа Святога

1. Любоў.
2. Радасць.
3. Спакой.
4. Доўгацярплівасць.
5. Спагадлівасць.
6. Дабрыня.
7. Велікадушнасць.
8. Вернасць.
9. Лагоднасць.
10. Сціпласць.
11. Умеркаванасць.
12. Чыстасць.

## Дары Духа Святога

1. Мудрасць.
2. Розум.
3. Рада.
4. Мужнасць.
5. Умеласць.
6. Пабожнасць.
7. Боязь Божая.

## Пяць касцёльных наказаў

1. У нядзелі і прадпісаныя святы ўдзельнічаць у св. Імшы і не рабіць неабавязковай працы.
2. Прынамсі раз у год прыступіць да сакрамэнту пакаяння.
3. Прынамсі раз у год, у Велікодны перыяд, прыняць св. Камунію.
4. Захоўваць ва ўстаноўленыя дні пост і ўстрыманне ад мясных страў, а ў перыяды пакаяння не ўдзельнічаць у забавах.
5. Дапамагаць у патрэбах супольнасці Касцёла.

## Учынкі міласэрнасці для душы бліжняга

1. Настаўляць грэшнікаў.
2. Вучыць тых, хто не ведае.
3. Раіць тым, хто сумняваецца.
4. Суцяшаць засмучаных.
5. Зносіць цярпліва знявагу.
6. Дараваць ахвотна крыўду.
7. Маліцца за жывых і памерлых.

## Учынкі міласэрнасці для цела бліжняга

1. Накарміць галодных.
2. Напаіць сасмаглых.
3. Адзець нагіх.
4. Прыняць у дом падарожных.
5. Адведваць хворых.
6. Суцяшаць вязняў.
7. Пахаваць памерлых.

## Сем галоўных грахоў

1. Пыха.
2. Хцівасць.
3. Зайздрасць.
4. Гнеў.
5. Распуста.
6. Неўмеркаванасць у ежы і піцці.
7. Лянота.

## Чатыры апошнія рэчы

1. Смерць.
2. Суд.
3. Пекла.
4. Рай.

# ПРАДМЕТНЫ ПАКАЗАЛЬНІК

*Нумары ўказваюць на пытанні*

## А


Абавязак: 145, 179, 184, 187, 191, 299, 305, 326, 345, 349, 414, 416, 430, 440, 444, 453, 458-459, 460, 464, 467, 474, 485, 487, 494, 503, 513, 516-517, 521

– пастырскі ~: 327-328, 330

Абвяшчэнне: 13, 79, 150, 350, 433 (*гл. таксама* Прапаведванне)

Аборт: *гл.* Перарыванне цяжарнасці

Абрагам: 8, 26, 38, 79, 360, 536

Абрад: 237-238, 252, 256, 266-267, 318, 352 (*гл. таксама* Літургія, Традыцыя *літургічная*)

Абразанне: 103

Абразы: 92, 240, 446

Абяцанне: 8, 79, 116, 131, 138, 169, 178, 227, 360, 387, 443, 447, 449, 506, 538, 547

Аб'яўленне: 40, 103, 142, 232

– Божае ~: 4-5, 7-11, 15-16, 22, 73, 101, 169

– прыватнае ~: 10

Агнастыцызм: 445

Агонь: 212, 237 (*гл. таксама* Полымя)

Адам: 7, 75-76, 100, 106

Адарацыя: 286, 526, 550, 552, 566

Адвэнт: 102

Адзінасутны: 47, 87, 88 (*гл. таксама* Найсвяцейшая Тройца)

Адзінства: 19, 64, 68, 87, 153, 158, 161, 170, 180, 248, 271, 339, 439, 585

~ Божага народу: 168, 274

~ душы і цела: 69

~ Касцёла: 182, 327

– каталіцкае ~: 163

~ сужэнства: 340, 495

~ хрысціянаў: 164

~ чалавечага роду: 76, 152

Адказнасць: 117, 181, 259, 329, 364, 368, 372, 399, 410, 456, 470, 515-516

Адкупіцель: 1, 78, 125, 582 (*гл. таксама* Езус)

Адкупленне: 8, 58, 65, 82, 119, 122, 202, 219-220, 312, 594

Адплата: 208 (*гл. таксама* Прысуд)

Адпуст: 211, 312

Адпушчэнне грахоў: 105, 263, 273, 298, 302, 308, 311, 349, 594 (*гл. таксама* Пакаянне)

Адхлань: 125

Аздараўленне: 295, 313-314, 319 (*гл. таксама* Сакрамэнты *аздараўлення*)

Айцец, Бог: 1, 9, 27, 32, 34, 44, 46-48, 52, 82-84, 87-88, 90, 91, 93, 95, 98, 101, 104-107, 110, 115, 119, 121-122, 130-132, 136-137, 143, 153-154, 172, 175, 206, 221, 243, 254, 256, 260, 280, 294, 307, 319-320, 534, 541-543, 545, 554-555, 560, 571, 574, 577, 582-587, 591-592, 594, 596 (*гл. таксама* Бог)

Айцы Касцёла: 243

Алей: 139, 237, 246, 315, 318 (*гл. таксама* Хрызма)

Алтар: 246, 288

Амбона: 246

Амэн: 217, 598

Аналогія: 19

Анафара: *гл.* Малітва *эўхарыстычная*

Анёл: 59-61, 74, 81, 94, 97, 209, 234, 446

